Праваабарончы цэнтр «Вясна»

# Агляд-Хроніка
## парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі ў 2008 годзе

Менск
2009

**Агляд-Хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі ў 2008 годзе**

Кніга падрыхтавана на падставе кароткіх аглядаў у галіне правоў чалавека ў Беларусі за кожны месяц 2008 году. Напачатку даецца агульны аналіз грамадзка-палітычнай сітуацыі ў краіне за вызначаны тэрмін, асьвятляюцца важныя падзеі і рэакцыя міжнароднай супольнасьці на іх. Далей прыводзяцца некаторыя канкрэтныя факты парушэньняў правоў чалавека, на прыкладзе якіх можна прасачыць пэўную гісторыю змаганьня прадстаўнікоў беларускай дэмакратычнай грамадзкасьці за асноўныя правы і свабоды. Сярод асноўных парушэньняў — палітычна матываваны крымінальны і адміністрацыйны перасьлед, папіраньне свабоды слова, забарона мірных сходаў, адмаўленьне ў праве на асацыяцыю.

У кнізе зьмешчаны фотаздымкі з інтэрнэт-крыніцаў
photo.bymedia.net, nn.by, charter97.org, spring96.org.

ISBN 15-26496-006-P

# Зьмест


**Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, студзень 2008 году ........ 6**

Адміністрацыйныя пакараньні ўдзельнікаў мірных акцыяў ........ 9
Палітычна матываваныя крымінальныя справы ........ 10
Катаваньні ды іншыя віды жорсткага абыходжаньня ........ 12
Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі ........ 13
Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў ........ 14
Звальненьні і адлічэньні з вучобы па палітычных матывах ........ 14
Парушэньне права на свабоду сумленьня ........ 15
Дзейнасьць сьпецслужбаў ........ 16
Перасьлед ........ 17

**Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, люты 2008 году ........ 18**

Палітычна матываваныя крымінальныя справы ........ 20
Катаваньні ды іншыя віды жорсткага, бесчалавечнага абыходжаньня ........ 21
Парушэньні прынцыпу свободы слова і распаўсюду інфармацыі ........ 22
Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў ........ 23
Звальненьні і адлічэньні з вучобы па палітычных матывах ........ 24
Сьмяротнае пакараньне ........ 25
Парушэньні права на свабоду сумленьня ........ 26
Парушэньні права на свободу мірных сходаў ........ 27
Дзейнасьць сьпецслужбаў ........ 28

**Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, сакавік 2008 году ........ 29**

Палітычна матываваныя крымінальныя справы ........ 31
Катаваньні і іншыя віды жорсткага, бесчалавечнага абыходжаньня ........ 33
Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў ........ 34
Парушэньні прынцыпу свободы слова і распаўсюду інфармацыі ........ 35
Парушэньні права на свабоду сумленьня ........ 36
Парушэньні права на свободу мірных сходаў ........ 37
Дзейнасьць сьпецслужбаў ........ 37
Звальненьні па палітычных матывах ........ 38

**Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, красавік 2008 году........................................................39**
Палітычна матываваныя крымінальныя справы ........................ 41
Парушэньні права на сваботу асацыяцыяў ............................ 43
Парушэньні прынцыпу свободы слова і распаўсюду інфармацыі........... 44
Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў ........................................ 46
Звальненьні і адлічэньні з вучобы па палітычных матывах .................. 48
Парушэньні права на сваботу сумленьня........................................ 50
Парушэньні права на свободу мірных сходаў .................................. 51
Дзейнасьць сьпецслужбаў................................................................ 52

**Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, травень 2008 году........................................................54**
Палітычна матываваныя крымінальныя справы ........................ 56
Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў ........................................ 57
Парушэньне права на сваботу асацыяцыяў.......................................... 59
Катаваньні ды іншыя віды жорсткага, бесчалавечнага абыходжаньня. 60
Парушэньні прынцыпу свободы слова і распаўсюду інфармацыі........... 62
Парушэньні права на сваботу мірных сходаў .................................. 63
Дзейнасьць сьпецслужбаў................................................................ 64

**Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, чэрвень 2008 году........................................................66**
Палітычна матываваныя крымінальныя справы ........................ 68
Парушэньні права на сваботу асацыяцыяў ............................ 69
Парушэньні прынцыпу свободы слова і распаўсюду інфармацыі........... 70
Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў ........................................ 71
Звальненьні і адлічэньні з вучобы па палітычных матывах .................. 72
Парушэньні права на сваботу сумленьня........................................ 73
Парушэньні права на свободу мірных сходаў .................................. 74
Дзейнасьць сьпецслужбаў................................................................ 75
Перасьлед грамадзка-палітычных актывістаў і праваабаронцаў........... 76

**Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, ліпень-жнівень 2008 году ................................................77**
Палітычна матываваныя крымінальныя справы ........................ 80
Парушэньні права на сваботу асацыяцыяў ............................ 81
Парушэньні прынцыпу свободы слова і распаўсюду інфармацыі ........... 83

Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў ........ 85
Парушэньні права на свободу мірных сходаў ........ 87
Звальненьні і адлічэньні з вучобы па палітычных матывах ........ 88

**Агляд-хроніка парушэньня правоў чалавека ў Беларусі, верасень 2008 году ........ 90**
Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў ........ 93
Катаваньні і іншыя віды жорсткага, бесчалавечнага абыходжаньня ........ 95
Парушэньні прынцыпу свободы слова і распаўсюду інфармацыі ........ 96
Парушэньні права на свободу мірных сходаў ........ 97
Парушэньне права на сваботу асацыяцыяў ........ 99
Звальненьні і адлічэньні з вучобы па палітычных матывах ........ 99
Свабода сумленьня ........ 100
Сьмяротнае пакараньне ........ 101
Палітычна матываваныя крымінальныя справы ........ 101

**Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, кастрычнік-лістапад 2008 году ........ 102**
Парушэньні прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі ........ 104
Парушэньні права на свабоду асацыяцыяў ........ 106
Парушэньні права на свободу мірных сходаў ........ 107
Палітычна матываваныя крымінальныя справы ........ 108
Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў ........ 109
Парушэньні выбарчых правоў грамадзянаў ........ 111
Звальненьні і адлічэньні з вучобы па палітычных матывах ........ 113

**Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, сьнежань 2008 году ........ 114**
Палітычна матываваныя крымінальныя справы ........ 115
Перасьлед праваабаронцаў ........ 116
Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў ........ 117
Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў ........ 118
Парушэньні прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі ........ 119
Парушэньні права на свабоду мірных сходаў ........ 121
Звальненьні па палітычных матывах ........ 122
Парушэньні права на свабоду сумленьня ........ 122

# Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, студзень 2008 году

Пачатак 2008 году выдаўся як ніколі раней гарачым. Наступ уладаў на сацыяльна-эканамічную сьферу жыцьця грамадзянаў прывёў да росту сацыяльных пратэстаў і, як сьледзтва, узмацненьня рэпрэсіяў у дачыненьні да найбольш актыўных удзельнікаў пратэстаў. Студзеньскія падзеі зьявіліся заканамерным і запланаваным працягам мітынгу прадпрымальнікаў, які адбыўся ў сьнежні 2007 году, улады апынуліся не гатовыя да такога рашучага напору ў адстойваньні сваіх працоўных правоў пэўнага зрэзу грамадзкай супольнасьці.

Указ Прэзідэнта № 760 ад 29 сьнежня 2006 году, паводле якога з 1 студзеня 2008 году індывідуальныя прадпрымальнікі (ІП) пазбаўленыя права наймаць працаўнікоў, за выключэньнем блізкіх сваякоў (ня больш за тры чалавекі), пакінуў бяз сродкаў да існаваньня вялікую колькасьць людзей, якія займаліся ў сьферы дробнага бізнэсу. Акрамя таго, ён закрануў і простых грамадзянаў, паколькі апусьцелі рынкі, зачыніліся шматлікія гандлёвыя кропкі, рэдкімі сталі маршрутныя таксі і г. д. Усе спробы прадпрымальніцкіх лідэраў наладзіць з уладамі перамовы ні да чаго не прывялі, дыялогу не атрымалася. Гэта было сьведчаньнем рашэння «ў вярхах» ліквідаваць ІП як непатрэбны грамадзкі клас. Разгубленым індывідуальным прадпрымальнікам не заставалася нічога іншага, як выйсьці на вуліцы.

Несанкцыянаваная акцыя прадпрымальнікаў пачалася апоўдні 10 студзеня з мітынгу на Кастрычніцкай плошчы Менску, у якім прыняло ўдзел некалькі тысяч чалавек. Удзельнікі мітынгу агучылі свае патрабаваньні да ўладаў, галоўнае з якіх — адмена Указу Прэзідэнта № 760. Дэлегацыя на чале з лідэрам руху «Перспектыва» Анатолем Шумчанкам адправілася ў Адміністрацыю прэзідэнта, каб дамагчыся перамоваў, але сустрэча з прадстаўніком галоўнага эканамічнага

ўпраўленьня прэзідэнцкай адміністрацыі скончылася безвынікова. Затым калона дэманстрантаў рушыла да Дому ўраду, патрабуючы сустрэчы з прэм'ер-міністрам Сяргеем Сідорскім. Па дарозе ўдзельнікі акцыі выйшлі на прасьпект і перакрылі рух транспарту. Каля паўтары гадзіны прасьпект быў блакаваны. На плошчы Незалежнасьці прадстаўнікі ўраду не выйшлі да мітынгоўцаў, а выступілі палітыкі Анатоль Лябедзька і Аляксандр Мілінкевіч. Неўзабаве адны ўдзельнікі акцыі сталі разыходзіцца, а іншыя вярнуліся на Кастрычніцкую плошчу.

Спачатку акцыя праходзіла без затрыманьняў і сілавога разгону, здавалася, улады не адважваліся ўжываць жорсткія меры ў дачыненьні да абураных прадпрымальнікаў. Праўда, яшчэ да пачатку мітынгу па дарозе ў Менск былі затрыманыя іншагародныя актывісты прадпрымальніцкага руху Аляксандр Цацура і Віктар Крываль, не атрымалася выехаць з Барысаву лідэру кампаніі «За вольнае разьвіцьцё прадпрымальніцтва» Віктару Гарбачову. Па абвінавачаньні ў дробным хуліганстве ў Рэчыцы быў затрыманы і асуджаны на 5 сутак арышту і штраф прадпрымальнік Алег Шабетнік, а ў Менску на 10 сутак арыштаваны апазіцыйны актывіст Вячаслаў Сіўчык. Тым ня менш пасьля заканчэньня акцыі пратэсту найбольш актыўным яе ўдзельнікам не ўдалося пазьбегнуць арышту. Былі затрыманыя Анатоль Шумчанка і Анатоль Лябедзька, у міліцэйскія ўчасткі дастаўленыя моладзевыя дэмакратычныя актывісты. Як пазьней паведаміў журналістам міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў, было затрымана 27 чалавек. Многія пры затрыманьні былі моцна зьбітыя супрацоўнікамі міліцыі. На наступны дзень, 11 студзеня, у судах Маскоўскага і Цэнтральнага раёну сталіцы адбыліся суды над затрыманымі ўдзельнікамі мітынгу: 22 чалавекі былі падвергнутыя арышту на 15 сутак, а студэнтка Таццяна Цішкевіч, якой выклікалі «хуткую дапамогу» і якая прадэманстравала судзьдзі сваю скрываўленую куртку, была арыштаваная на 20 сутак.

Пасьля намесьнік начальніка Галоўнага ўпраўленьня ўнутраных справаў Менску Аляксандр Найдзенка паведаміў, што па факце масавых беспарадкаў у сталіцы ўзбуджаная крымінальная справа. Таксама Міністэрства юстыцыі падало зыск аб ліквідацыі РГА «Перспектыва».

21 студзеня ў Менску адбылася другая запланаваная несанкцыянаваная акцыя пратэсту прадпрымальнікаў. Пасьля збору ў 12 гадзін на Кастрычніцкай плошчы праз некаторы час калона ўдзельнікаў акцыі пратэсту рушыла да Дому ўраду. У раёне ГУМу маніфестанты выйшлі на праезную частку, але былі выціснутыя супрацоўнікамі ДАІ на ходнікі. На падыходзе да Дому ўраду, калі колькасьць дэманстрантаў значна вырасла, пачаўся сілавы разгон удзельнікаў акцыі. Да мітынгоўцаў зьвярнуўся міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў. Ён папярэдзіў аб крымінальнай адказнасьці і даў 10 хвілінаў, каб усе разышліся, у адваротным выпадку пагражаў ужыць сілу ў дачыненьні да ўдзельнікаў акцыі. Праз некаторы час была абвешчана «поўная зачыстка», з боку Дому ўраду рушылі шэрагі сьпецатраду хуткага рэагаваньня (САХР). Многія дэманстранты пачалі вяртацца назад, частку людзей з плошчы загналі ў падземны пераход, некаторых вымусілі ісьці ў бок гарадзкой Ратушы. Адбыліся затрыманьні ўдзельнікаў акцыі. 22 студзеня ў Цэнтральным і Маскоўскім судах Менску прайшлі суды над 23 затрыманымі. Адрозьненьне ад судоў над удзельнікамі аналагічнай акцыі 10 студзеня было ў тым, што выносіліся ў асноўным штрафы. 15 чалавек асуджаныя да выплаты штрафаў у памеры ад 15 да 50 базавых велічыняў (525 тыс. — 1 млн 750 тыс. рублёў), шасьцёра асуджаныя да арышту ад 5 да 15 сутак. Яшчэ адзін аштрафаваны на 35 б. в. і асуджаны да арышту на 10 сутак. Усе асуджаныя прызнаныя вінаватымі ў правапарушэньні артыкулу 23.34 КаАП («Парушэньне вызначанага парадку арганізацыі альбо правядзеньня масавага мерапрыемства).

Міжнародная грамадзкасьць асудзіла рэпрэсіі беларускіх уладаў і заклікала прыняць сур’ёзныя меры па дэмакратызацыі і павазе да правоў чалавека. Тэму палітвязьняў закранаюць у сваіх дакладах і рэзалюцыях усе еўрапейскія інстытуты. Дэманструючы жаданьне наладзіць адносіны з Захадам, улады 18 і 21 студзеня з турмаў вызвалілі прызнаных палітвязьнямі прадпрымальнікаў Мікалая Аўтуховіча і Юрыя Лявонава, а 23 студзеня моладзевага лідэра Зьмітра Дашкевіча. Дадзенае рашэньне было ўспрынятае са стрыманым аптымізмам, паколькі агульная сітуацыя ў Беларусі, па адзнаках розных міжнародных структураў, не зьмянілася. З лістапада 2007 г. у сьпецтурме КДБ, так

званай «амерыканцы», дзе звычайна ўтрымліваюць асабліва небясьпечных злачынцаў, знаходзіцца былы намесьнік выдаўца газеты «Згода» Аляксандр Зьдзьвіжкоў. За перадрук дацкіх карыкатураў на ісламскага прарока Мухамеда яго асудзілі да трох гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму, што выклікала абурэньне розных міжнародных арганізацыяў і дыпмісіяў, якія заклікалі беларускія ўлады перагледзець прысуд і вызваліць журналіста.

## Адміністрацыйныя пакараньні ўдзельнікаў мірных акцыяў

18 студзеня суд Цэнтральнага раёну Менску прызнаў моладзевага актывіста, сябра АГП Віталя Стажарава вінаватым у парушэньні двух артыкулаў адміністрацыйнага кодэксу і вынес пакараньне — 20 сутак арышту. Віталь Стажараў быў затрыманы ўдзень каля Кастрычніцкай плошчы, супрацоўнікі міліцыі выявілі ў яго ўлёткі з інфармацыяй аб прызначанай на 21 студзеня акцыі пратэсту прадпрымальнікаў. Актывіста АГП асудзілі за распаўсюд улётак і за ўдзел у папярэдняй несанкцыянаванай акцыі прадпрымальнікаў 10 студзеня.

29 студзеня Салігорскі раённы суд разгледзеў адміністрацыйныя справы затрыманых напярэдадні ўдзельнікаў збору подпісаў пад двума зваротамі ў гарвыканкам ад імя індывідуальных прадпрымальнікаў (ІП) і грамадзянаў, якія пазбавіліся сацыяльных ільготаў. Суд прызнаў актывіста прадпрымальніцкага руху Аляксандра Цацуру і намесьніка старшыні ліквідаванай Беларускай жаночай партыі «Надзея» Ларысу Насановіч вінаватымі ва ўчыненьні правапарушэньня, прадугледжанага арт. 23.34 КаАП («Парушэньне вызначанага парадку правядзеньня масавага мерапрыемства), і вынес кожнаму пакараньне ў выглядзе адміністрацыйнага арышту на тэрмін 15 сутак.

# Палітычна матываваныя крымінальныя справы

18 студзеня Менскі гарадзкі суд прызнаў былога намесьніка рэдактара незалежнай газеты «Згода» Аляксандра Зьдзьвіжкова вінаватым ва ўчыненьні крымінальнага злачынства, прадугледжанага ч. 2 арт. 130 КК РБ (распальваньне расавай, нацыянальнай альбо рэлігійнай варожасьці, учыненае службовай асобай з выкарыстаньнем сваіх службовых паўнамоцтваў) і асудзіў да трох гадоў пазбаўленьня волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Крымінальная справа была ўзбуджана пракуратурай у лютым 2006 году, падставай паслужыў перадрук карыкатураў з дацкай газеты «Jullands-Posten» на прарока Мухамеда. Міністэрства інфармацыі неадкладна зьвярнулася з пазовам аб закрыцьці газеты «Згода» у Вышэйшы гаспадарчы суд. Зыск быў задаволены, а крымінальная справа неўзабаве прыпыненая, паколькі сьледчыя органы не змаглі вызначыць месцазнаходжаньне абвінавачанага. У пачатку студзеня стала вядома, што А. Зьдзьвіжкова затрымалі яшчэ ў лістападзе 2007 году і ўтрымліваюць пад вартай. Судовыя слуханьні, якія праходзілі ў студзені, спачатку былі адкрытымі, але затым журналістам забаранілі на іх прысутнічаць. А. Зьдзьвіжкоў абскардзіў прысуд у Вярхоўным судзе. Скандальныя карыкатуры з малюнкамі прарока Мухамеда перадрукавалі 143 выданьні ў 56 краінах, аднак толькі ў Беларусі журналіст сеў за гэта ў турму.

У дачыненьні да моладзевага актывіста Андрэя Кіма, аднаго з удзельнікаў акцыі прадпрымальнікаў 21 студзеня, заведзена крымінальная справа па арт. 364 КК РБ «Гвалт альбо пагроза ўжываньня гвалту ў дачыненьні да супрацоўніка міліцыі», які прадугледжвае максімальнае пакараньне ў выглядзе пазбаўленьня волі на тэрмін да шасьці гадоў. 22 студзеня судзьдзя Цэнтральнага суду Менску Тацяна Паўлючук прызнала Андрэя Кіма вінаватым па двух арт. КаАП і вынесла пакараньне ў выглядзе 10 сутак адміністрацыйнага арышту і штрафу ў памеры 30 б. в. (1 млн 50 тыс. рублёў). Пасля заканчэньня тэрміну арышту, 31 студзеня, актывіст з ЦІПу на Акрэсьціна быў дастаўлены на допыт у пракуратуру Цэнтральнага раёну сталіцы. Мерай стрыманьня абрана ўтрыманьне пад вартай.

24 студзеня ў Нясьвіскім судзе абвешчаны прысуд па крымінальнай справе Аляксандра Крутога. Ён прызнаны вінаватым ва ўчыненьні крымінальнага злачынства па арт. 368 КК РБ — публічная абраза прэзідэнта краіны. У сувязі з тым, што дзеяньні асуджанага не ўяўляюць вялікай грамадзкай небясьпекі, Аляксандр Круты вызвалены ад пакараньня, а крымінальная справа спынена. Паколькі падчас сьледзтва ў дачыненьні да падсуднага праводзілася судова-медыцынская эксьпертыза, якая ўстанавіла, што Круты пакутуе на паранаідальную шызафрэнію, суд пастанавіў ужыць прымусовыя меры стацыянарнага лячэньня ў псіхіятрычным шпіталі. Аднак судзьдзя не ўлічыла, што паводле ч. 2 арт. 448 КПК РБ суд ня можа ўжыць прымусовую форму лячэньня, калі «дзеяньні асуджанага не ўяўляюць пагрозы для грамадзтва». Нягледзячы на гэта, Аляксандр Круты працягвае знаходзіцца ў сьледчым ізалятары г. Жодзіна. Крымінальная справа за публічную абразу прэзідэнта Лукашэнкі была ўзбуджаная ў дачыненьні да Крутога яшчэ ў траўні 2003 году. Падставай для яе ўзбуджэньня паслужыў факт распаўсюду ім у Нясьвіжы ўлётак, у якіх было напісана: «Органы власти склоняются ко злу (творят зло). Я говорю: Лукашенко ко злу не склоняется». Некалькі гадоў Аляксандр Круты жыў у Менску і быў затрыманы толькі ўвосень 2007 году. Спачатку грамадзкі актывіст утрымліваўся ў Жодзінскім СІЗА, затым прымусова знаходзіўся ў рэспубліканскім псіхіятрычным шпіталі.

23 студзеня за два месяцы да заканчэньня тэрміну са Шклоўскай калоніі № 17 вызвалены лідэр «Маладога Фронту» Зьміцер Дашкевіч, які адбываў пакараньне за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі. Гэта адбылося ў сувязі з тым, што 22 студзеня Вярхоўны суд Беларусі па ўласнай ініцыятыве перагледзеў крымінальную справу і скараціў тэрмін вынесенага раней пакараньня з паўтара гадоў да аднаго году. Такім чынам, паводле новага судовага рашэньня, моладзевы лідэр правёў за кратамі чатыры лішніх месяцы.

# Катаваньні ды іншыя віды жорсткага абыходжаньня

14 студзеня пацыенты Рэспубліканскага сухотнага шпіталю ў пасёлку Наваельня Дзятлаўскага раёну Гарадзенскай вобласьці абвясьцілі галадоўку на знак пратэсту супраць невыносных умоваў знаходжаньня ў клініцы. Галоўны лекар медустановы Мечыслаў Доўгань праігнараваў патрабаваньні пацыентаў, якія зьвярнуліся да яго з калектыўным лістом, у якім указалі на холад у палатах, адсутнасьць гарачай вады і няякасную ежу. «Душ уключаецца два разы на тыдзень. Палаты вельмі брудныя, у памяшканьні вільготна. А ежу, якую нам даюць, немагчыма есьці. Амаль усе хворыя ходзяць з тэмпературай. Мы ж — сухотнікі, нам неабходныя абсалютна іншыя ўмовы», — растлумачыў сітуацыю адзін з пацыентаў Сяргей Воранаў. З ягоных словаў, шпіталь разьмешчаны ў лесе, але хворым нават не дазваляюць выйсьці на вуліцу, каб купіць неабходнае ў краме за свае грошы.

14 студзеня судзьдзя Цэнтральнага райсуду Менску Таццяна Паўлючук прызнала кіраўніка Рады прадпрымальнікаў Смаленскага рынку г. Віцебску Сяргея Парсюкевіча вінаватым па арт. 23.34 КаАП і прысудзіла 15 сутак арышту за ўдзел у мітынгу прадпрымальнікаў 10 студзеня. Актывіст быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі на працоўным месцы ў Віцебску і прымусова дастаўлены ў сталіцу. Падчас адбыцьця пакараньня ў Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў С. Парсюкевіч быў жорстка зьбіты адным з супрацоўнікаў установы, які пазьней абвінаваціў арыштаванага ў нападзе на яго. Пасьля вызваленьня прадпрымальнік вымушаны быў адразу зьвярнуцца да медыкаў і ў пракуратуру Маскоўскага раёну Менску, каб узяць накіраваньне на судмедэксьпертызу і дакументальна засьведчыць наступствы зьбіцьця. Па словах Парсюкевіча, яму вядома, што пракуратура праводзіць праверку па дадзеным факце, таксама ён папярэджаны аб магчымасьці крымінальнай адказнасьці за напад на супрацоўніка праваахоўных органаў. Інцыдэнт са зьбіцьцём віцебскі прадпрымальнік лічыць правакацыяй, паколькі сам шмат гадоў працаваў у міліцыі, выйшаў на пенсію ў званьні маёра і добра ведае, як трэба сябе паводзіць у зьняволеньні.

# Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі

6 студзеня стала вядома, што кіраўніцтва Нясьвіскага аддзяленьня «Менскаблсаюздрук» адмовілася падоўжыць на 2008 год дамову па распаўсюдзе газеты «Нясвіжскі час», выдаўцом якой зьяўляецца прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «ІнтэксПрэс-Рэгіён». «Наша супрацоўніцтва было спыненае без усялякіх тлумачэньняў пасьля пяці гадоў сумеснай працы», — сказаў галоўны рэдактар недзяржаўнага выданьня Аляксей Белы.

10 студзеня раніцай наведвальнікам сталі недаступныя шматлікія незалежныя інтэрнэт-сайты, якія найбольш аператыўна і дакладна асьвятляюць падзеі грамадзка-палітычнага жыцьця краіны. У чарговы раз было ўжытае традыцыйнае блакаваньне непажаданых уладам інтэрнэт-рэсурсаў з дапамогай так званага «шэйпінгу», калі на ўзроўні галаўнога кампутару «Белтэлекаму» ўсталёўваецца фільтр, які штучна звужае канал. У выніку ствараецца адчуваньне, што заблакаваны сайт даступны, але працэс поўнай загрузкі займае некалькі дзясяткаў хвілінаў.

11 студзеня суд Цэнтральнага раёну сталіцы прызнаў пазаштатнага фотакарэспандэнта недзяржаўнай газеты «Наша Ніва» Арсеня Пахомава вінаватым па двух артыкулах адміністрацыйнага кодэксу — «дробнае хуліганства» і «ўдзел у несанкцыянаванай вулічнай акцыі» і вынес пакараньне ў выглядзе арышту на тэрмін 15 сутак. Журналіст быў затрыманы 10 студзеня ў цэнтры Менску падчас акцыі пратэсту прадпрымальнікаў, дзе знаходзіўся па заданьні рэдакцыі.

24 студзеня начальніка аддзелу інфармацыі недзяржаўнай газеты «Борисовские новости» Анатоля Мазгова мясцовыя ідэолагі не пусьцілі на сумеснае пашыранае паседжаньне Барысаўскага раённага выканаўчага камітэту і раённага Савету дэпутатаў. 25 студзеня карэспандэнту гэтага выданьня забаранілі прысутнічаць на абласным бацькоўскім сходзе, які праходзіў у Палацы культуры Барысаву.

# Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў

30 студзеня Вярхоўны суд разгледзеў скаргу прадстаўнікоў «Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі» на адмову Міністэрства юстыцыі ў рэгістрацыі аб'яднаньня. Па словах сустаршыні аб'яднаньня Аляксея Шэіна, судзьдзя цалкам падтрымала ўсе прэтэнзіі Мінюсту ў дачыненьні да аб'яднаньня, у тым ліку да неадпаведнасьці ягоных статутных дакументаў патрабаваньням заканадаўства, а таксама да адсутнасьці ў статуце СГА «БХД» тлумачэньня паняцьцяў «прыхільнікі хрысьціянскага сьветапогляду», «хрысьціянскія каштоўнасьці» і «хрысьціянскія падыходы». А. Шэін назваў рашэньне суду «цалкам прагназуемым і, безумоўна, палітычна матываваным». Аб гэтым сьведчыць той факт, што Мінюстам зарэгістраваныя грамадзкія арганізацыі, мэты, задачы і статутныя нормы якіх абсалютна ідэнтычныя палажэньням прадстаўленых статутных дакументаў, што было даказана ў судзе.

# Звальненьні і адлічэньні з вучобы па палітычных матывах

22 студзеня студэнт-выдатнік трэцяга курсу матэматычнага факультэту Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэту імя Ф. Скарыны Зьміцер Жалезьнічэнка загадам рэктара паўторна адлічаны з ВНУ. У гэты ж дзень у тэрміновым парадку адбылося паседжаньне прэзідыуму прафкаму студэнтаў, які прагаласаваў за «магчымасьць адлічэньня» моладзевага актывіста. 23 студзеня адлічаны студэнт па позьве зьявіўся ў ваенкамат і, нягледзячы на дрэннае самаадчуваньне і правядзеньне курсу лячэньня (дыягназ — гіпертанія), быў накіраваны ў Жлобін праходзіць тэрміновую службу ў войску.

Упершыню З. Жалезьнічэнка, намесьнік старшыні грамадзкай арганізацыі «Талака» і намесьнік старшыні рэгіянальнай партыйнай структуры «Моладзь БНФ», быў адлічаны з ВНУ 7 верасьня 2007 году з фармулёўкай: «За сістэматычнае парушэньне правілаў унутранага распарадку навучальнай установы». Парушэньнем адміністрацыя ВНУ палічыла прыцягненьне актывіста да адміністрацыйнай адказнасьці

«за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасьць» — распаўсюд без рэгістрацыі квіткоў на канцэрт беларускіх бардаў. Студэнт не зьмірыўся з незаконным адлічэньнем, падаў у суд і выйграў яго. 16 студзеня Цэнтральны райсуд Гомелю адмяніў загад рэктара аб выключэньні і абавязаў універсітэт аднавіць З. Жалезьнічэнку. Аднак ужо на наступны дзень, 17 студзеня, у гомельскім вайсковым камісарыяце яму ўручылі позву з загадам прыбыць на прызыўны пункт для службы ў войску.

З 1-га курсу Беларускага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэту адлічаны студэнт Антон Каліноўскі, які адбыў 10 сутак адміністрацыйнага арышту па надуманым абвінавачаньні. Адміністрацыя ВНУ вынесла палітычна актыўнаму студэнту два папярэджаньні, ня даўшы магчымасьці здаць прапушчаныя іспыты. Антон Каліноўскі быў прэвентыўна затрыманы разам з Франакам Вячоркам і Юрасём Станкевічам у будынку суду, дзе праходзіў разгляд адміністрацыйнай справы моладзевай актывісткі Юліі Сіўцовай. Супрацоўнікі міліцыі абвінавацілі ўсіх у нецэнзурнай лаянцы.

## Парушэньне права на свабоду сумленьня

29 студзеня пракуратура Маскоўскага раёну Менску вынесла папярэджаньне пастару пратэстанцкай царквы «Новае жыцьцё» Вячаславу Ганчарэнку за тое, што ён адмовіўся ўпусьціць у будынак прадстаўнікоў міністэрства надзвычайных сітуацыяў. Пракуратура патрабуе надалей не перашкаджаць доступу гэтай службы ў будынак. Улады фактычна пагражаюць вернікам адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасьцю. «Мы прынялі рашэньне агульным сходам, што мы прынцыпова ня пусьцім нікога, пакуль ня будзе задаволенае нашае патрабаваньне: адмяніць рашэньне Менгарвыканкаму, згодна з якім яны адабралі зямлю, — кажа пастар В. Ганчарэнка. — І мы вырашылі нікога не пускаць. Гэта нашая акцыя пратэсту, акцыя грамадзянскага непадпарадкаваньня».

30 студзеня суд Баранавіцкага раёну і г. Баранавічы аштрафаваў на 20 базавых велічыняў царкву «Новае пакаленьне» Аб’яднаньня аб-

шчын хрысьціян поўнага Евангельля ў Рэспубліцы Беларусь па арт. 15.10 КаАП РБ за нямэтавае выкарыстаньне зямельнага ўчастку, выдзеленага абшчыне на правах арэнды. Па словах прадстаўніка царквы юрыста Сяргея Луканіна, у 1997 годзе царква набыла ва ўласнасьць склад для выкарыстаньня яго ў якасьці храма. На зварот вернікаў у гарвыканкам з просьбай надаць абшчыне права на сталае карыстаньне зямельным участкам для наступнай рэканструкцыі будынку гарадзкія ўлады адмовілі без усялякай матывіроўкі.

У сьнежні 2007 г. супрацоўнікі аддзелу па зямельных рэсурсах і землеўладкаваньні Баранавіцкага гарвыканкаму склалі адміністрацыйны пратакол аб нямэтавым выкарыстаньні зямельнага ўчастку. Першае судовае паседжаньне адбылося 10 студзеня, і гэтая ж судзьдзя спыніла разгляд адміністрацыйнай справы за недастатковасьцю аргументаў, прад'яўленых абшчыне Баранавіцкім гарвыканкамам. Зьмену пазіцыі судзьдзі С. Луканін зьвязвае з ціскам, аказаным на яе мясцовымі службоўцамі.

## Дзейнасьць сьпецслужбаў

12 студзеня ў Гомелі ў кватэры сябра «Беларускай асацыяцыі журналістаў» Сяргея Падсасоннага супрацоўнікі рэгіянальнага ўпраўленьня КДБ правялі ператрус. У санкцыі было напісана, што ён падазраецца ў дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі «Малады Фронт» і ўцягваньні туды вучняў і студэнтаў з мэтай дыскрэдытацыі краіны. Сябры гомельскай філіі БАЖ прапаноўвалі быць панятымі пры ператрусе, але міліцыя і супрацоўнікі КДБ выправадзілі іх за дзьверы. У выніку ў журналіста канфіскавалі кампутар, відэакамеру і флэш-карту. Тады гомельскія журналісты накіравалі пракурору Гомельскай вобласьці ліст з просьбай пасадзейнічаць спыненьню перасьледу іх калегі С. Падсасоннага, але атрымалі адказ аб правамернасьці дзеяньняў супрацоўнікаў КДБ.

23 студзеня моладзевую актывістку Марыю Рудакоўскую, навучэнку аднаго з менскіх каледжаў, запрасілі ў кабінет дырэктара. Там яе чакаў супрацоўнік КДБ капітан Бялоцкі, якога цікавіла адукацый-

ная паездка Марыі ў Брусэль. Актывістка адмовілася размаўляць з прадстаўніком «сьпецслужбаў» і запатрабавала ўручыць ёй афіцыйную позву. Капітан Бялоцкі нагадаў дзяўчыне аб удзеле ў лагеры пад Івацэвічамі, за што на Марыю быў складзены адміністрацыйны пратакол і адбыўся судовы працэс. «Ён сказаў, што бачыў мяне на мітынгу прадпрымальнікаў, пагражаў інфармаваць Міністэрства адукацыі і адміністрацыю каледжу аб маёй дзейнасьці, паставіў пад пагрозу маё наступнае навучаньне», — паведаміла М. Рудакоўская.

## Перасьлед

У канцы студзеня Аляксандра Баразенку, студэнта польскай адукацыйнай праграмы для беларусаў імя Кастуся Каліноўскага, ня выпусьцілі з краіны. Памежнікі паведамілі яму, што яго дадзеныя занесены ў базу асобаў, якім забаронены выезд за межы Рэспублікі Беларусь, на той падставе, што ён нібыта ўхіляецца ад службы ў войску. Нягледзячы на тое, што А. Баразенка прадставіў памежнікам даведку прызыўной камісіі аб адтэрміноўцы, паколькі зьяўляецца студэнтам, у выездзе яму ўсё ж было адмоўлена. Актывіст адбыў 15 сутак адміністрацыйнага арышту за ўдзел 10 студзеня ў акцыі пратэсту прадпрымальнікаў.

# Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, люты 2008 году

У лютым у Беларусі асноўная ўвага праваабаронцаў была зьвернутая да разьвіцьця сітуацыі вакол палітвязьняў і ўзбуджаных па палітычных матывах крымінальных справаў. Асноўныя падзеі гэтага месяцу — касацыйны перагляд прысуду ў паўтара году зьняволеньня, вынесенага магілёўскім судом моладзеваму лідэру Артуру Фінькевічу і ягонае вызваленьне 5 лютага, касацыйны перагляд асуджанага да трох гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму журналіста Аляксандра Зьдзьвіжкова і ягонае вызваленьне 22 лютага, а таксама датэрміновае вызваленьне 16 лютага апазіцыйнага палітыка і журналіста Андрэя Клімава, асуджанага за публікацыю артыкулу ў інтэрнэце. Аднак, насуперак патрабаваньням Еўрасаюзу і ЗША, застаўся за кратамі асноўны апанент А. Лукашэнкі — былы кандыдат у Прэзідэнты Беларусі Аляксандр Казулін. Улады прапаноўвалі яму вызваленьне ўзамен на эміграцыю ў Германію і сыход з палітыкі. Увогуле, сітуацыя вакол сям'і Казуліных у сувязі з заўчаснай сьмерцю ягонай жонкі Ірыны Казулінай і тым фактам, што два дні ўлады адмаўлялі палітвязьню ў магчымасьці прысутнічаць на яе пахаваньні, стала дэманстрацыяй беспрэцэдэнтнай жорсткасьці і бесчалавечнага абыходжаньня. Такія паводзіны кіраўніцтва краіны можна расцаніць як парушэньне Канвенцыі супраць катаваньняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных ці прыніжаючых годнасьць відаў абыходжаньня і пакараньня, ратыфікаванай Рэспублікай Беларусь. Спачуваньні сям'і ў сувязі са сьмерцю Ірыны Казулінай выказалі прадстаўнікі міжнароднай супольнасьці, сярод якіх Прэзідэнт ЗША Джордж Буш, дакладчык па Беларусі Парламенцкай асамблеі Савету Еўропы (ПАСЕ) Андрэа Рыгоні. Намесьнік дзяржсакратара ЗША па пытаньнях дэмакратыі, правоў чалавека і працы Дэвід Крэмер ня змог прысутнічаць на пахаваньні Ірыны Казулінай, бо атрымаў візу толькі з 3 сакавіка. У дыпмісіі падкрэсьлілі, што ця-

пер візіт Дэвіда Крэмера ў Беларусь стане магчымым толькі пры ўмове безумоўнага вызваленьня Аляксандра Казуліна. Камісар Еўрасаюзу па зьнешніх сувязях і палітыцы добрасуседзтва Бэніта Фэрэра-Вальднэр таксама заклікала беларускія ўлады канчаткова вызваліць А. Казуліна.

Нягледзячы на адноснае паслабленьне ціску рэжыму на апанентаў, цалкам крымінальны перасьлед у Беларусі не спыняецца: вызваленьне палітычных вязьняў улады кампенсуюць новымі рэпрэсіямі. Працягвае заставацца за кратамі Андрэй Кім, якога абвінавачваюць у крымінальным злачынстве — зьбіцьці міліцыянта падчас правядзеньня акцыі пратэсту прадпрымальнікаў 21 студзеня, матэрыялы справы ў лютым падрыхтаваныя для перадачы ў суд. Акрамя таго, супраць А. Кіма ўзбуджаная другая крымінальная справа па ч.1 арт. 342 КК РБ — «Арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак» у сувязі з правядзеньнем акцыі прадпрымальнікаў 10 лютага. Таксама па гэтай справе падазраванымі праходзяць яшчэ 12 чалавек. У лютым трое ўдзельнікаў дэмакратычнай акцыі «Еўрапейскі марш» атрымалі пастановы, згодна з якімі яны падазраюцца ў злосным хуліганстве з пашкоджаньнем міліцэйскіх аўтамабіляў. Да таго ж да заяўнікаў «Еўрапейскага маршу» дзяржпрадпрыемства «Гаррэмаўтадар» Менгарвыканкаму прад'явіла грамадзянскі зыск на спагнаньне буйной сумы за прыборку вуліц.

У лютым зноў працягваліся акцыі пратэсту прадпрымальнікаў, удзельнікаў якіх каралі суткамі арышту і штрафамі.

21 лютага Еўрапарламент аднагалосна прыняў рэзалюцыю па Беларусі, дзе заклікаў беларускія ўлады вызваліць палітычных зьняволеных, даць свабоду слова і правесьці свабодныя выбары. Еўрадэпутаты віталі датэрміновае вызваленьне актывістаў дэмакратычнай апазіцыі і прынцыповае рашэньне аб адкрыцьці ў Менску прадстаўніцтва Еўракамісіі. Пры гэтым у рэзалюцыі выказваецца «глыбокае шкадаваньне», што становішча ў галіне дэмакратыі, правоў чалавека і вяршэнства закону ў Беларусі застаецца на ранейшым узроўні. Дакумент нагадвае, што ўмовы для пашырэньня стасункаў з Брусэлем і ўключэньня Беларусі ў Еўрапейскую палітыку добрасуседзтва — гэта 12 рэкамендацыяў, зробленыя Беларусі ў лістападзе 2006 году.

«Для беларускіх уладаў ня будзе ніякіх саступак, пакуль ня спыніцца патаптаньне правоў чалавека ў краіне. Недастаткова таго, каб Лука-

шэнка, гандлюючыся з намі, адпусьціў некалькіх палітвязьняў», — заявіла ў інтэрвію «Нямецкай хвалі» дэпутатка Еўрапарламенту Элізабэт Шродтар наконт рэзалюцыі па Беларусі, якая была прынятая 21 лютага.

## Палітычна матываваныя крымінальныя справы

Адміністрацыя папраўчай калоніі № 3 пісьмова праінфармавала сваякоў палітвязьня Аляксандра Казуліна аб тым, што яму адмоўлена ва ўмоўна-датэрміновым вызваленьні. З афіцыйнага дакументу вынікае, што асуджаны ня цьвёрда стаў на шлях выпраўленьня і зарэкамендаваў сябе з адмоўнага боку: мае 10 парушэньняў рэжыму ўтрыманьня. Акрамя таго, як заявіў міністр унутраных справаў Беларусі Уладзімір Навумаў, кароткатэрміновы адпачынак у сувязі са смерцю жонкі А. Казуліну быў дадзены насуперак існуючаму заканадаўству: з юрыдычнага пункту гледжаньня палітвязень ня меў права на гэты адпачынак, бо Казуліны афіцыйна былі ў разводзе.

Скончылася следзтва па крымінальнай справе супраць актывіста незарэгістраванай арганізацыі «Ініцыятыва» Андрэя Кіма, якога абвінавачваюць па арт. 364 УК РБ — «Гвалт альбо пагроза прымяненьня гвалту ў дачыненьні да супрацоўніка міліцыі». Пасьля таго як абвінавачаны азнаёміцца з матэрыяламі справы, яе перададуць у суд. Андрэй Кім быў затрыманы за ўдзел у менскай акцыі пратэсту прадпрымальнікаў 21 студзеня і пакараны 10-суткавым адміністрацыйным арыштам. 31 студзеня замест выхаду на волю, ён быў прызнаны падазраваным ва ўчыненьні крымінальнага злачынства і зьмешчаны ў СІЗА. Утрыманьне пад вартай было абскарджана ў судзе, аднак 14 лютага суд Цэнтральнага раёну Менску пакінуў бяз зьменаў абраную меру стрыманьня, паседжаньне праходзіла ў закрытым рэжыме. 19 лютага такое ж рашэньне вынес Менскі гарадзкі суд.

У лютым сьледчы аддзел ГУУС Менгарвыканкаму стварыў сьледчую групу па расьсьледаваньні крымінальнай справы па факце правядзеньня 10 студзеня ў Менску несанкцыянаванага масавага мерапры-

емства. Крымінальная справа ўзбуджаная адразу па двух артыкулах Крымінальнага кодэксу: па ч. 1 арт. 342 КК РБ — «Арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак» і ч. 2 арт. 339 «Хуліганства, учыненае групай асобаў альбо зьвязанае з супрацівам». Падазраванымі па дадзенай крымінальнай справе праходзяць актывісты Міхась Пашкевіч, Тацяна Цішкевіч, Міхась Субач, Алесь Чарнышоў, Алесь Стральцоў, Павал Вінаградаў, Аляксей Бондар, Аляксандр Баразенка, Максім Дашук, Уладзімір Сяргееў, Міхась Крываў і арыштаваны Андрэй Кім. Фактычна ўсе гэтыя актывісты былі прыцягнутыя да адміністрацыйнага арышту на тэрмін да 15 сутак за ўдзел у мітынгу прадпрымальнікаў, а студэнтка Тацяна Цішкевіч была асуджаная на 20 сутак арышту. Праводзяцца допыты.

Узбуджана крымінальная справа па ч. 2 арт. 339 КК РБ «Хуліганства» супраць трох удзельнікаў «Еўрапейскага маршу». Максім Сяргіец, Ліля Субач і Мацьвей Бяляй падазраюцца ў тым, што падчас правядзеньня шэсьця яны нібыта пашкодзілі два аўтамабілі, якія належаць ГУУС Менгарвыканкаму, чым прычынілі шкоду на 8 млн 691 тыс. 879 рублёў Праводзяцца допыты.

## Катаваньні ды іншыя віды жорсткага, бесчалавечнага абыходжаньня

Тры тыдні ў Жодзінскім СІЗА ў чаканьні адпраўкі на псіхіятрычнае лячэньне пазапраўна знаходзіўся вызвалены судом ад крымінальнай адказнасьці Аляксандр Круты. 24 студзеня суд Нясьвіскага раёну прызнаў яго вінаватым ва ўчыненьні крымінальнага злачынства па арт. 368 КК РБ — «Публічная абраза прэзідэнта краіны», аднак у сувязі з тым, што дзеяньні асуджанага ня маюць вялікай пагрозы для грамадзтва, А. Круты быў вызвалены ад пакараньня, а крымінальная справа спыненая. Між тым вызвалены ад крымінальнай адказнасьці А. Круты знаходзіўся ў сьледчым ізалятары Жодзіна, у сувязі з тым, што згодна з пастановай суду мера стрыманьня павінна быць адменена толькі па зьмяшчэньні А. Крутога ў псіхіятрычную бальніцу. Атрымалася, што вызвалены ад пакараньня па-ранейшаму знаходзіцца ў СІЗА. У той жа час

створаныя для асуджанага ўмовы зьяўляюцца катаваньнямі, бо ўвесь гэты час А. Круты ўтрымліваецца ў камеры-адзіночцы для асобаў, асуджаных пажыцьцёва. Вязьню забараняюць чытаць газеты, карыстацца літаратурай, нават падручнік ангельскай мовы, які прывезьлі сваякі, не дазволілі перадаць у камеру. Скарочаная на паўгадзіны працягласьць штодзённых прагулак. Усе тры тыдні падчас штодзённых аглядаў да яго не заходзіць ні начальнік СІЗА, ні іншыя адказныя асобы.

19 лютага судовая калегія па крымінальных справах Менскага абласнога суду адмяніла пастанову суду Нясвіскага раёну па абвінавачаньні Аляксандра Крутога ў публічнай абразе прэзідэнта Беларусі і адмяніла вытворчасьць па справе, а ён быў вызвалены.

## Парушэньні прынцыпу свободы слова і распаўсюду інфармацыі

11 лютага ўвечары за распаўсюд інфармацыйных матэрыялаў пра Еўрасаюз былі затрыманыя трое моладзевых актывістаў: Сяргей Розум, Дзяніс Ганчароў і Паліна Кур'яновіч. У РУУС Цэнтральнага раёну Менску ў іх узялі тлумачэньні і пасьля некалькіх гадзінаў адпусьцілі без складаньня пратаколаў.

18 лютага Гаспадарчы суд Віцебскай вобласьці адхіліў скаргу ЗАТ «Выдавецкі дом «Витебский курьер» (рэдакцыя недзяржаўнай газеты «Витебский курьер М») на дзеяньні аблвыканкаму, які беспадстаўна адмаўляецца перарэгістраваць прадпрыемства. У сувязі з гэтым падрыхтавана апеляцыйная скарга ў гэты ж суд. Недзяржаўная газета «Витебский курьер М» перапыніла выхад увесну 2007 году. Пасля гэтага Выдавецкі дом падаў у аблвыканкам дакументы на ўнясеньне зьменаў і дапаўненьняў у Статут (перарэгістрацыю). Абласны выканаўчы камітэт спачатку прыняў станоўчае рашэньне, але праз месяц сам жа яго адмяніў. Пры гэтым абласныя чыноўнікі спасылаліся на тое, што рэдакцыя нібыта не ўзгадніла свайго разьмяшчэньня з мясцовымі ўладамі, а памяшканьне выдавецкага дому не адпавядае патрабаваньням прэзідэнцкай Дырэктывы № 1 «Аб захадах па ўзмацненьні грамадзкай бясьпекі і дысцыпліны». Калі рашэньне аблвыканкаму

застанецца нязьменным, недзяржаўная газета «Витебский курьер М» страціць магчымасьць аднавіць дзейнасьць.

Горацкі райвыканкам зарэгістраваў грамадзка-палітычнага дзеяча Эдуарда Брокарава індывідуальным прадпрымальнікам з правам займацца рэкламнай дзейнасьцю і гандлем, аднак не зацьвердзіў яшчэ аднаго віду дзейнасьці — выданьня газетаў. Паводле пастановы, падпісанай старшынёй райвыканкаму Міхаілам Анікеевым, у раёне афіцыйна выходзяць тры газеты, якія цалкам забясьпечваюць насельніцтва інфармацыяй. «Яны ведаюць мяне як актывіста партыі БНФ, яны ведаюць мяне як актывіста руху «За свабоду». І як наогул чалавека з дэмакратычнымі поглядамі, а з дэмакратамі яны цяпер змагаюцца ўсімі спосабамі. Яны разумеюць, што пісаць пра ўраджаі і надоі я ня буду. Я буду пісаць пра тое, што бачу. Гэта адзін з маіх прынцыпаў. Ім не патрэбная праўда», — гэтак пракаментаваў пазіцыю райвыканкаму Э. Брокараў.

Э. Брокараў выдае ў Горках газеты «Ўзгорак» ды «Горацкі выбар», а таксама рэдагуе газету абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў Магілёўшчыны «Выбар».

## Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў

13 лютага пасьля адбыцьця 5-суткавага арышту за збор подпісаў пад зваротам да мясцовай улады з заклікам паспрыяць адмене прэзідэнцкага Указу № 760 у салігорскую дзяржаўтаінсьпекцыю быў выкліканы Аляксандр Цацура. Міліцыянты прад'явілі яму афіцыйную пастанову аб пазбаўленьні вадзіцельскіх правоў на два гады і выплаце штрафу ў памеры 350 тыс. рублёў

27 лютага суд Менскага раёну і г. Заслаўя разгледзеў адміністрацыйныя справы, складзеныя 10 студзеня на трох членаў сям'і прадпрымальніка з Салігорску А. Цацуры, а таксама Віктара Крываля. У той дзень яны накіроўваліся на ўласнай машыне Аляксандра Цацуры, які зьяўляўся адным з заяўнікаў запланаванага мітынгу прадпрымальнікаў, на акцыю ў сталіцу. Па дарозе ў Менск супрацоўнікі ДАІ затрымалі актывістаў і забралі ў кіроўцы вадзіцельскія дакументы нібыта на падставе парушэньня

правілаў дарожнага руху. Тады А. Цацура з сям’ёй і В. Крываль рушылі ў Менск пешкі, але іх пад прымусам даставілі ў РАУС Менскага раёну, дзе затрымалі на сем гадзінаў. У пастарунку міліцыянты абвінавацілі ўсіх чатырох у непадпарадкаваньні законным патрабаваньням супрацоўнікаў міліцыі і склалі пратаколы па арт. 23.4 КаАП. Судзьдзя Сяргей Афонскі прызнаў усіх вінаватымі ў правапарушэньні і вынес спагнаньне ў выглядзе штрафаў: Аляксандру Цацуру 50 базавых велічыняў, Тамары Цацура — 30 б. в., Ільлі Цацуру — 30 б. в. Віктару Крывалю, які адбываў 15-суткавы арышт, таксама завочна прысуджаны штраф у памеры 50 б. в.

13 лютага ў офісе Гомельскай арганізацыі АГП адбыўсяператрус на падставе таго, што напярэдадні ў цэнтры гораду былі затрыманыя актывісты дэмакратычнага руху Уладзімір Шумілін і Андрэй Аляшкевіч. Хлопцы распаўсюджвалі інфармацыйныя матэрыялы пра запланаваную сустрэчу жыхароў гораду з лідэрам руху «За свабоду» Аляксандрам Мілінкевічам, на якую мясцовыя ўлады не далі дазволу. У пастарунку ў актывістаў канфіскавалі каля тысячы ўлётак і склалі адміністрацыйныя пратаколы па арт. 23.34 КаАП — «Парушэньне парадку арганізацыі ці правядзеньня масавага мерапрыемства», а астатнія інфармацыйныя бюлетэні вырашылі пашукаць у офісе АГП.

12 лютага У. Шумілін і А. Аляшкевіч былі прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасьці ў выглядзе выплаты штрафу ў памеры 30 базавых велічыняў кожны.

13 лютага кіраўніка офісу АГП Уладзіміра Кацору выклікалі на размову ў гарадзкое Упраўленьне ўнутраных справаў. Як арганізатар сустрэчы з Аляксандрам Мілінкевічам ён узяў на сябе адказнасьць за выраб улётак і іх распаўсюд, быў складзены пратакол па арт. 23.34 КаАП. Суд Савецкага раёну Гомелю пакараў У. Кацору арыштам на тэрмін 7 сутак.

## Звальненьні і адлічэньні з вучобы па палітычных матывах

15 лютага лідэр моладзевага крыла Партыі БНФ кіраўнік культурніцкай камісіі Партыі БНФ Франак Вячорка быў азнаёмле-

ны з загадам рэктара Белдзяржуніверсітэту аб адлічэньні з 3-га курсу журфаку «за акадэмічную непасьпяховасьць», нягледзячы на тое, што да гэтага ён атрымліваў падвышаную стыпендыю за выдатныя адзнакі. 16 студзеня падчас сесіі Ф. Вячорка быў асуджаны нібыта за брыдкаслоўе на 15 сутак адміністрацыйнага арышту. Абскарджваючы прысуд, ён зьвярнуўся да кіраўніцтва факультэту з просьбай выступіць у якасьці сьведак і даць характарыстыку ягонай асобе, але атрымаў адмову. Моладзевы лідэр спачатку праз суд хацеў дабівацца аднаўленьня на вучобе, але пасьля кансультацыі з адвакатам вырашыў прайсьці ўсе магчымыя інстанцыі для свайго дасудовага аднаўленьня. Ф. Вячорка накіраваў ліст міністру адукацыі Аляксандру Радзькову, у якім зазначыў, што ў час здачы экзаменаў экзаменацыйнымі камісіямі быў сур'ёзна парушаны пункт 1.1 Палажэньня аб курсавых экзаменах і заліках у вышэйшых навучальных установах, таму адзнакі былі загадзя неаб'ектыўнымі.

25 лютага з Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі адлічаны сябра Партыі БНФ Ігар Пажарыцкі. Ігар ужо некалькі гадоў займаецца выданьнем незалежных студэнцкіх бюлетэняў: «Рэха» і «Студэнцкі гарадок». Падчас зімовай сесіі І. Пажарыцкаму пасьля чатырох пераздачаў не паставілі станоўчую адзнаку па адным з прадметаў. Яму паведамілі, што будзе прызначаная камісія. Калі Ігар Пажарыцкі прыйшоў на факультэт даведацца, калі адбудзецца паседжаньне камісіі, яму паведамілі, што ён адлічаны. Паводле кіраўніка Горацкай суполкі Партыі БНФ Эдуарда Брокарава, загаду аб адлічэньні хлопцу ня выдалі, і ён працягвае наведваць заняткі.

## Сьмяротнае пакараньне

5 лютага са сродкаў масавай інфармацыі стала вядома, што ў выкананьне прыведзены сьмяротны прысуд у дачыненьні да трох лідэраў гомельскай злачыннай групоўкі — Сяргея Марозава, Валерыя Гарбатага і Ігара Данчанкі. Як паведаміў БелаПАН адзін з гомельскіх адвакатаў, якія бралі ўдзел у судовым працэсе па справе «марозаўскай банды», дакументы аб прызнаньні С. Марозава памерлым прыйшлі на

мінулым тыдні ў ЗАГС Чыгуначнага раёну Гомелю. Генеральны сакратар Рады Еўропы Тэры Дэвіс выступіў з асуджэньнем новых фактаў прымяненьня ў Беларусі пакараньня сьмерцю ў якасьці вышэйшай меры: «Беларусь, вядома, не зьяўляецца членам Рады Еўропы, які адмяніў пакараньне сьмерцю на падставе Пратаколу № 6 Еўрапейскай канвенцыі аб правах чалавека, але яна ўваходзіць у склад Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Аднак пакараньне сьмерцю С. Марозава, В. Гарбатага і І. Данчанкі — гэта яўнае грэбаваньне нядаўняй рэзалюцыяй Генеральнай асамблеі ААН, якая заклікае да глабальнага мараторыю на пакараньне сьмерцю», — зазначыў генеральны сакратар.

## Парушэньні права на свабоду сумленьня

5 лютага пастар пратэстанцкай царквы «Новае жыцьцё» Вячаслаў Ганчарэнка і юрыст Сяргей Луканін былі выкліканыя ў пракуратуру Маскоўскага раёну сталіцы ў сувязі з адмовай кіраўніцтва ўпусьціць прадстаўнікоў Энэрганагляду ў будынак царквы. Намесьнік пракурора Д. Зыранаў папрасіў тлумачэньняў і папярэдзіў, што за чарговае парушэньне заканадаўства царкве пагражае штраф па арт. 23.1 КаАП РБ, а таксама могуць быць выкарыстаныя і «іншыя меры рэагаваньня».

11 лютага пастары больш як сарака беларускіх цэркваў, што ўваходзяць у Аб'яднаньне абшчын хрысьціянаў поўнага Евангельля, зьвярнуліся да А. Лукашэнкі. У лісьце яны выказалі занепакоенасьць у сувязі з узмацненьнем ціску на пратэстанцкія цэрквы. Асаблівая ўвага ў лісьце была нададзена супрацьстаяньню сталічных уладаў і менскай царквы «Новае жыцьцё». «У гэтым лісьце гаворыцца, што калі ўлады і надалей будуць аказваць ціск на біскупа нашага аб'яднаньня Вячаслава Ганчарэнку, то ўсе цэрквы нашага аб'яднаньня пакідаюць за сабой права прымаць удзел у акцыях грамадзянскага непадпарадкаваньня па ўсёй Беларусі» — заявіў юрыст царквы «Новае жыцьцё» С. Луканін.

У канцы лютага ў Канстытуцыйны суд Беларусі, парламент, а таксама ў Адміністрацыю прэзідэнта былі перададзеныя 50 тыс. подпісаў незадаволеных Законам «Аб свабодзе сумленьня і рэлігійных арганізацыяў». Гэта вынік шматмесячнай працы, якую ў межах кампаніі «За свабоду

веры!» праводзілі вернікі розных пратэстанцкіх цэркваў — Рэлігійнага аб'яднаньня абшчын хрысьціян поўнага Евангельля, рэлігійнай абшчыны «Царква Божая», сталічнай царквы «Запавет Хрыста» і аргкамітэту па стварэньні партыі «Беларуская хрысьціянская дэмакратыя». Подпісы зьбіраліся ў больш чым 40 гарадах па ўсёй Беларусі. Аргкамітэт кампаніі «За Свабоду веры!» прапануе ўраду стварыць рабочую групу, якая б выпрацавала зьмены ў рэлігійным заканадаўстве і аднавіла правы вернікаў усіх канфесіяў.

## Парушэньні права на свободу мірных сходаў

Салігорскі райвыканкам не дазволіў правядзеньне мітынгу ў абарону сацыяльных гарантыяў 2 сакавіка на цэнтральнай плошчы гораду. Рашэньне выканкаму ня стала нечаканасьцю для арганізатараў акцыі. Заяўнік мітынгу Павал Батуеў так пракаментаваў гэтае рашэньне: «Шчыра кажучы, нічога іншага ад нашых вертыкальшчыкаў і не чакаў. Забарону мітынгу лічу цалкам супрацьпраўнай, яна супярэчыць Канстытуцыі РБ і Міжнародным дамоўленасьцям. Цяпер жа вымушаны заявіць, што ў сувязі з адмоваю ў дазволе на правядзеньне мітынгу я цалкам здымаю з сябе адказнасьць за магчымую акцыю 2 сакавіка на цэнтральным пляцы. На мой погляд, кіраўніцтва гораду заганяе само сябе ў кут. З гэтага моманту яны самі мусяць адказваць за падзеі, што, напэўна, будуць разгортвацца на плошчы ў нядзелю».

Тым часам Кааліцыя салігорскіх дэмсілаў працягвае інфармацыйную кампанію да мітынгу ў абарону сацыяльных гарантыяў. Афіцыйная забарона ня ўнесла значных карэктываў у іх планы. На выходных кааліцыя абмеркавала магчымыя варыянты разгортваньня падзеяў. Спектр агучаных прапановаў быў самы шырокі, ад адмовы правядзеньня мітынгу ў выпадку яго забароны да патрабаваньня часу ў эфіры на мясцовым тэлеканале СТК у выпадку выхаду на плошчу вялікай колькасьці пратэстоўцаў.

25 лютага пачаўся судовы працэс над заяўнікамі дэмакратычнай акцыі «Еўрапейскі марш», якая прайшла 14 кастрычніка 2007 году. Анатоля Лябедзьку, Віктара Івашкевіча, Яўгена Афнагеля і Зьмітра Хведарука вінавацяць у тым, што быў зьменены вызначаны марш-

рут і падчас руху калоны дэманстранты засьмецілі сталічныя вуліцы ад Кастрычніцкай плошчы да плошчы Бангалор. Прадпрыемства «Гаррэмаўтадар» Менгарвыканкаму патрабуе спагнаць з адказчыкаў 2.135.974 беларускіх рублёў (1 тыс. даляраў). Судзьдзя Сяргей Баразна прыняў рашэньне зрабіць перапынак у судовым паседжаньні з прычыны хваробы аднаго з арганізатараў акцыі Віктара Івашкевіча.

Баранавіцкім індывідуальным прадпрымальнікам гарадзкія ўлады адмовілі ў правядзеньні агульнага сходу з прадстаўнікамі ўлады. Ён быў запланаваны на 28 лютага. Чыноўнікі палічылі правядзеньне такога сходу «немэтазгодным». Аднак прадпрымальнікі падалі ў гарвыканкам новую заяўку і па-ранейшаму настойваюць на прадастаўленьні ім залы для сустрэчы. Калі яе зноў не дадуць, яны маюць намер 1 сакавіка сабрацца на тэрыторыі баранавіцкага кааператыўнага рынку.

25 сакавіка ў судзе Чыгуначнага раёну Віцебску адбылося судовае паседжаньне над дэмакратычнымі актывістамі, затрыманымі падчас жалобнай акцыі ў сувязі са сьмерцю Ірыны Казулінай. Распаўсюднік незалежнай прэсы Барыс Хамайда і грамадзкая актывістка Алена Залеская абвінавачваюцца ў адміністрацыйным правапарушэньні па арт. 23.34 КаАП — «Парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавага мерапрыемства». На пачатку працэсу судзьдзя Ала Бардзюкова задаволіла хадайніцтва Б. Хамайды аб прадастаўленьні перакладчыка на беларускую мову і перанесла паседжаньне на 4 сакавіка, адпусьціўшы затрыманых.

## Дзейнасьць сьпецслужбаў

21 лютага грамадзкі актывіст з Гродна Эдвард Дмухоўскі наведаў паводле позвы абласную ўправу КДБ, дзе атрымаў папярэджаньне аб недапушчальнасьці дзеяньняў, якія груба парушаюць грамадзкі парадак. На думку Э. Дмухоўскага, супрацоўнік КДБ Алег Жывушка меў на мэце аказаць на яго псіхалагічны ціск. Пасля размовы ён пад росьпіс азнаёміў актывіста з наступствамі, якія яго чакаюць у сувязі з магчымымі супрацьпраўнымі дзеяньнямі, і паведаміў, што ў выпадку парушэньня арт. 342 КК дакументы будуць перададзеныя ў пракуратуру для далейшага разьбіральніцтва.

# Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, сакавік 2008 году

Асноўнай падзеяй сакавіка на Беларусі было 90-годзьдзе абвяшчэньня Беларускай Народнай Рэспублікі і традыцыйнае сьвяткаваньне 25 сакавіка Дня Волі. Інфармацыйная падрыхтоўка да адзначэньня сьвята Незалежнасьці пачалася загадзя. Яшчэ 6 лютага была пададзеная заяўка ў Менгарвыканкам на правядзеньне шэсьця і ўрачысты мітынг. Заяўнікамі выступілі старшыня Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі, кіраўнік АГП Анатоль Лябедзька, кіраўнік руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч і старшыня аргкамітэту па стварэньні БСДП (Народная Грамада) Мікола Статкевіч. Планавалася, што ўдзельнікі акцыі зьбяруцца на плошчы Якуба Коласа перад будынкам Белдзяржфілармоніі, пройдуць па прасьпекце Незалежнасьці да вуліцы Валадарскага, а пасьля — па вуліцах Гарадзкі Вал, Максіма Багдановіча, Янкі Купалы — да скверу Янкі Купалы, дзе адбудзецца мітынг. Аднак, як звычайна, гарадзкія ўлады не дазволілі шэсьце па абраным маршруце і прапанавалі свой маршрут — ад Акадэміі навук да плошчы Бангалор. Арганізатары акцыі ад яго адмовіліся і заклікалі сваіх прыхільнікаў падчас маршу наведаць шэраг гістарычных месцаў гораду. 25 сакавіка міністр унутраных справаў Беларусі Уладзімір Навумаў заявіў, што ў такім выпадку праваахоўныя органы будуць перарываць акцыю апазіцыі, будзе задзейнічана больш людзкіх сілаў і тэхнічных сродкаў.

Акрамя шэсьця ў гонар 90-годзьдзя абвяшчэньня БНР зьявілася новая форма грамадзкай мабілізацыі — напісаньне агульнабеларускай дыктоўкі, мэта якой — павысіць статус беларускай мовы ў грамадстве. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел палітычныя і культурныя дзеячы, кіраўнікі і актывісты недзяржаўных арганізацыяў, амбасадары розных краінаў, а таксама ўсе жадаючыя жыхары краіны.

З 25 па 30 сакавіка ў інтэрнэце працаваў запланаваны агульнаграмадзкі форум «За Незалежнасьць», у якім закраналіся пытаньні «Дзяржаўна-палітычных асьпектаў беларускай незалежнасьці», «Культурна-моўных гарантыяў беларускай нацыянальнай тоеснасьці» і «Эканамічныя падваліны і персьпектывы беларускай незалежнай дзяржаўнасьці». Удзел у дыскусіі бралі як вядомыя эксьперты — палітолагі, філосафы, юрысты, мовазнаўцы, мастацтвазнаўцы, эканамісты, так і шараговыя грамадзяне.

90-годзьдзе абвяшчэньня БНР было адзначана і міжнароднай супольнасьцю. 10 —13 сакавіка ў Страсбургу ў рамках чарговай сесіі Еўрапарламенту прайшлі мерапрыемствы пад назвай «Беларускі тыдзень». Як паведамілі ў офісе ініцыятара гэтага праекту, кіраўніка дэлегацыі па сувязях з Беларусьсю, польскага дэпутата Яцка Пратасевіча прайшлі запланаваныя дыскусіі і сустрэчы з прадстаўнікамі беларускай грамадзкасьці, іх прэс-канферэнцыя, а таксама абмен думкамі па тэме «Незалежная Беларусь — неад’емная частка Еўропы». «Беларускі тыдзень» арганізавала найбуйнейшая фракцыя Еўрапарламенту — фракцыя Еўрапейскай народнай партыі — Еўрапейскіх дэмакратаў.

Як і абяцаў кіраўнік МУС, 25 сакавіка ў Дзень Волі сталічныя ўдзельнікі сьвяточнай дэманстрацыі былі атакаваныя прадстаўнікамі сьпецпадразьдзяленьняў. Супраць мірных грамадзянаў была ўжытая грубая фізічная сіла і сьпецсродкі. У выніку дзясяткі былі зьбітыя, больш за сотню ўдзельнікаў затрыманыя, сярод якіх былі непаўнагадовыя, журналісты шэрагу нацыянальных незалежных і замежных СМІ, замежныя грамадзяне. Затрымлівалі і актывістаў у рэгіёнах, перашкаджалі выезду ў Менск. 26 сакавіка пачаліся судовыя разгляды адміністрацыйных справаў затрыманых удзельнікаў акцыі. Паводле складзеных міліцыянтамі пратаколаў іх абвінавацілі ў парушэньні парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў, у выніку чаго толькі ў сталіцы за кратамі апынуліся 26 чалавек, каля 50 былі аштрафаваныя.

Усьлед за масавымі арыштамі ўлады пачалі татальны наступ на незалежныя СМІ. Цягам дня 27 сакавіка ад раніцы ў Менску, а таксама ў шэрагу гарадоў па ўсёй Беларусі адбылісяператрусы ў журналістаў, якія працавалі на незалежныя беларускія СМІ. Іх

праводзілі супрацоўнікі КДБ, якія мелі пракурорскую санкцыю наператрус у рамках крымінальнай справы, распачатай у 2005 годзе за паклёп на А. Лукашэнку, у памяшканьнях «Радыё Рацыя», «Еўрапейскага радыё для Беларусі», тэлекампаніі «Белсат», а таксама ў прыватных кватэрах журналістаў і ў офісах грамадзкіх аб'яднаньняў. У выніку ў рэдакцыях былі канфіскаваныя кампутары і ўсе носьбіты інфармацыі. Паводле сьледчых, тэхніку будуць правяраць на наяўнасьць прыкметаў стварэньня і распаўсюду мультфільмаў палітычнага зьместу.

БАЖ зьвярнуўся да ўсіх міжнародных журналісцкіх і праваабарончых арганізацыяў, кіраўнікоў еўрапейскіх інстытутаў з просьбай выступіць з патрабаваньнем да беларускіх уладаў — спыніць гэтую беспрэцэдэнтную акцыю перасьледу незалежных журналістаў. Па словах старшыні арганізацыі Жанны Літвіной, гэтая маштабная акцыя КДБ была скіраваная ў першую чаргу на тое, каб выставіць бар'еры на шляхах распаўсюду інфармацыі і напалохаць журналістаў.

## Палітычна матываваныя крымінальныя справы

4 сакавіка ў Менску арыштаваны лідэр віцебскіх прадпрымальнікаў Сяргей Парсюкевіч і зьмешчаны ў СІЗА на вул. Валадарскага. 13 сакавіка яму прад'явілі абвінавачаньне ва ўчыненьні крымінальнага злачынства па арт. 364 КК РБ — «Гвалт альбо пагроза ўжываньня гвалту ў дачыненьні да супрацоўніка міліцыі». За ўдзел у мітынгу прадпрымальнікаў 21 студзеня С. Парсюкевіч быў пакараны 15-суткавым арыштам. Міліцыянт-ахоўнік у Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў Аляксандр Дулуб абвінаваціў прадпрымальніка ў сваім зьбіцьці. 14 сакавіка суд Маскоўскага раёну сталіцы разгледзеў скаргу пра замену меры стрыманьня актывіста і пакінуў яе без задавальненьня. З-за недахопу лекаў у С. Парсюкевіча пачаліся праблемы са здароўем — абвастрылася астма.

Крымінальная справа супраць С. Парсюкевіча была ўзбуджаная 31 студзеня. У канцы сакавіка пракуратура перадала яе ў суд Маскоўскага раёну Менску.

4 сакавіка крымінальную справу Андрэя Кіма перадалі ў Цэнтральны суд сталіцы, пачатак разгляду прызначаны на 1 красавіка. Спра-

ву будзе весьці судзьдзя Алена Ільіна. Актывіста незарэгістраванай арганізацыі «Ініцыятыва», які быў затрыманы ў Менску падчас акцыі пратэсту прадпрымальнікаў 21 студзеня і пакараны 10-суткавым адміністрацыйным арыштам, абвінавачваюць паводле арт. 364 КК — «Гвалт альбо пагроза ўжываньня гвалту ў дачыненьні да супрацоўніка міліцыі». Паводле гэтага артыкулу юнаку пагражае да шасьці гадоў турмы. З Цэнтру ізаляцыі правапарушальнікаў Андрэй Кім быў дастаўлены ў пракуратуру, дзе атрымаў статус падазраванага, а пасьля зьмешчаны ў СІЗА на Валадарскага. Таксама актывісту прад'яўлена яшчэ адно абвінавачаньне ў крымінальным злачынстве па ч.1 арт. 342 КК РБ — «Арганізацыя і падрыхтоўка дзеяньняў, якія груба парушаюць грамадзкі парадак, або актыўны ўдзел у іх» за мітынг прадпрымальнікаў 10 студзеня.

13 сакавіка дачка палітвязьня Аляксандра Казуліна Юлія падала прашэньне аб зьмякчэньні пакараньня зьняволенаму палітыку (замене яго грамадзкімі ці папраўчымі працамі), аднак А. Казуліну ў гэтым паўторна было адмоўлена на падставе наяўнасьці ў яго парушэньняў рэжыму ў калоніі. У сакавіку нямецкая філія праваабарончай арганізацыі «Міжнародная амністыя» праводзіла акцыі салідарнасьці з палітвязьнем А. Казуліным. Арганізацыя заклікала ўсіх, каму неабыякавы ягоны лёс, ад 25 да 28 сакавіка перавесьці на рахунак беларускай амбасады ў Берліне альбо Боне 1 цэнт з пазначэньнем «Свабоду Казуліну». Таксама 25 сакавіка «Міжнародная амністыя» правяла пікет перад будынкам беларускай дыпламатычнай місіі ў Берліне.

26 сакавіка судзьдзя Ленінскага раённага суду Гародні Дзьмітры Кобрынец прызнаў 23-гадовага Аляксея Сарнова вінаватым па арт. 341 КК РБ — «Псаваньне маёмасьці» і аштрафаваў на 35 базавых велічыняў (1 млн 225 тыс. рублёў). Крымінальная справа па факце нанясеньня надпісу «Вярніце льготы» на сьценах дамоў была распачатая яшчэ 17 сьнежня мінулага году, калі ў затрыманага ўначы А. Сарнова ў заплечніку міліцыянты знайшлі балончыкі з фарбай.

27 сакавіка крымінальную справу, якую распачала пракуратура супраць удзельнікаў акцыі прадпрымальнікаў 10 студзеня, перадалі ў суд Цэнтральнага раёну Менску. 14 чалавек (Андрэй Кім, Тацяна Цішкевіч, Міхаіл Субач, Алесь Чарнышоў, Алесь Стральцоў, Міхаіл

Пашкевіч, Павал Вінаградаў, Аляксей Бондар, Аляксандр Баразенка, Максім Дашук, Уладзімір Сяргееў, Міхась Крываў, Антон Койпіш і непаўнагадовы Арцём Дубскі) абвінавачваюцца па ч.1 арт. 342 КК РБ — «Арганізацыя і падрыхтоўка дзеяньняў, якія груба парушаюць грамадзкі парадак, або актыўны ўдзел у іх». Паводле гэтага артыкулу прадугледжваецца пакараньне ад штрафу да трох гадоў пазбаўленьня волі.

27 сакавіка ў Полацкім гарадзкім судзе павінен быў пачацца судовы працэс над моладзевай актывісткай Кацярынай Салаўёвай, адлічанай у студзені 2008 году з 2 курсу гісторыка-філалагічнага факультэту Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэту. У канцы лютага ёй прад'явілі афіцыйнае абвінавачаньне па крымінальным артыкуле 193.1 КК РБ за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі «Малады Фронт» і перадалі матэрыялы справы ў суд. Моладзевай актывістцы пагражае пакараньне ў выглядзе штрафу, арышту тэрмінам да шасьці месяцаў ці пазбаўленьне волі да двух гадоў. У сувязі з тым, што 25 сакавіка Кася Салаўёва была затрыманая за ўдзел у ствяткаваньні Дня Волі і пакараная адміністрацыйным арыштам на 5 сутак, судовае паседжаньне перанесенае на 8 красавіка.

## Катаваньні і іншыя віды жорсткага, бесчалавечнага абыходжаньня

У выніку сілавога разгону мірных дэманстрантаў у Дзень Волі больш за 20 чалавек атрымалі траўмы рознай цяжкасьці, двое затрыманых — Грышчэня Яраслаў і Карэтнікаў Юрась былі шпіталізаваныя. Пры выкананьні сваіх прафесійных абавязкаў быў зьбіты фотажурналіст незалежнага выданьня «Наша Ніва» Андрэй Лянкевіч.

Міжнародная праваабарончая арганізацыя «Amnesty International» выступіла з адмысловай заявай з нагоды падзеяў 25 сакавіка ў Менску, у якой асудзіла празьмернае прымяненьне сілы» ў дачыненьні да ўдзельнікаў мірнай маніфестацыі ў гонар 90-х угодкаў абвяшчэньня Беларускай Народнай Рэспублікі. Паводле сьведкаў падзеяў — праваабаронцаў і журналістаў — міліцыянты зьбівалі людзей дубінкамі

і нагамі, былі арыштаваныя больш як 100 чалавек, 76 з іх былі асуджаныя. Быў зьбіты і затрыманы журналіст газеты «Наша Ніва» Андрэй Лянкевіч, зьбітыя два літоўскія тэлевізійныя журналісты.

## Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў

23 сакавіка ў жодзінскім гарадзкім парку каля помніку «Героі жывуць вечна» сабраліся каля паўсотні чалавек, якія ўсклалі кветкі і запусьцілі ў неба белыя і чырвоныя паветраныя шарыкі. На наступны дзень ў Жодзінскім гарадзкім судзе разглядаліся адміністрацыйныя справы арганізатараў акцыі Паўла Красоўскага, Юрася Жылкі, Аляксандра Камароўскага і Юрыя Сілкіна, якіх абвінавацілі ў арганізацыі несанкцыянаванай акцыі і пакаралі арыштам на сем сутак кожнага.

24 сакавіка вечарам у майстэрні кіраўніка творчай суполкі «Пагоня» вядомага мастака Аляксея Марачкіна быў праведзены незаконны ператрус. Міліцыянты канфіскавалі плакаты, сьцягі, расьцяжкі, прысьвечаныя сьвяткаваньню Дня Волі. Сам мастак і прысутны ў майстэрні моладзевы актывіст Аляксей Кашкароў былі дастаўленыя ў Цэнтральны РУУС, дзе на іх склалі адміністрацыйныя пратаколы па арт. 17.1 КаАП — дробнае хуліганства, а затым адвезьлі на Акрэсьціна. Абодвух суд пакараў адміністрацыйным арыштам на 5 сутак нібыта за нецэнзурную лаянку каля Цэнтральнага РУУСу Менску.

26 сакавіка ў судах Савецкага, Завадзкога, Маскоўскага і Партызанскага раёнаў Менску адбыліся суды над затрыманымі ўдзельнікамі сьвяткаваньня Дня Волі 25 сакавіка. Усяго разглядалася каля 75 адміністрацыйных справаў, 26 з іх завяршыліся арыштамі на тэрмін ад 5 да 15 сутак. Справы непаўнагадовых адпраўленыя на адміністрацыйныя камісіі выканкамаў.

25 сакавіка ў Віцебску затрымалі актывістаў КХП-БНФ Яна Талпыгу і Алеся Пазьняка, Барыса Хамайду, Алену Залескую, Антаніну Піванос. Першых двух пакаралі адміністрацыйным арыштам на тэрмін

8 сутак кожнага, А. Залеская пакараная штрафам у памеры 20 базавых велічыняў, А. Піванос аштрафаваная на 2 базавыя велічыні, суд над Б. Хамайдам перанесены на 1 красавіка.

25 сакавіка падчас мірнага ўскладаньня кветак да «Крыжа пакут» у цэнтры Баранавічаў былі затрыманыя мясцовыя прадстаўнікі грамадзкасьці. 14 чалавек былі дастаўленыя ў міліцэйскі пастарунак, пасьля двое непаўнагадовых былі адпушчаныя. Інваліду 2-й групы з дзяцінства Алесю Шчарбакову стала кепска, была выкліканая «хуткая дапамога», якая прыехала толькі праз гадзіну. У выніку актывіста шпіталізавалі. 26 сакавіка прайшлі суды над затрыманымі, усе былі пакараныя штрафамі ў памеры ад 5 да 15 базавых велічыняў па арт. 23.34 КаАП — «Парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў».

## Парушэньні прынцыпу свободы слова і распаўсюду інфармацыі

24 сакавіка Ленінскі суд Менску прызнаў дэмакратычных актывістак Марыю Аліеву і Алену Напорка вінаватымі па ч.1 арт. 23.34 КаАП РБ («Парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў») і пакараў грашовым штрафам памерам у 10 базавых велічыняў кожную. Жанчыны былі затрыманыя 22 сакавіка за распаўсюд газеты «Вольная Серабранка», у якой зьмяшчалася інфармацыя пра запланаванае шэсьце на Дзень Волі. Пасьля затрыманьня да суду пенсіянеркі Аліева і Напорка два дні правялі ў Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў на вуліцы Акрэсьціна.

Недзяржаўная газета «Новы час» атрымала адразу два папярэджаньні ад Міністэрства інфармацыі, падпісаныя 25 сакавіка намесьніцай міністра інфармацыі Ліліяй Ананіч. Галоўны рэдактар выданьня Аляксей Кароль лічыць, што прэтэнзіі міністэрства надуманыя, бо «не было больш за што чапляцца». Ён паведаміў таксама, што найбліжэйшым часам зьбіраецца абскарджваць санкцыі Міністэрства.

27 сакавіка грамадзкае аб’яднаньне «Беларуская асацыяцыя журналістаў» зьвярнулася да генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь Рыгора Васілевіча з просьбай «зрабіць усе прадугледжаныя законам захады», каб спыніць масавыяператрусы ў кватэрах журналістаў і офісах недзяржаўных СМІ, а таксама перасьлед журналістаў супрацоўнікамі праваахоўных органаў. У заяве, якую ГА «БАЖ» тэрмінова накіравала ў пракуратуру краіны, прыводзяцца факты ператрусаў, якія 27 сакавіка адбыліся ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Арганізацыя асабліва зьвяртае ўвагу генпракурора на тое, што з кватэраў журналістаў забралі аргтэхніку, аўдыё- і відэаапаратуру, друкаваную прадукцыю, а некаторым журналістам да таго ж уручылі позвы ў КДБ.

## Парушэньні права на свабоду сумленьня

6 сакавіка ў судзе гораду Жодзіна адбыўся суд па адміністрацыйным матэрыяле начальніка Жодзінскага ГАУС В. М. Шляхціна на адміністратара-пастара Царквы Хрысьціянаў Веры Евангельскай «Царква Сьвятой Тройцы» Валянціна Лугоўскага. Яму прысудзілі штраф у памеры 5 базавых велічыняў (175 тыс. рублёў) за правядзеньне несанкцыянаванага набажэнства.

Канстытуцыйны суд Беларусі адмовіўся разглядаць прапановы зьменаў у рэлігійным заканадаўстве краіны, пад якімі падпісаліся больш за 50 тыс. беларусаў. У адказе суду падкрэсьлена, што грамадзяне ня могуць уносіць прапановы ў Канстытуцыйны суд, гэта кампетэнцыя дзяржаўных органаў, ураду альбо прэзідэнта краіны. Каардынатар кампаніі ў абарону права на свабоду сумленьня Сяргей Луканін кажа, што вернікі прасілі Канстытуцыйны суд па сваёй ініцыятыве накіраваць зварот у Палату прадстаўнікоў, бо заканадаўства нашай краіны дазваляе Канстытуцыйнаму суду разглядаць кожны закон па ўласнай ініцыятыве. «На жаль, нам адмовілі. Больш за тое, я лічу, што наш зварот праігнаравалі. Адказ быў падпісаны нават не судзьдзёй, а намесьнікам сакратара», — зазначыў С. Луканін.

24 сакавіка пракуратура Менску склала адміністрацыйны пратакол на пратэстанцкага пастара царквы «Новае жыцьцё» Вячаслава

Ганчарэнку за арганізацыю збору подпісаў грамадзянаў за ўнясеньне зьменаў у рэлігійнае заканадаўства. Пратакол накіраваны ў суд.

## Парушэньні права на свободу мірных сходаў

11 — 12 сакавіка ў Савецкім судзе Менску адбываўся разгляд зыску арганізацыі «Гаррэмаўтадар» да арганізатараў «Еўрапейскага маршу», які прайшоў у Менску 14 кастрычніка мінулага году. Заяўнікаў акцыі Анатоля Лябедзьку, Віктара Івашкевіча, Вінцука Вячорку, Аляксандра Мілінкевіча, Яўгена Афнагеля і Зьмітра Хведарука абвінавацілі ў тым, што ў выніку адхіленьня ад вызначанага гарадзкімі ўладамі маршруту (замест шэсьця ад Акадэміі навук да плошчы Бангалор пачалі марш ад Кастрычніцкай плошчы) падчас руху калоны дэманстранты засьмецілі сталічныя вуліцы. Першапачаткова дзяржпрадпрыемства Менгарвыканкаму ацаніла дадатковыя выдаткі, патрачаныя на прыборку вуліц сталіцы, у 2 млн 135 тыс. 974 рублёў Аднак на судзе высьветлілася, што яшчэ некалькі прадпрыемстваў Менску таксама выставілі зыскі арганізатарам дэмакратычнай акцыі. Напрыклад, ЖРЭА Цэнтральнага раёну патрабуе 673 870 рублёў за шкоду, нанесеную жылым дамам і дваравым тэрыторыям; ЖРЭА Савецкага раёну — 951 088 за шкоду жылым дамам, фасадам і дошкам абʼяваў; ЖРЭА Ленінскага раёну — 239 697 рублёў за пашкоджаную вадасьцёкавую трубу на жылым доме № 22 па праспекце Незалежнасьці; УП «Менскзеляанбуд» — 1 433 798 за матэрыяльную шкоду (вытаптваньне восеньскага газону, паламанае дрэўца ля Сьвіслачы і пашкуматанае кустоўе) і г. д. Такім чынам, сума кампенсацыі выдаткаў дасягнула 10 млн рублёў.

## Дзейнасьць сьпецслужбаў

19 сакавіка на працу да маці Ігара Міхалеўскага, старшыні Рэчыцкай суполкі Моладзі БНФ, прыходзіў супрацоўнік КДБ, які пагражаў жанчыне штрафамі ў дачыненьні да сына і нават пакараньнямі ў выглядзе адміністрацыйнага арышту, калі хлопец ня спыніць сваю дзейнасьць.

Супрацоўнік КДБ паведаміў, што Ігар зладзіў мітынг падчас сустрэчы з былым кандыдатам у прэзідэнты Аляксандрам Мілінкевічам. Асабліва «візіцёр» зьвярнуў увагу маці на акцыю 25 сакавіка і папярэдзіў, што яе сыну лепей ня ехаць на яе ў Менск.

## Звальненьні па палітычных матывах

Актрысу Ганну Саламянскую звольнілі з Рускага тэатру, а Марыю Юрэвіч — з тэатра Беларускай Арміі пасьля гастроляў «Свабоднага тэатра» ў Лондане. Да таго ж, М. Юрэвіч працавала па разьмеркаваньні, і цяпер яна вымушаная будзе аддаваць дзяржаве грошы за тое, што не адпрацавала поўныя два гады. Кіраўнік «Свабоднага тэатру» зьвярнуўся да брытанскіх акцёраў, і шмат хто з іх пагадзіўся дапамагчы «выкупіць» беларускую актрысу.

# Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, красавік 2008 году

У красавіку ў Беларусі адбыліся суды над дэмакратычнымі актывістамі па ўзбуджаных па палітычных матывах крымінальных справах. У выніку зьявілася 12 новых палітвязьняў, двое з якіх пакараныя турэмным зьняволеньнем. Нягледзячы на заклікі міжнародных структураў, Еўрапейскага Саюзу і ЗША да беларускіх уладаў, крымінальны перасьлед у Беларусі не спыніўся, а рэпрэсіі набылі новыя формы.

29 красавіка ў Менску адбылася прэс-канферэнцыя «Ацэнка сучаснай сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі» і прэзентацыя штогадовага Аналітычнага агляду «Парушэньні правоў чалавека ў Беларусі ў 2007 годзе». Удзел у прэс-канферэнцыі ўзялі вядомыя беларускія праваабаронцы, прадстаўнік чэскай дыпмісіі, АБСЕ, ахвяры палітычных рэпрэсіяў. Падсумоўваючы вынікі 2007 году, віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека Алесь Бяляцкі зазначыў, што зацісканьне грамадзкіх і палітычных правоў у нашай краіне зьяўляецца лагічным разьвіцьцём таталітарнага рэжыму ў Беларусі, для якога правы чалавека — гэта рэч варожая, несумяшчальная з ягоным існаваньнем. І сітуацыя працягвае пагаршацца па ўсіх паказальніках: рухавік рэпрэсіяў не спыняецца, яму патрэбныя новыя і новыя ахвяры. Доказ таму — зьяўленьне новых палітвязьняў.

26 красавіка адбыўся традыцыйны «Чарнобыльскі шлях», прымеркаваны да ўгодкаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. У 2008 годзе акцыя праходзіла пад знакам пратэсту супраць пабудовы ў Беларусі атамнай электрастанцыі, а таксама адмены льготаў ліквідатарам і ахвярам катастрофы ў Чарнобылі. Мінгарвыканкам задаволіў заяўку на правядзеньне мітынгу і шэсьця, аднак зьмяніў прапанаваны заяўнікамі маршрут акцыі. Акрамя таго, 24 красавіка чацьвёра заяўнікаў дэмакратычнай акцыі былі выкліканыя ў сталічную пракуратуру, дзе пракурор Менску

Мікалай Кулік папярэдзіў іх пра гатоўнасьць пачаць крымінальныя справы ў выпадку, калі будуць парушэньні заканадаўства. Напярэдадні акцыі КДБ сканфіскавала ўлёткі і абвесткі да шэсьця Партыі БНФ, Аб’яднаных дэмакратычных сілаў і «Руху за Свабоду». Наклады канфіскоўваліся яшчэ па дарозе да партыйных офісаў.Ператрусы ў пошуку інфармацыйнай прадукцыі праходзілі ва ўсіх падазроных офісах, некалькі друкарняў, якія падазраваліся ў друку ўлётак, былі апячатаныя напярэдадні дэманстрацыі. Як звычайна, рэгіянальныя грамадзкія актывісты былі папярэджаныя міліцыянтамі аб недапушчальнасьці ўдзелу ў недазволеных масавых мерапрыемствах, а тых, хто выязджаў на запланаваную акцыю, затрымлівалі альбо чынілі розныя перашкоды. «Чарнобыльскі шлях» прайшоў спакойна, колькасьць удзельнікаў у параўнаньні з мінулымі гадамі была меншай.

У красавіку працягнулася далейшае абвастрэньне беларуска-амэрыканскіх стасункаў. Крызіс пачаўся яшчэ ў сакавіку пасьля апублікаваньня на афіцыйным сайце Мінфіну ЗША тлумачэньняў да санкцыяў, якія былі ўведзеныя ў лістападзе 2007 году ў дачыненьні да канцэрну «Белнафтахім». 7 сакавіка з Вашынгтону дзеля кансультацыяў быў адкліканы амбасадар Беларусі ў ЗША, а 12 сакавіка на патрабаваньне беларускага боку з Менску вымушаная была выехаць амбасадарка ЗША Карэн Сцюарт. Затым амэрыканскаму боку было рэкамендавана скараціць колькасьць супрацоўнікаў дыпмісіі, і 27 сакавіка беларускую сталіцу пакінулі 17 амэрыканскіх дыпламатаў, працаваць засталіся 15 супрацоўнікаў, што выклікала часовае спыненьне выдачы візаў грамадзянам. Тым ня менш 30 сакавіка Часовы павераны ЗША ў Беларусі Джонатан Мур атрымаў ад беларускага МЗС сьпіс з 10 амэрыканскіх дыпламатаў, абвешчаных персонамі нон-грата. У адпаведнасьці з Венскай канвенцыяй, пералічаныя ў сьпісе дыпламаты павінныя былі пакінуць нашую краіну на працягу 72 гадзінаў. Як паведаміў Часовы павераны журналістам на прэс-канферэнцыі, дзеяньні афіцыйнага Менску ён лічыць неапраўданымі, неабгрунтаванымі і нелегітымнымі. Разам з тым дыплямат запэўніў, што ЗША па-ранейшаму будзе патрабаваць вызваленьня ўсіх палітвязьняў, бо беларускі ўрад ніякім чынам не вырашае гэтай галоўнай перашкоды ў наладжваньні лепшых стасункаў — наяўнасьці ў Беларусі палітвязьняў.

7 красавіка Рада міністраў па транспарце, тэлекамунікацыях і энергетыцы Еўрасаюзу падоўжыла яшчэ на год дзеяньне санкцыяў у дачыненьні да шэрагу высокапастаўленых беларускіх чыноўнікаў. Як паведамілі ў прэс-службе Рады ЕС, у любы момант санкцыі могуць быць перагледжаныя, а сьпіс — пашыраны ці скарочаны. Зараз у сьпісе 41 высокапастаўленая асоба. «Асновай для перагляду санкцыяў будзе поўнае і безумоўнае вызваленьне ў Беларусі палітзьняволеных, а таксама правядзеньне свабодных, сумленных і дэмакратычных выбараў восеньню гэтага году», — падкрэслівае прэс-служба. Нагадаем, санкцыі прадугледжваюць абмежаваньне на ўезд на тэрыторыю краінаў ЕС шэрагу чыноўнікаў, а таксама замарожваньне іх фінансавых рахункаў.

## Палітычна матываваныя крымінальныя справы

1 красавіка ў судзе Цэнтральнага раёну Менску пачаўся разгляд крымінальнай справы моладзевага актывіста Андрэя Кіма па абвінавачаньні яго ў зьбіцьці міліцыянта падчас правядзеньня акцыі пратэсту прадпрымальнікаў 21 студзеня. На пачатку судовага паседжаньня судзьдзя Алена Ільіна забараніла фота- і відэаздымку, з залы выдалілі траіх журналістаў, якія не паслухаліся. Адвакат Кіма Ала Сідарэнка заявіла хадайніцтва аб зьмяненьні меры стрыманьня падабароннага з утрыманьня пад вартай на вызваленьне пад заклад, аднак яно не было задаволенае. Дзяржаўны абвінаваўца Лук’янаў заявіў хадайніцтва аб злучэньні да судовага разгляду адразу дзьвюх крымінальных справаў, узбуджаных у дачыненьні да Андрэя Кіма, і яно было задаволенае, а судовае паседжаньне адкладзенае.

22 красавіка судзьдзя Цэнтральнага раёну Менску Алена Ільіна вынесла крымінальныя прысуды 10 моладзевым актывістам, абвінавачаным па ч.1 арт. 342 КК РБ — «Арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак» за ўдзел у акцыі пратэсту прадпрымальнікаў 10 студзеня. Уладзімір Сяргееў і Антон Койпіш атрымалі штраф у памеры 100 базавых велічыняў кожны; Аляксей Бондар, Арцём Дубскі, Міхаіл Пашкевіч, Тацяна Цішкевіч,

Алесь Стральцоў, Міхаіл Крываў і Алесь Чарнышоў атрымалі па 2 гады абмежаваньня волі без накіраваньня ў папраўчыя ўстановы адкрытага тыпу. Усе яны застаюцца пад падпіскай аб нявыезьдзе. Андрэй Кім, абвінавачаны адразу па двух артыкулах Крымінальнага Кодэксу, асуджаны да пазбаўленьня волі на паўтара года з адбыцьцём пакараньня ў калоніі агульнага рэжыму.

23 красавіка суд Маскоўскага раёну сталіцы вынес прысуд лідэру віцебскіх прадпрымальнікаў Сяргею Парсюкевічу. Судзьдзя Уладзімір Аўдзеенка прызнаў яго вінаватым ва ўчыненьні крымінальнага злачынства, прадугледжанага арт. 364 КК («Гвалт альбо пагроза ўжываньня гвалту ў адносінах да супрацоўніка міліцыі») і вызначыў меру пакараньня — два з паловай гады калоніі агульнага рэжыму. Таксама С. Парсюкевіч абавязаны выплаціць «пацярпеламу» міліцыянту Дулубу 1 млн 100 тыс. рублёў кампенсацыі за маральныя пакуты. 28-га красавіка асуджаны накіраваў касацыйную скаргу ў Менскі гарадзкі суд.

8 красавіка ў Полацку абвешчаны прысуд па крымінальнай справе ў дачыненьні да моладзевай актывісткі Кацярыны Салаўёвай. Судзьдзя Марозава абвінаваціла яе ў крымінальным злачынстве, прадугледжаным арт. 193.1. Крымінальнага Кодэксу Рэспублікі Беларусь за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі «Малады Фронт». Нягледзячы на пратэст міжнароднай і беларускай грамадзкасьці, якія лічаць дадзены крымінальны арыкул неадпаведным міжнародным прававым нормам і палітычна матываваным, Касю Салаўёву пакаралі штрафам у памеры 50 базавых велічыняў. Падчас суду моладзь зладзіла пікет на знак салідарнасьці з маладафронтаўкай, за што пасьля некалькі актывістаў былі прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасьці.

У канцы красавіка кіраўнік Гомельскай філіі «Маладога Фронту» Андрусь Цянюта атрымаў паведамленьне за подпісам сьледчага гомельскага аддзелу КДБ Д. В. Сідлярова, што адноўленая восеньню крымінальная справа па арт. 193.1 КК РБ канчаткова спыненая. Рашэньне грунтуецца на ч.1 арт. 259 УПК, якое прадугледжвае задавальненьне хадайніцтва падазраванага ў крымінальным злачынстве. Нагадаем, прыкладна ме-

сяц назад А. Цянюта накіраваў скаргу старшыні беларускага КДБ Юрыю Жадобіну з патрабаваньнем спыніць незаконны крымінальны перасьлед ці перадаць справу ў суд. Гэтае хадайніцтва перанакіравалі ў Гомельскую пракуратуру, дзе яно і было задаволена. Акрамя гэтага, Андрусю будзе вернута ўся канфіскаваная маёмасьць.Трэба адзначыць, што абвінавачаныя па гэтай жа крымінальнай справе Кірыл Атаманчык і Арсень Ягорчанка яшчэ знаходзяцца ў стане падазраваных.

## Парушэньні права на свабоду асацыяцыяў

17 красавіка праваабаронцы Алесь Бяляцкі, Валянцін Стэфановіч і Уладзімір Лабковіч зьвярнуліся са скаргай на імя старшыні Вярхоўнага суду Беларусі з просьбай вынесьці пратэст на рашэньне Вярхоўнага суду РБ ад 26 кастрычніка 2007 году аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі Грамадзкага праваабарончага аб'яднаньня «Вясна». Нягледзячы на тое, што пададзеныя ў Міністэрства юстыцыі дакументы цалкам адпавядалі патрабаваньням заканадаўства, Мінюст прыняў рашэньне аб адмове ў рэгістрацыі аб'яднаньня, а Вярхоўны суд стаў на бок Мінюсту і адмовіў у задавальненьні скаргі заснавальнікаў ГПА «Вясна». «Падставы для адмовы ў рэгістрацыі аб'яднаньня, указаныя у рашэньні Вярхоўнага суду Рэспублікі Беларусь, зьяўляюцца недапушчальнымі абмежаваньнямі правоў заснавальнікаў аб'яднаньня на свабоду асацыяцыяў і парушаюць арт. 22 Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах», — адзначана ў скарзе праваабаронцаў.

23 красавіка Міністэрства юстыцыі Беларусі адклала рэгістрацыю праваабарончага грамадзкага аб'яднаньня «Рух «За свабоду». Намесьнік міністра прапанаваў лідэру арганізацыі Аляксандру Мілінкевічу месяц на выпраўленьне дакументаў. Галоўныя прэтэнзіі Мінюсту зводзіліся да таго, што мэты і задачы, заяўленыя ў статутных дакументах, не адпавядаюць платформе Руху «За Свабоду», якая зьмешчана на асабістым сайце А. Мілінкевіча. Да таго ж, выяўленыя нібыта неадпаведнасьці ў графічнай схеме структуры грамадзкага аб'яднаньня, якая падаецца разам з дакументамі. Рашэньне аб адтэрміноўцы было паведамлена са спазьненьнем амаль на два тыдні.

# Парушэньні прынцыпу свободы слова і распаўсюду інфармацыі

1 красавіка ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» паўторна зьвярнулася да генеральнага пракурора Беларусі Рыгора Васілевіча ў сувязі зператрусамі, якія супрацоўнікі КДБ правялі ў кватэрах незалежных журналістаў і шэрагу офісаў 27 і 28 сакавіка. Менская пракуратура лічыць, што ператрусы «былі праведзеныя абгрунтавана і ў адпаведнасьці з законам». У лісьце за подпісам начальніка сьледчага аддзелу пракуратуры Менску Сяргея Іванова паведамляецца, што ператрусы праводзіліся ў межах папярэдняга расьследаваньня крымінальнай справы аб паклёпе на прэзідэнта (ч.1 арт. 367 КК РБ) у дачыненьні да грамадзянаў А. Мініча, П. Марозава і А. Абозава. «Вашыя звароты… разгледжаныя і далучаныя да матэрыялаў крымінальнай справы», — піша сьледчы С. Іваноў. Такім чынам, адказ з пракуратуры зноў разыходзіцца з каментаром, зробленым 27 сакавіка кіраўніком інфармацыйнай службы беларускага МЗС Марыяй Ваньшынай. З яе словаў вынікала, што ператрусы былі зьвязаныя з дзейнасьцю журналістаў неакрэдытаваных замежных СМІ.

15 красавіка судзьдзя Першамайскага раёну сталіцы Ала Яшчанка прызнала журналіста з Барысаву Анатоля Удавічэнку вінаватым у парушэньні ч.1 арт. 23.34 КаАП і пакарала адміністрацыйным арыштам на тэрмін 14 сутак. Ён быў затрыманы напярэдадні супрацоўнікамі міліцыі нібыта за тое, што распаўсюджваў на вуліцы налепкі з заклікам прыняць удзел у акцыі «Чарнобыльскі шлях». Сам журналіст не прызнаў вылучаных супраць яго абвінавачаньняў.

16 красавіка намесьніца рэдактара «Народнай волі» Марына Коктыш накіравала скаргу старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Вадзіму Папову ў зьвязку з адмовай у акрэдытацыі пры гэтай структуры. 25 сакавіка газета зьвярнулася ў ППНС з просьбай акрэдытаваць там карэспандэнтку, але 8 красавіка атрымала адмоўны адказ. Старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных дачыненьнях і СМІ Юры Кулакоўскі прапанаваў рэдакцыі прадставіць іншую кандыдатуру. Аргументацыя: М. Коктыш адмоўлена ў допуску

ў будынак Дому Ураду. Зьвестак пра тое, хто, калі і на якой падставе прыняў такое рашэньне, не падавалася. Журналістка заяўляе, што гэтая адмова незаконная, парушае яе правы, закон «Аб друку і іншых СМІ» і Правілы акрэдытацыі карэспандэнтаў СМІ пры ППНС. У скарзе яна просіць старшыню ППНС даручыць камісіі адмяніць сваё рашэньне, у адваротным выпадку яна будзе вымушаная зьвярнуцца ў суд.

17 красавіка каля 1 200 асобнікаў апошняга нумару недзяржаўнай грамадзка-палітычнай газеты «Товарищ», прызначаных для распаўсюду ў Гомельскай вобласьці, былі затрыманыя супрацоўнікамі Жлобінскага РАУС. Паводле тлумачэньняў міліцыянтаў, выданьне вымаецца для правядзеньня праверкі на прадмет наяўнасьці матэрыялаў «дэструктыўнага характару». Пастанова аб затрыманьні аўтамабілю грунтавалася на адпаведным рапарце з КДБ.

Рэдакцыя недзяржаўнай «Газеты Слонімскай» атрымала дакумент за подпісам старшыні Слонімскага райвыканкаму Мечыслава Касьцюка, у якім сьцьвярджаецца, што зафіксаваныя выпадкі гандлю друкаваным выданьнем у неналежных месцах. У выпадку паўторнага парушэньня мясцовыя ўлады пагражаюць прыпыніць дзеяньне альбо ануляваць ліцэнзію на ажыцьцяўленьне раздробнага гандлю. Галоўны рэдактар газеты Віктар Валадашчук не выключае, што гэткім чынам райвыканкам «рыхтуецца» да размовы з ім наконт падаўжэньня ліцэнзіі на раздробны гандаль, тэрмін якой скончыцца 25 чэрвеня. «Відавочна, улады мэтанакіравана імкнуцца пазбавіцца ад адзінага зарэгістраванага недзяржаўнага выданьня Гродзенскай вобласьці. Магчыма, гэта зьвязана з набліжэньнем парламенцкіх выбараў», — лічыць галоўны рэдактар. Акрамя таго, ён нагадвае, што рэдакцыю змушаюць да 1 чэрвеня вызваліць памяшканьне, якое яна займала на працягу 7 гадоў, бо арэндадаўца — РУП «Слонімскі быткамбінат» — адмаўляецца працягваць з газетай дамову.

# Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў

1 красавіка судзьдзя Чыгуначнага раённага суду Віцебску Раман Дэгода пакараў арыштам на 5 сутак вядомага актывіста і распаўсюдніка незалежнай прэсы Барыса Хамайду. Яго абвінавацілі ў парушэньні ч. 3 арт. 23.34. КаАП РБ за ўдзел у сьвяткаваньні 25 сакавіка 90-годзьдзя ўтварэньня БНР.

2 красавіка прадстаўнікі руху «Джынс за свабоду» паспрабавалі правесьці каля сьценаў расійскага дыпламатычнага прадстаўніцтва ў Менску пікет, прымеркаваны да афіцыйнага сьвята — Дня яднаньня беларускага і расійскага народаў. Яны прынесьлі з сабой бел-чырвона-белы сьцяг і расьцяжку, на якой было напісана: «Расеі — не, Еўропе — так». Ахоўнік выклікаў міліцыянтаў, якія жорстка разагналі пікет. Дзьвюх актывістак — Паліну Кур'яновіч і Паліну Дзякаву схапілі і даставілі ў Цэнтральны РУУС сталіцы, дзе склалі адміністрацыйныя пратаколы па арт. 23.34 КаАП (Парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў). Паліну Кур'яновіч да суду адвезьлі ў Цэнтр ізаляцыі правапарушальнікаў на Акрэсьціна, а Паліну Дзякаву як непаўнагадовую адпусьцілі праз тры гадзіны. 3 красавіка судзьдзя Цэнтральнага раёну сталіцы Тацяна Паўлючук прызнала П. Кур’яновіч вінаватай па арт. 23.34 КаАП РБ у парушэньні парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў і вынесла пакараньне ў выглядзе адміністрацыйнага арышту на тэрмін 10 сутак.

9 красавіка ў Полацку на 35 базавых велічыняў (1 млн 225 тыс. рублёў, каля 570 даляраў) аштрафаваная моладзевая актывістка Маўлюда Атакулава, якая была затрыманая 8 красавіка пасьля суду па крымінальнай справе Касі Салаўёвай, і на 3 базавыя велічыні пакараны Аляксей Янушэўскі. Іх абвінавацілі паводле арт. 23.34 КаАП (Парушэньне парадку арганізацыі альбо правядзеньня масавага мерапрыемства). Ноч дзяўчына правяла ў ізалятары часовага ўтрыманьня.

11 красавіка суд Пухавіцкага раёну пакараў жыхара пасёлку Дружны Сяргея Абразоўскага штрафам у памеры 40 базавых велічыняў (1 млн 400 тыс. рублёў) за арганізацыю несанкцыянаванага мітынгу

супраць будаўніцтва хімзаводу, які стыхійна адбыўся 22 сакавіка. Актывісты ініцыятыўнай групы супраць будаўніцтва заводу каля году вядуць перапіску з усімі зацікаўленымі міністэрствамі і ведамствамі пра мэтазгоднасьць гэтага будаўніцтва, яны шматразова зьвярталіся да мясцовых уладаў па адпаведны дазвол на правядзеньне мітынгу, але яго не атрымалі. Хімзавод плануе будаваць расійская прыватная кампанія «Август-Бел». Прадпрыемства будзе выпускаць некалькі відаў пестыцыдаў. Сьпецыялісты класіфікуюць іх вытворчасьць паводле першага класу небясьпекі. Жыхары пасёлкаў Дружны, Сьвіслач, Рудзенск, Дукора, а таксама іншых паселішчаў ня вераць афіцыйным заявам пра бясьпечнасьць вытворчасьці і дамагаюцца правядзеньня незалежнай тэхналагічнай і экалагічнай экспертызы, а таксама мясцовага рэферэндуму пра мэтазгоднасьць небясьпечнай вытворчасьці ў непасрэднай блізкасьці ад населеных пунктаў.

11 красавіка адміністрацыйная камісія Салігорскага выканкаму пакарала буйнымі штрафамі непаўнагадовых моладзевых актывістаў за ўдзел у Сацыяльным мітынгу 2 сакавіка ў Салігорску і Дні Волі 25 сакавіка ў Менску. За першую акцыю Іван Шыла і Хрысьціна Самойлава атрымалі штрафы ў памеры па 30 базавых велічыняў, Андрусь Тычына — 20 б. в. Нагадаем, бацька лідэраў Салігорскага Маладога Фронту Уладзімір Шыла адбыў 15-суткавы арышт за арганізацыю Сацыяльнага мітынгу. За сьвяткаваньне 90-годзьдзя БНР І. Шыла і Х. Самойлава аштрафаваныя на 20 б. в., Рыгор Астапеня — на 25 б. в., Максім Глухаў атрымаў папярэджаньне. Таксама быў складзены пратакол і на 15-гадовага Ільлю Шылу, на падставе якога бацька Ільлі спадар Уладзімір быў пакараны штрафам у 15 б. в. за «дрэннае выхаваньне сына». Агулам сума штрафаў перавышае 5 млн рублёў. Маладафронтаўцы будуць абскарджваць рашэньне камісіі ў судзе. У мінулы раз суд прызнаў патрабаваньне камісіі завышанымі і скараціў суму штрафу ўдвая.

18 красавіка адміністрацыйная камісія Лідзкай вайсковай часткі № 1234 пакарала старшыню непрызнанага беларускімі ўладамі «Саюзу палякаў у Беларусі» Анжаліку Борыс, журналіста часопіса «Magazyn Polski» Ігара Банцара і кіроўцу Віктара Барыса штрафам у памеры

15 базавых велічыняў кожнага за знаходжаньне ў памежнай зоне без неабходных дакументаў. Яны былі затрыманыя 14 красавіка ў Радуні Воранаўскага раёну разам з васьмю грамадзянамі Польшчы, якія прыехалі ў Беларусь у межах культурнага абмену.

25 красавіка суд Менскага раёну прызнаў актывіста Партыі БНФ Уладзіміра Кішкурну вінаватым у правапарушэньні, прадугледжаным арт. 23.34 КаАП РБ, і пакраў штрафам у памеры 15 базавых велічыняў. Сп. Кішкурна быў затрыманы на ўласнай машыне 21 красавіка ў раёне Калядзічаў. Міліцыянты дагледзелі аўтамабіль і знайшлі ўлёткі, прысьвечаныя традыцыйнай акцыі да ўгодкаў чарнобыльскай трагедыі. У пастарунку ў дачыненьні да партыйнага актывіста склалі адміністрацыйны пратакол, друкаваную прадукцыю канфіскавалі.

У красавіку ў Гомелі адбыліся судовыя працэсы над удзельнікам гістарычнай экскурсіі, прымеркаванай да 90-годзьдзя ўтварэньня БНР. 23 сакавіка каля 20 чалавек з чырвонымі і белымі паветранымі шарамі прайшлі па месцах, зьвязаных з дзейнасьцю міністра БНР Палуты Бадуновай. Міліцыянты здымалі экскурсію на відэа, пасьля чаго на 8 экскурсантаў былі складзеныя адміністрацыйныя пратаколы. Судзьдзя Навабеліцкага райсуду Гомелю Алег Харошка прызнаў іх вінаватымі па арт. 23.34 КаАП «Парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» і вынес наступныя пакараньні: Сьвятаслаў Шапавалаў атрымаў 10 сутак адміністрацыйнага арышту, Аляксандр Процка — 7 сутак, пенсіянер Уладзімір Няпомняшчы — 15 сутак, Марыя Тульжанкова — 7 сутак, Сяргей Трыфанаў — 10 сутак, Іван Адаменка штраф у памеры 20 базавых велічыняў, Зьміцер Кутасаў і журналістка Таццяна Бублікава — штраф па 15 б. в.

## Звальненьні і адлічэньні з вучобы па палітычных матывах

5 красавіка адлічаны з факультэту журналістыкі БДУ «за акадэмічную непасьпяховасьць» моладзевы лідэр Партыі БНФ Франак Вячорка накіраваў у Менскі гарадзкі суд зыскавую заяву да рэк-

тара БДУ Васіля Стражава аб аднаўленьні на вучобе. Былы студэнт дагэтуль не атрымаў адказу на сваю скаргу, датычную дзеяньняў кіраўніцтва БДУ і Міністэрства адукацыі. Апроч таго, 5 красавіка камісія выкладчыкаў на чале з дэканам журфаку Сяргеем Дубовікам адмовілася па выніках «прафесійна-псіхалагічнага сумоўя» даць Ф. Вячорку рэкамендацыю на паступленьне на журфак падчас сёлетняй прыёмнай кампаніі.

17 красавіка пасьля неаднаразовых затрыманьняў і адміністрацыйных пакараньняў, у тым ліку і арыштамі, пад ціскам супрацоўнікаў КДБ кіраўніцтва Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэту прыняло рашэньне хадайнічаць перад рэктарам Шымавым за адлічэньне актывісткі «Маладога Фронту» Маўлюды Атакулавай, студэнткі 3-га курсу факультэту «Вышэйшая школа турызму». Аднак студэнцкі прафсаюз выступіў супраць беспадстаўнага выключэньня, бо дзяўчына амаль ня мае пропускаў і вучыцца добра: яе сярэдні бал перавышае 7,5. Было сабрана больш за 200 подпісаў у падтрымку Маўлюды Атакулавай на 9 факультэтах універсітэту. «Упершыню студэнцкі прафкам выступіў супраць рашэньня рэктарату, — сьцьвярджае адзін з ініцыятараў кампаніі ў абарону грамадзкай актывісткі. — Студэнцкі актыў, які звычайна падтрымлівае ўсе прапановы кіраўніцтва ўніверсітэта, на гэты раз ня толькі не пагадзіўся, але выступіў з афіцыйным пратэстам, які быў накіраваны рэктару Шымаву». У выніку маладафронтаўцы была вынесеная толькі строгая вымова.

17 красавіка судзьдзя Добрушскага раённага суду Вольга Сычова адхіліла зыск настаўніцы Вуцеўскай сярэдняй школы, сябры АГП Клаўдзіі Варанец да аддзелу адукацыі аб аднаўленьні на працы. Вясковую настаўніцу, ліквідатара аварыі на Чарнобыльскай АЭС звольнілі з працы за прагул у той час, калі яна знаходзілася на аздараўленьні за мяжой. Грамадзкі прадстаўнік К. Варанец у судзе ад АГП юрыст Леанід Судаленка лічыць, што дырэкцыя школы і аддзел адукацыі пры звальненьні настаўніцы парушылі ня толькі чарнобыльскі закон, але і нормы Працоўнага кодэксу і нават калектыўную дамову. Таму рашэньне судзьдзі Сычовай выглядае палітычна матываваным. Клаўдзія Варанец мае намер абскардзіць судовую пастанову ў вышэйшай судовай інстанцыі.

У красавіку з гістарычнага факультэту БДУ адлічаны моладзевы актывіст АГП Міхаіл Пашкевіч. Праблемы з вучобай пачаліся, калі ён пачаў браць актыўны ўдзел у палітычным жыцьці краіны. «Справа ў тым, што яшчэ летам мяне выключылі з ВНУ за ўдзел у выбарах у Менскі гарадзкі савет. Я змог узнавіцца на завочным аддзяленьні, на 6-м курсе. Цяпер мне адмовілі залічыць іспыт па метадалогіі гісторыі, які я здаў. Мне ў дэканаце адкрыта сказалі, што рашэньне аб маім выключэньні прымалася нават не на ўзроўні рэктара, а нашмат вышэй», — паведаміў М. Пашкевіч. Як лічыць актывіст, ягонае выключэньне зьвязанае з крымінальнай справай за мітынг прадпрымальнікаў 10 студзеня, удзелам у сьвяткаваньні Дня Волі, а таксама з тым, што ён стаў адным з заяўнікаў і арганізатараў сёлетняга «Чарнобыльскага шляху».

## Парушэньні права на свабоду сумленьня

22 красавіка суд Маскоўскага раёну Менску пакараў сустаршыню аргкамітэту па стварэньні партыі «Беларуская хрысьціянская дэмакратыя» Паўла Севярынца штрафам у памеры 40 базавых велічыняў (1 млн 400 тыс. рублёў) за быццам незаконны збор 50 тыс. подпісаў за ўнясеньне зьменаў у рэлігійнае заканадаўства. Адміністрацыйны пратакол па арт. 9.10 КаАП («Парушэньне заканадаўства аб рэалізацыі права заканадаўчай ініцыятывы грамадзянаў») быў складзены на П. Севярынца 1 красавіка ў пракуратуры, куды яго даставілі супрацоўнікі міліцыі ў цывільным, затрымаўшы пры ўваходзе ў метро. У сваім выступе на судзе Павел Севярынец патлумачыў, чаму ён не зьвяртаўся з подпісамі ў Цэнтрвыбаркам. Ён заявіў, што ЦВК не карыстаецца аўтарытэтам, а вынікі выбараў не прызнаюць у сьвеце. Па словах П. Севярынца, пракуратура падтрымлівае перасьлед вернікаў.

25 красавіка судзьдзя Маскоўскага раёну Менску Уладзімір Аўдзеенка прызнаў пастара Царквы «Новае жыцьцё» Вячаслава Ганчарэнку вінаватым у парушэньні арт. 9.10 КаАП РБ (Парушэньне заканадаўства аб выбарах,…і аб рэалізацыі права заканадаўчай

ініцыятывы грамадзянаў) і пакараў адміністрацыйным штрафам у памеры 40 базавых велічыняў (1 млн 400 тыс. рублёў). Адміністрацыйны пратакол быў складзены пракуратурай за арганізацыю збору подпісаў за ўнясеньне зьменаў у рэлігійнае заканадаўства. Таксама пастар Вячаслаў Ганчарэнка быў аштрафаваны на 10 б. в. (350 тыс. рублёў) за невыкананьне прадпісаньня пракуратуры Маскоўскага раёну сталіцы, якое абавязвала яго дапусціць у будынак царквы дзяржаўных інсьпектараў па энэргаменадзоры.

25 красавіка аналагічнае пакараньне (штраф у памеры 40 базавых велічыняў) вынес Маскоўскі суд юрысту царквы «Новае жыцьцё», каардынатару Кампанііі ў абарону правоў на свабоду сумленьня Сяргею Луканіну. Судовае паседжаньне адбылося ў адсутнасьць абвінавачанага, бо ў гэты час С. Луканін браў удзел у міжнароднай канферэнцыі еўрапейскіх хрысьціянскіх дэмакратычных партыяў у Хельсінкі, дзе выступаў з дакладам пра парушэньні правоў вернікаў у Беларусі.

## Парушэньні права на свободу мірных сходаў

23 красавіка ў судзе Савецкага раёну сталіцы завяршыўся разгляд грамадзянскай справы зыскавога патрабаваньня дзяржпрадпрыемства Менгарвыканкаму «Гаррэмаўтадар» да заяўнікаў «Еўрапейскага маршу». Супольна шасьцёра заяўнікаў — Вінцук Вячорка, Віктар Івашкевіч, Зьміцер Хведарук, Аляксандр Мілінкевіч, Анатоль Лябедзька і Яўген Афнагель павінны сплаціць 2 млн 240 тыс. 770 рублёў за дадатковыя выдаткі, нанесеныя ўдзельнікамі акцыі ў выніку зьмены дазволенага ўладамі маршруту.

25 красавіка Савецкі суд Менску вырашыў спагнаць з заяўнікаў «Еўрапейскага маршу» яшчэ суму агулам больш за тры з паловай млн рублёў, якую запатрабавалі ў якасьці кампенсацыі выдаткаў гарадзкія прадпрыемствы «Менскзелянбуд» і «Рэмаўтадар» Савецкага і Першамайскага раёнаў. Паводле «Менскзелянбуду», дэманстранты

14 кастрычніка мінулага году стыхійна патапталі газон, зламалі ліпу і хмызьнякі. Урон ацэнены ў 1 млн 400 тыс. рублёў. Судзьдзя задаволіла зыск у поўным аб'ёме. Прадпрыемствы «Гаррэмаўтадар» Савецкага і Першамайскага раёнаў запатрабавалі, каб заяўнікі Еўрапейскага маршу заплацілі за панесены ўрон, больш як 2 млн 100 тыс. рублёў, зьвязаныя з прыборкай тэрыторыі пасьля акцыі: нібыта прыцягваліся дадатковыя сілы і тэхніка, давялося зьдзіраць налепкі, выкарыстоўваліся 10 біятуалетаў. Улічылі нават прэміяльныя для прыбіральшчыкаў. Гэты зыск судзьдзя таксама задаволіў у поўным аб'ёме. Такім чынам, агульная сума кампенсацыі дасягнула амаль 5 млн 600 тыс. На пачатку траўня Савецкі суд разгледзіць яшчэ 6 такіх зыскаў ад гарадзкіх арганізацыяў.

25 красавіка актывісты Магілёўскага рэгіянальнага аддзяленьня Беларускага прафсаюзу РЭП праводзілі працоўную сустрэчу, якая скончылася допытам актывістаў Як паведаміла кіраўніца рэгіянальнага аддзяленьня Галіна Лісіцына, пасьля вячэры ў гарадзкой кавярні ўдзельнікі пачалі разыходзіцца, а арганізатараў затрымалі шасьцёра міліцыянтаў на падставе паступіўшага сігналу аб правядзеньні несанкцыянаванага мерапрыемства. Міліцыянты пратрымалі прафсаюзных актывістаў больш за тры гадзіны і склалі пратакол допыту і выняцьця інфармацыйных матэрыялаў. Тлумачэньні, што прафсаюз РЭП — зарэгістраваная арганізацыя, якая мае права зьбірацца і абмяркоўваць надзённыя пытаньні, а дзеяньні супрацоўнікаў міліцыі супрацьзаконныя, не дапамаглі. Кіраўніцтва прафсаюзу зьвярнулася ў Кастрычніцкі РАУС Магілёву са скаргай.

## Дзейнасьць сьпецслужбаў

16 красавіка моладзевую актывістку Хрысьціну Марчук дзьве гадзіны дапытвалі ў Гарадзенскім КДБ. У позьве, якую ёй перадаў дэкан філалагічнага факультэту Гарадзенскага дзяржаўнага ўніверсітэту імя Янкі Купалы, не пазначалася, у якасьці каго выклікаюць студэнтку ў гэтую ўстанову. На пачатку размовы супрацоўнікі КДБ катэгарычна адмовіліся назваць свае прозьвішчы і пасады, на што дзяўчына

адказала, што ня будзе ў такім разе даваць аніякіх афіцыйных тлумачэньняў. Прадстаўнікоў сьпецслужбаў найбольш цікавілі акалічнасьці ранейшага затрыманьня Х. Марчук у Менску ў ліку іншых сяброў незарэгістраванага «Маладога Фронту». У канцы «гутаркі» супрацоўнікі КДБ папярэдзілі яе пра крымінальную адказнасьць за ўдзел у дзейнасьці незарэгістраванай арганізацыі. Падпісваць занатаваны зьмест размовы яна адмовілася.

У сярэдзіне красавіка гарадзенскі актывіст партыі АГП Уладзімір Ларын быў выкліканы ў УКДБ па Гарадзенскай вобласьці. Супрацоўнік сьпецслужбаў Рушніцкі вынес яму папярэджаньне, што ў выпадку далейшага ўдзелу ў дзейнасьці апазіцыі ў дачыненьні да У. Ларына можа быць распачатая крымінальная справа паводле арт. 342 Крымінальнага Кодэксу (Арганізацыя і актыўны ўдзел у дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак). Ён прыгадаў актывісту ягоныя ранейшыя затрыманьні міліцыяй і адміністрацыйныя пакараньні, а таксама ўдзел у адзначэньні Дня Волі ў Менску 25 сакавіка. У Ларына былі ўзятыя пісьмовыя тлумачэньні, пасьля чаго актывіста адпусьцілі.

# Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, травень 2008 году

У траўні ў Беларусі працягнуўся разгляд палітычна матываваных крымінальных справаў, узбуджаных супраць удзельнікаў мірных дэмакратычных акцыяў. Яшчэ тром моладзевым актывістам Міхаілу Субачу, Паўлу Вінаградаву і Максіму Дашуку суд вынес пакараньне ў выглядзе абмежаваньня волі і, такім чынам, колькасьць палітвязьняў павялічылася. Асуджанаму на два з паловай гады пазбаўленьня волі па палітычных матывах Сяргею Парсюкевічу Менскі гарадзкі суд адмовіў у задавальненьні скаргі на вынесены ў мінулым месяцы прысуд. Палітвязьня Андрэя Кіма з СІЗА перавялі ў Бабруйскую папраўчую калонію. 2 траўня была пададзеная касацыйная скарга па справе А. Кіма.

29 траўня ў Менску адбылася прэзентацыя кнігі «Прага вясны: Крымінальныя прысуды, вынесеныя ў 2007 годзе па палітычных матывах», падрыхтаваная з удзелам беларускіх праваабаронцаў. У зборніку зьмешчаны публіцыстычныя артыкулы розных аўтараў, героямі твораў зьяўляюцца Канстанцін Лукашоў, Зьміцер Хведарук, Барыс Гарэцкі, Алег Корбан, Аляксей Янушэўскі, Наста Палажанка, Валер Шчукін, Андрэй Клімаў, Наста Азарка, Іван Шыла, Яраслаў Грышчэня, Зьміцер Дашкевіч, Натальля Ільініч, Артур Фінькевіч. Дата прэзентацыі аказалася сімвалічнай, бо ў гэты дзень у 2007 годзе былі вынесеныя прысуды ў крымінальнай справе супраць пяцёх сяброў «Маладога фронту», якіх абвінавацілі ў дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Назва кнігі «Прага вясны» таксама сімвалічная — адначасова можна казаць пра згадкі таго, што адбылося ў Празе на пачатку 90-х гадоў, і пра тое, што героі зборніку прагнуць вясны ў Беларусі.

У траўні беларускія ўлады не паслаблялі адміністрацыйны ціск на грамадзкіх дзеячоў, адбываліся прэвентыўныя затрыманьні і прыцягненьне палітычных апанентаў да адміністрацыйнай адказнасьці

ў выглядзе арыштаў і штрафаў. 1 траўня каля 30 сяброў грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь» прыйшлі а 12 гадзіне да Нацыянальнай бібліятэкі на сьвяткаваньне афіцыйнымі прафсаюзамі Першамаю. У выніку за тое, што актывісты разгарнулі сьцягі Еўрасаюзу, 6 чалавек былі асуджаныя да адміністрацыйнага арышту. Старшыня аргкамітэту па стварэньні БСДП «Народная Грамада» Мікалай Статкевіч атрымаў 10 сутак арышту за віншаваньне прысутных са сьвятам салідарнасьці працоўных праз мегафон.

15 траўня судом Старых Дарогаў, за ўсталяваньне крыжа ў памяць ахвяраў злачынстваў савецкіх партызанаў у вёсцы Дражна вынесены адміністрацыйны арышт на тэрмін 15 сутак журналісту і выдаўцу Віктару Хурсіку. Аўтара кнігі «Кроў і попел Дражна» Віктара Хурсіка абвінавацілі ў правядзеньні несанкцыянаванага мерапрыемства, раней па гэтай справе 15 сутак адседзеў дэмакратычны актывіст Вячаслаў Сіўчык. Крыж, зроблены па ўзоры крыжа Еўфрасіньні Полацкай, усталяваны грамадзкасьцю 19 красавіка, быў дэмантаваны на загад мясцовых уладаў.

У траўні атрымаў працяг дыпламатычны канфлікт паміж беларускімі ўладамі і ЗША. Усьлед за высылкай амерыканскіх дыпламатаў і пагрозай закрыцьця амбасады ЗША ў Менску па дзяржаўным тэлебачаньні неаднаразова гучалі на адрас амерыканцаў абвінавачаньні ў шпіянажы і фінансаваньні беларускай апазіцыі, а ў бібліятэках Беларусі былі ліквідаваныя «амерыканскія куткі», сфармаваныя з кніг, якія прэзентавала амерыканская амбасада. На адкрыцьцё куткоў і іх амаль штогадовае папаўненьне выдаткавана больш за 400 тыс. даляраў. Меркавалася, што дзякуючы ім грамадзяне Беларусі даведаюцца больш пра ЗША. Акрамя кнігаў, бібліятэкам перадаваліся аўдыё- ды відэаматэрыялы, кампутары і іншая аргтэхніка.

15 траўня Мінфін ЗША апублікаваў новае ўдакладненьне да ўжываньня эканамічных санкцыяў супраць трох прадпрыемстваў кампаніі «Белнафтахім». Падчас анлайн-канферэнцыі 16 траўня на сайце газеты «Комсомольская правда» в Белоруссии» часовы павераны ў справах ЗША Джанатан Мур заявіў: «Сітуацыя, якую мы назіраем у апошні час у Беларусі, беспрэцэдэнтная».

Міжнародная праваабарончая арганізацыя Amnesty International выдала штогадовую справаздачу аб становішчы з правамі чалаве-

ка ў сьвеце за мінулы год (з траўня 2007 па травень 2008 г.). У разьдзеле дакладу, прысьвечанага Беларусі, адзначаецца ціск уладаў на грамадзянскую супольнасьць, юрыдычны перасьлед апазіцыйных актывістаў, а таксама працяг выкананьня сьмяротных пакараньняў. У дакладзе прывоздяцца шматлікія выпадкі крымінальнага перасьледу актывістаў «Маладога Фронту», якія прыцягваліся да адказнасьці за «дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі». Таксама прыгадваецца выпадак з праваабарончай арганізацыяй «Вясна», якая была зьліквідаваная ў 2003 годзе. Летась у ліпені Камітэт ААН па правах чалавека прыняў пастанову, у якой расцаніў ліквідацыю «Вясны» як парушэньне беларускімі ўладамі права на свабоду асацыяцыяў і прапанаваў выправіць сітуацыю, аднак беларускія ўлады праігнаравалі гэтую рэкамендацыю. Сёлетняя справаздача Amnesty International сьцьвярджае, што Беларусь застаецца несвабоднай краінай.

## Палітычна матываваныя крымінальныя справы

2 траўня асуджанага віцебскага прадпрымальніка Сяргея Парсюкевіча перавялі ў сьледчы ізалятар Жодзіна (Смалявіцкі раён), што зьвязана з рамонтам сталічнага СІЗА. На наступны дзень адбылася сустрэча палітвязьня з ягонай адвакаткай Верай Страмкоўскай. Яна адзначыла, што С. Парсюкевіч дрэнна сябе адчувае, яму неабходная аперацыя ў сувязі з паліпозам. Па словах адвакаткі, асуджаны напісаў заяву пра датэрміновы перавод са сьледчага ізалятару ў калонію, бо толькі адтуль яго могуць накіраваць на аперацыю ў рэспубліканскі турэмны шпіталь. 21 траўня Сяргея Парсюкевіча зьмясьцілі ў санчастку Жодзінскай калоніі, у палаце з палітвязьнем апынуліся псіхічна хворыя людзі. Як даведалася жонка асуджанага з атрыманага ліста, С. Парсюкевіч пашкадаваў, што патрапіў у санчастку, бо ніякай рэальнай дапамогі там не атрымлівае.

30 траўня судовая калегія Менскага гарадзкога суду пад старшынствам Камісарава разгледзела касацыйную скаргу С. Парсюкевіча. Довады абароны не былі ўлічаныя, і прысуд палітвязьню пакінуты бяз зьменаў. Па словах адваката, у хуткім часе асуджанага павінны перавесьці ў Шклоўскую калонію.

27 траўня судзьдзя Цэнтральнага раённага суду Менску Валеры Есьман вынес прысуд яшчэ тром абвінавачаным па «справе 14-ці» за ўдзел 10 студзеня ў акцыі пратэсту прадпрымальнікаў. Міхаіл Субач, Павел Вінаградаў і Максім Дашук прызнаныя вінаватымі ва ўчыненьні крымінальнага злачынства па ч.1 арт. 342 КК РБ — «Арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак» і асуджаныя да абмежаваньня волі без накіраваньня ў папраўчыя ўстановы: П. Вінаградаў і М. Субач — на два гады, а непаўнагадовы М. Дашук — на паўтара года. У крымінальнай справе застаецца яшчэ адзін абвінавачаны — Аляксандр Баразенка, які навучаецца ва Уроцлаўскім унівэрсітэце па праграме Кастуся Каліноўскага. Паколькі А. Баразенка не прыехаў у Беларусь, каб азнаёміцца з матэрыяламі справы, ён быў абвешчаны ў вышук.

2 траўня ў рэспубліканскім шпіталі адбылося першае пасьля суду спатканьне палітвязьня Андрэя Кіма з маці. «Спатканне доўжылася прыкладна гадзіну, — распавяла Тацяна Кім. — Выглядае ён бадзёра, увесь час супакойвае мяне, падтрымлівае словамі, каб я моцна не перажывала. У Андрэя пагаршаецца зрок, вочы чырвоныя, запаленьне. Больш нічога сказаць не магу, бо атрымаць нейкую інфармацыю ад дактароў вельмі цяжка. У турэмным шпіталі рэжым яшчэ больш закрыты, чым у СІЗА».

Пасьля выпіскі са шпіталю А. Кім быў пераведзены ў Бабруйскую папраўчую калонію № 2. Пра гэта маці палітвязьня Тацяна Кім даведалася, калі прынесла сыну перадачу ў СІЗА на Валадарскага. Касацыйная скарга па справе асуджанага была пададзена 2 траўня.

## Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў

2 траўня судзьдзя Першамайскага суду сталіцы Юры Гарбатоўскі на падставе арт. 23.34 КаАП («Парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў) вынес пастанову арыштаваць

палітыка Мікалая Статкевіча на 10 сутак адміністрацыйнага арышту. Лідэр аргкамітэту па стварэньні сацыял-дэмакратычнай партыі «Народная грамада» М. Статкевіч быў затрыманы міліцыянтамі 1 траўня каля будынку Нацыянальнай бібліятэкі, дзе праходзіла афіцыйнае сьвяткаваньне Першамаю, ноч да суду ён правёў у ізалятары на Акрэсьціна. Як зазначыў палітык, «суткі» яму далі «за несанкцыянаваны мітынг на санкцыянаваным мітынгу».

Моладзевыя актывісты Зьміцер Дашкевіч, Артур Фінькевіч, Павел Юхневіч і Яўген Афнагель 15 траўня завочна асуджаныя Першамайскім судом Менску на падставе арт. 23.34 КаАП на сем сутак адміністрацыйнага арышту за ўдзел у сьвяткаваньні Першамаю, які ладзіла Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі каля Нацыянальнай бібліятэкі. Пра вынесеныя судом рашэньні яны дазналіся, атрымаўшы копіі пастановаў. Пасьля затрыманьня 1 траўня ў Першамайскім РУУС на іх былі складзеныя адміністрацыйныя пратаколы за тое, што яны прыйшлі на акцыю са сьцягамі Еўрасаюзу, пасьля чаго іх адпусьцілі пад абавязальніцтва зьявіцца ў міліцыі па першым патрабаваньні. Аднак ні разу пасьля гэтага іх ніхто не выклікаў ні ў суд, ні ў РАУС.

3 траўня судзьдзя Крупскага раённага суду Андрэй Сіз на падставе двух адміністрацыйных атыкулаў (арт. 23.4 КаАП — «Непадпарадкаваньне законным патрабаваньням службовай асобы пры выкананьні ёй службовых паўнамоцтваў» і арт. 23.34 КаАП — «Парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў») аштрафаваў вядомага беларускага мастака Алеся Пушкіна на 25 базавых велічыняў. Па меркаваньні міліцыянтаў і судзьдзі, віна мастака палягала ў спробе віншаваньня мясцовых жыхароў з 90-годзьдзем БНР.

22 траўня судзьдзя Пухавіцкага райсуду Сьвятлана Акуліч аштрафавала грамадзкага актывіста Сяргея Абразоўскага на 40 базавых велічыняў (1 млн 400 тыс. рублёў). Ён абвінавачаны ў арганізацыі несанкцыянаванага мітынгу супраць будаўніцтва заводу па вытворчасьці пестыцыдаў у пасёлку Дружным. С. Абразоўскага другі раз караюць штрафам. За стыхійны мітынг, які адбыўся 22 сакавіка, ён ужо быў пакараны судом на такую ж суму. Актывіст лічыць гэта запалохваньнем.

Ён заяўляе, што ня спыніць барацьбы супраць намеру ўладаў пабудаваць хімічны завод у пасёлку Дружны, дзе цяпер жывуць перасяленцы з раёнаў, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

23 траўня гарадзкі аддзел МНС аштрафаваў на 30 базавых велічыняў (1 млн 50 тыс. рублёў) кіраўніка гарадзенскай філіі АГП Юрыя Істоміна нібыта за «парушэньне пажарнай бясьпекі». Насамрэч, прычынай пераследу паслужыў канцэрт польскага гурту «Transkapela», які прайшоў 13 траўня ў партыйным офісе і быў арганізаваны пры падтрымцы Генеральнага консульства Рэспублікі Польшча ў Гародні.

27 траўня судзьдзя Валянціна Кісьмярошкіна Чыгуначнага райсуду Віцебску завочна вынесла пастанову аб адміністрацыйным арышце на тэрмін 10 сутак (па арт. 17.1 КаАП — «Дробнае хуліганства»), а таксама выплаце штрафу ў памеры 20 базавых велічыняў (па арт. 23.4 КаАП — «Непадпарадкаваньне законным патрабаваньням службовай асобы пры выкананьні ёй службовых паўнамоцтваў») юрысту і праваабаронцу Паўлу Левінаву за падзеі падчас ператрусу 27 сакавіка ў кватэры віцебскага журналіста Вадзіма Баршчэўскага.

## Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў

Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь адтэрмінавала рашэньне аб рэгістрацыі грамадзкага аб'яднаньня «Цэнтр падтрымкі чарнобыльскіх ініцыятываў». У адказе напісана, што станоўчае рашэньне ня можа быць прынятае, паколькі пэўныя пункты ў статуце аб'яднаньня ня ў поўнай ступені адпавядаюць патрабаваньням арт. 9 і 10 Закону Рэспублікі Беларусь «Аб грамадзкіх аб'яднаньнях». У сувязі з гэтым міністэрства дае месяц на выпраўленьне ўсіх недахопаў і прапануе потым падаць новую заяву на рэгістрацыю. Кіраўнік аб'яднаньня акадэмік Іван Нікітчанка лічыць, што прычыны нерэгістрацыі палягаюць у палітычнай плоскасьці і зьвязаныя з абаронай правоў.

Наглядная інстанцыя Вярхоўнага суду Рэспублікі Беларусь падтрымала вынесенае 26 кастрычніка 2007 г. рашэньне Вярхоўнага суду аб адмове ў задавальненьні скаргі заснавальнікаў на нерэгістрацыю

Міністэрствам юстыцыі «Грамадзкага праваабарончага аб'яднаньня «Вясна». У адказе за подпісам намесьніка Старшыні Вярхоўнага суду Рэспублікі Беларусь В. Вышкевіча паведамляецца, што наглядная скарга Алеся Бяляцкага, Валянціна Стэфановіча і Уладзіміра Лабковіча на вынесенае судовае рашэньне не падлягае задавальненьню. Вярхоўны суд не пагадзіўся з довадамі заяўнікаў, што не была прадстаўлена адтэрміноўка для выпраўленьня адзначаных недахопаў, паколькі, як сьцвярджаецца ў адказе, «адтэрміноўка дзяржаўнай рэгістрацыі ў адпаведнасьці з арт. 15 Закону «Аб гарамадзкіх аб'яднаньнях» зьяўляецца правам, а не абавязкам рэгіструючага органу».

29 траўня Вярхоўны суд ліквідаваў Гарадзенскую абласную структуру грамадзкай арганізацыі БНФ «Адраджэньне» на падставе адсутнасьці памяшканьня і юрыдычнага адрасу. «Два гады таму мы былі пазбаўленыя памяшканьня, у якім былі зарэгістраваныя Гарадзенская абласная, гарадзкая і дзьве раённыя гарадзенскія арганізацыі. У сувязі з тым, што цяпер кошты за арэнду для грамадзкіх арганізацыяў падняліся ў 10 разоў, мы ня здолелі ў горадзе знайсьці памяшканьня для арэнды,» — патлумачыў кіраўнік абласной арганізацыі БНФ «Адраджэньне» Сяргей Мальчык.

## Катаваньні ды іншыя віды жорсткага, бесчалавечнага абыходжаньня

У траўні атрымала грамадзкі рэзананс сітуацыя, якая склалася ў Багушэўскім абласным шпіталі для хворых на сухоты (Віцебская вобласьць). Нечалавечыя ўмовы знаходжаньня і лячэньня ў медустанове сталі прычынай звароту пацыентаў у незалежныя СМІ. Праваабаронцы з Воршы разам з карэспандэнтам «Народных навінаў Віцебску» наведалі Багушэўскі абласны шпіталь. Хворыя паскардзіліся на парушэньне санітарна-бытавых умоваў, на дрэннае харчаваньне, адсутнасьць радыёкропак, газет і тэлевізараў, магчымасьці наведваць лазьню і карыстацца душам, абмежаваньне ў прагулках.

20 траўня ў сухотнікаў Натальлі і Валерыя Драбышэўскіх, якіх датэрмінова выпісалі са шпіталю на амбулаторны нагляд па прычыне распаўсюду інфармацыі, у Аршанскай раённай пракуратуры

адмовіліся прыняць скаргу на кепскія ўмовы ўтрыманьня ў шпіталі. Супрацоўнікі пракуратуры спаслаліся на тое, што горад Багушэўск знаходзіцца ў іншым раёне, аднак Драбышэўскія лічаць такое рашэньне незаконным, бо самі яны жыхары Воршы. Тады па пошце яны накіравалі скаргі ў пракуратуры Воршы і Сянна, а таксама ў Віцебскі абласны аддзел аховы здароўя.

Нагадаем, што на пачатку гэтага году ў Рэспубліканскім шпіталі для сухотнікаў у пасёлку Наваельня Гарадзенскай вобласьці хворыя галадалі ў знак пратэсту супраць незадавальняючых умоваў абслугоўваньня. 2008 год ў Беларусі афіцыйна абвешчаны Годам здароўя.

29 траўня апоўначы бабруйскі актывіст Алесь Чыгір вяртаўся дахаты разам з сям’ёй на таксоўцы. Кіроўца адмовіўся выканаць патрабаваньне выдаць квіток аплаты паслугаў, узьнік канфлікт, у выніку якога таксіст адвёз Алеся Чыгіра ў аддзяленьне міліцыі № 1 УВД Бабруйскага гарвыканкаму. Само затрыманьне, магчыма, зьвязанае з тым, што на адкрыцьцё Лядовага палацу ў Бабруйск меўся прыехаць прэзідэнт Лукашэнка. Міліцыянты склалі на актывіста адміністрацыйныя пратаколы, абвінавaціўшы яго ў дробным хуліганстве ды непадпарадкаваньні міліцыі, зьбіўшы пры гэтым у пастарунку. «Білі прафесійна: расьцягвалі шыю, падымалі за валасы, рабілі «ластаўку». Я валяўся на падлозе, на мяне ставілі ногі… Гэтым гвалтам кіраваў маёр Тоўсьцік, а дапамагаў яму старшына Пашолкін. Яны казалі, што зараз адсячом табе пальцы», — распавёў Алесь Чыгір. 30 траўня актывіст быў дастаўлены ў суд, аднак судзьдзя Натальля Чарапуха вярнула справу на дапрацоўку з-за істотных неадпаведнасьцяў у сьведчаньнях міліцыянтаў. А. Чыгір адразу пасьля вызваленьня накіраваўся ў судмедэксьпертызу, каб зьняць пабоі. Таксама ён накіраваў скаргу на неправамоцныя дзеяньні супрацоўнікаў міліцыі ў пракуратуру і ў аддзел унутранных расьсьледаваньняў УВД.

# Парушэньні прынцыпу свободы слова і распаўсюду інфармацыі

3 траўня ў Сусьветны дзень свабоды прэсы прадстаўнікі Аб'яднаных дэмакратычных сілаў (АДС) планавалі правесьці ў Менску акцыю салідарнасьці з незалежнымі СМІ краіны. Аднак супрацоўнікі праваахоўных органаў не дазволілі палітычным лідэрам і грамадзкім актывістам раздаць каля Галоўпаштамту недзяржаўныя газеты «Народная воля», «Товарищ» і «Наша Ніва», забароненыя для распаўсюду праз кіёскі «Белсаюздруку» і па падпісцы. У рэспубліканскай пракуратуры адмовіліся прымаць скаргу ўдзельнікаў акцыі на дзеяньні міліцыянтаў, а намесьнік начальніка ГУУС Менгарвыканкаму Уладзімір Станілевіч папярэдзіў, што дзеяньні прадстаўнікоў апазіцыі па распаўсюдзе будуць трактавацца як несанкцыянаванае вулічнае мерапрыемства.

13 траўня ў сталічную пракуратуру быў выкліканы на допыт у якасьці сьведкі каардынатар тэлеканалу «Белсат» у Беларусі, сябра Праўленьня ГА «БАЖ» Эдуард Мельнікаў. Допыт, які вёў сьледчы па асабліва важных справах Віктар Шабан, тычыўся «крымінальнай справы аб мультфільмах», на падставе якой 27 і 28 сакавіка ў кватэрах журналістаў — у тым ліку і Э. Мельнікава — супрацоўнкі КДБ правялі ператрусы. «Мяне запыталі пра маю прыналежнасьць да «Белсату». Я сказаў, што займаюся рэгістрацыяй прадстаўніцтва гэтага тэлеканалу ў Беларусі і раблю гэта тут абсалютна афіцыйна. Да мультфільмаў я дачыненьня ня маю, пра што і паведаміў сьледчаму», — распавёў Э. Мельнікаў.

16 траўня суд Цэнтральнага раёну Менску асудзіў пазаштатнага карэспандэнта незалежнай газеты «Наша Ніва» Яраслава Сьцешыка на 5 сутак адміністрацыйнага арышту на падставе абвінавачаньня ў нецэнзурнай лаянцы ў грамадзкім месцы (арт. 17.1 КаАП — «Дробнае хуліганства»). Журналіст быў затрыманы напярэдадні на месцы правядзеньня вулічнага апытаньня, якое ладзілі ўдзельнікі моладзевага руху «Бунт» каля гандлёвага дому «На Нямізе». Як патлумачыў Я. Сьцешык на судзе, ён толькі фатаграфаваў гэтую акцыю, а супрацоўнікі міліцыі пагражалі яму «непрыемнасьцямі» з-за таго, што ён здымае іх твары.

16 траўня стала вядома, што ў патрэбны тэрмін не прыйшоў да чытачоў чарговы нумар незалежнай газеты «Борисовские новости». Кіраўніцтва друкарні, у якой мусіла друкавацца выданьне, заўважыла невялікі артыкуле пра малодшага сына Аляксандра Лукашэнкі. Матэрыял быў зьняты з паласы. Тады рэдактар дамовіўся аб супрацоўніцтве з іншай друкарняй. Такім чынам, нумар газеты быў надрукаваны са спазьненьнем.

28 траўня МЗС адмовіла ў акрэдытацыі карэспандэнту «Радыё Рацыя» Аляксею Мінчонку на той падставе, што «раней ён займаўся журналісцкай дзейнасьцю на карысьць замежнага СМІ без акрэдытацыі пры МЗС». Журналіст прыняў рашэньне падаць дакументы на акрэдытацыю пасьляператрусаў у офісах незалежных радыёстанцый 27 сакавіка. Гэтую ініцыятыву падтрымала кіраўніцтва «Рацыі», і 28 красавіка журналіст накіраваў у МЗС усе неабходныя паперы. Аднак, як аказалася, гэтага недастаткова, каб мець магчымасьць афіцыйна працаваць на тэрыторыі Беларусі.

## Парушэньні права на свабоду мірных сходаў

21 траўня актывіст Руху «За свабоду» сябра АГП Уладзімір Кацора з Гомелю накіраваў у Камітэт ААН па правах чалавека індывідуальную скаргу, бо на працягу двух апошніх гадоў яго арыштоўвалі за палітычную дзейнасьць пяць разоў. Агулам дэмакратычны актывіст правёў за кратамі амаль сорак сутак, у тым ліку 17 — за парушэньне Закону аб масавых мерапрыемствах. На ўласным прыкладзе У. Кацора паказвае ў скарзе, што міліцыя, а затым суды, караючы за распаўсюд інфармацыі пра мірныя сустрэчы гараджанаў з палітыкам А. Мілінкевічам, парушылі ня толькі Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, але і арт.арт. 19 і 21 Міжнароднага Пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах.

У красавіку Гомельскі гарвыканкам апублікаваў у афіцыйным мясцовым друку рашэньне № 299 пра новы парадак правядзеньня ў горадзе масавых мерапрыемстваў. Паводле рашэньня, цяпер прадстаўнікі палітычных партыяў і грамадзкіх арганізацыяў да замовы на пікет альбо мітынг павінны прыкласьці дамовы з райаддзелам міліцыі на ахову грамадзкага парадку падчас масавага мерапрыемства, з цэнтральнай

гарадзкой паліклінікай — на медычнае абслугоўваньне, з камунальным прадпрыемствам «ГарСАП» (гарадзкое сьпецаўтапрадпрыемства) — на прыбіраньне тэрыторыі. Меркаваньне старшыні Гомельскай гарадзкой арганізацыі рэспубліканскага грамадзкага аб'яднаньня «Прававая ініцыятыва», юрыста Леаніда Судаленкі: «Гэтае рашэньне гарвыканкаму супярэчыць ня толькі Канстытуцыі і закону аб масавых мерапрыемствах, але і міжнародным пагадненьням Беларусі ў галіне правоў чалавека. Такое рашэньне Гомельскага гарвыканкаму — не што іншае, як чарговыя паборы з грамадзянаў. Між тым апошнім часам Гомельскі гарвыканкам забараняў усе пікеты і мітынгі, якія замаўлялі прадстаўнікі палітычных партыяў і грамадзкіх дэмакратычных арганізацыяў, у тым ліку і тыя, якія тычыліся чарнобыльскіх праблемаў і адмены льготаў. Летась дазволы на масавыя акцыі не атрымалі 74 чалавекі. Таму сёлета ў лютым група грамадзянаў абскардзіла забароны гарвыканкаму ў судзе. Але безвынікова. Суд спаслаўся на тое, што выканкам мае права не дазваляць пікеты й мітынгі дзеля захаваньня грамадзкага парадку.

## Дзейнасьць сьпецслужбаў

Загадчык псіханеўралагічнага аддзяленьня Слонімскай цэнтральнай райбальніцы Кандратоўскі атрымаў ліст, падпісаны кіраўніком мясцовага аддзяленьня КДБ Аляксандрам Мазальковым, з загадам праверыць па ўліках псіханеўралагічнага і наркалагічнага дыспансераў галоўнага рэдактара адзінага незалежнага выданьня на Гарадзеншчыне «Газеты Слонімскай» Віктара Валадашчука і яго блізкіх. Акрамя гэтага, ваенны камісар Слонімскага раёну Юрый Труш прапанаваў В. Валадашчуку падпісаць заяву, у якой даць згоду на правядзеньне органамі дзяржаўнай бясьпекі ў адносінах да сябе праверачных мерапрыемстваў і часовае абмежаваньне ў сувязі з гэтым права на недатыкальнасьць асабістага жыцьця. На думку В. Валадашчука, захады супраць яго непасрэдна зьвязаныя з жаданьнем уладаў зьліквідаваць адзінае незалежнае выданьне, якое выходзіць у Гарадзенскай вобласьці — «Газету Слонімскую», бо менавіта ў гэты самы час падаткавая інсьпекцыя мае намер ажыцьцяўляць праверку

дзейнасьці, а мясцовы райвыканкам разглядаць пытаньне аб працягу ліцэнзіі на гандлёвую дзейнасьць.

23 траўня на кватэру да вядомага віцебскага праваабаронцы Леаніда Сьвеціка нечакана ўварваліся тры супрацоўнікі КДБ з загадзя падрыхтаванымі панятымі. Гаспадару кватэры яны прад'явілі пастанову пракуратуры аб узбуджэньні крымінальнай справы па арт. 130.1 Крымінальнага кодэксу РБ (распальваньне міжнацыянальнай і міжканфесійнай варожасьці). Згодна з пастановай Л. Сьвецік зьяўляецца сьведкам па факце пагрозаў да некаторых грамадзянаў з боку мясцовага РНЕ.Ператрус, якім кіраваў дазнавальнік, старэйшы лейтэнант КДБ Д. Садковіч, цягнуўся з 9 раніцы да 18 гадзінаў вечару. Былі забраныя для правядзеньня далейшых сьледчых дзеяньняў кампутар, іншае тэхнічнае абсталяваньне, праваабарончая друкаваная прадукцыя, сярод якой былі каляндарыкі, прысьвечаныя 60-годзьдзю заснаваньня ААН. Пасьляператрусу супрацоўнікі КДБ даставілі Л. Сьвеціка ва ўпраўленьне КДБ па Віцебскай вобласьці. Дазнавальнік Д. Садковіч дапытваў праваабаронцу больш за дзьве гадзіны, допыт здымаўся на відэакамеру. 30 траўня ў КДБ Л. Сьвеціка зноў дапыталі, а таксама былі дапытаныя рэдактар незалежнага бюлетэню «Курьер из Витебска» Уладзімір Базан і грамадзкая актывістка Алена Залеская, з іх узялі падпіску пра неразгалошваньне таямніцы сьледзтва.

# Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, чэрвень 2008 году

Асноўныя падзеі ў Беларусі ў чэрвені — гэта афіцыйнае абвяшчэньне парламенцкіх выбараў і старт выбарчай кампаніі, а таксама экстранае прыняцьце парламентам новага занонапраекту «Аб СМІ», які істотна пагаршае становішча мас-медыя адносна дзеючага заканадаўства. 24 чэрвеня прэзідэнт Беларусі А. Лукашэнка падпісаў Указ № 344 «Аб прызначэньні выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацьвёртага скліканьня». Паводле гэтага дакументу, парламенцкія выбары ў краіне пройдуць 28 верасьня. Напярэдадні беларускія праваабаронцы абвясьцілі пра пачатак правядзеньня маніторынгу парламенцкіх выбараў у Беларусі. На прэс-канферэнцыі, якая прайшла 12 чэрвеня, на пытаньні журналістаў адказвалі старшыня БХК Алег Гулак і віцэ-прэзідэнт Міжнароднай Федэрацыі Правоў Чалавека Алесь Бяляцкі. На прэс-канферэнцыі было адзначана, што існуючае беларускае заканадаўства дазваляе праводзіць дастаткова свабодныя выбары, аднак асноўная праблема — у практыцы яго ўжываньня. Пры наяўнасьці палітычнай волі выбары маглі б быць свабоднымі і справядлівымі. Рэакцыяй уладаў на абвешчаны маніторынг стаў ціск на праваабаронцаў ды членаў іх сем'яў. 12 чэрвеня на дзяржаўным «Першым канале» Беларускага тэлебачаньня быў праанансаваны сюжэт, які ганьбаваў гонар і годнасьць вядомых беларускіх праваабаронцаў, затым паказаны ў нядзельнай «Панараме». Акрамя гэтага, на фоне дыскрэдытацыі праваабарончай дзейнасьці дзяржаўнымі СМІ улады ажыцьцяўляюць дэталёвую праверку падаткавай гісторыі праваабаронцаў. Загады Міністэрства па падатках і зборах пра неабходнасьць падаць дэкларацыі аб прыбытках і маёмасьці атрымалі старшыня БХК А. Гулак, экс-старшыня арганізацыі Тацяна Працька, віцэ-прэзідэнт FIDH А. Бяляцкі і чле-

ны ягонай сям'і, сябра БХК Зьміцер Маркушэўскі, праваабаронца Валянцін Стэфановіч, а таксама члены іх сем'яў.

Нягледзячы на афіцыйныя заявы кіраўніцтва краіны, у тым ліку А. Лукашэнкі, наконт празрыстасьці і дэмакратычнасьці правядзеньня выбараў, праваабаронцы ўжо зараз канстатуюць шматлікія факты парушэньняў у гэтай сьферы, сярод якіх канфіскацыя друкаванай прадукцыі, затрыманьні, суды і арышты. На працягу чэрвеня вялікая колькасьць актывістаў была прыцягнутая да адміністрацыйнай адказнасьці, у асноўным — за ўдзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах. Аказваецца ціск на моладзевых актывістаў з боку КДБ і праз ваенныя камісарыяты.

Пасьпешнае прыняцьце беларускім парламентам новага Закону «Аб сродках масавай інфармацыі» мела вялікі розгалас як у беларускай, так і ў міжнароднай супольнасьці. Законапраект рыхтаваўся на працягу 5 гадоў з падачы Адміністрацыі прэзідэнта ў закрытым рэжыме. Незалежнае NGO «Беларуская асацыяцыя журналістаў» неаднаразова зьвярталася з просьбай даць магчымасьць экспертам асацыяцыі прысутнічаць на паседжаньні працоўнай групы і пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў, аднак гэтыя просьбы былі праігнараваныя. Законапраект быў унесены ў парадак дня сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу 10 чэрвеня ў экстраным парадку, была прызначаная дата ягонага разгляду — 17 чэрвеня. Юрысты БАЖ у выніку аналізу дакументу прыйшлі да высновы, што ў выпадку прыняцьця законапраекту па незалежных сродках масавай інфармацыі будзе нанесены сур'ёзны ўдар, што паставіць іх на мяжу выжываньня і можа прывесьці да поўнага зьнішчэньня незалежных СМІ ў краіне. Законапраект «Аб СМІ» быў прыняты ў першым чытаньні фактычна аднагалосна: «за» прагаласавалі 93 дэпутаты, супраць — толькі 1. 27 чэрвеня, напярэдадні прыняцьця законапраекту «Аб СМІ» Палатай прадстаўнікоў у другім чытаньні, міжнародная супольнасьць, у тым ліку прадстаўнік па свабодзе СМІ Арганізацыі па бясьпецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (АБСЕ) Міклаш Харашці заклікалі беларускія ўлады не зацьвярджаць гэты законапраект, бо, на іх думку, ён пагоршыць і без таго неапраўдана жорсткі рэжым рэгуляваньня працы СМІ ў Беларусі. Адразу некалькі

ўплывовых міжнародных арганізацыяў, сярод якіх Міжнародная федэрацыя журналістаў, накіравалі лісты А. Лукашэнку і ў Савет Рэспублікі з прапановай аказаць дапамогу ў дапрацоўцы гэтага дакументу, каб прывесьці яго ў адпаведнасьць з міжнароднымі стандартамі і патрабаваньнямі міжнароднага права ў галіне правоў чалавека. Законапраект прадугледжвае шэраг новаўвядзеньняў. Адказнасьць СМІ цяпер будзе наступаць у выніку «распаўсюду недакладнай інфармацыі, што можа нанесьці шкоду дзяржаўным або грамадзкім інтарэсам». Рашэньне пра закрыцьцё выданьня можа прыняць пракурор любога ўзроўню. Сур’ёзна можа пацярпець незалежная інфармацыйная інтэрнэт-прастора. Нягледзячы на пратэсты, 28 чэрвеня Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі на заключным паседжаньні 10-й сесіі ўхваліў законапраект «Аб сродках масавай інфармацыі».

17 чэрвеня дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу РБ прынялі ў другім чытаньні зьмены і дадаткі ў законы Рэспублікі Беларусь па пытаньнях супрацьдзеяньня экстрэмізму. Апазіцыйныя палітыкі ўпэўненыя, што зьмены сур’ёзна звузяць магчымасьці палітычных партыяў у перыяд правядзеньня выбарчых кампаніяў. «Новаўвядзеньні ў законы значаць толькі тое, што будзе ўзмоцнены ціск на апанентаў улады, — упэўнены лідэр Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька.

## Палітычна матываваныя крымінальныя справы

Абаронца палітвязьня Аляксандра Казуліна накіраваў скаргу на імя Генеральнага пракурора Рыгора Васілевіча, які некалькі месяцаў таму быў прызначаны на гэту пасаду. Адвакат Зьміцер Гарачка мяркуе, што трэба выкарыстоўваць ўсе магчымасьці для адмены прысуду былому кандыдату ў прэзідэнты А. Казуліну, які правёў за кратамі ўжо больш за два гады.

У Віцебскім КДБ працягваюцца допыты грамадзка-палітычных актывістаў у межах узбуджанай крымінальнай справы па факце рассылкі лістоў з пагрозамі ад імя прафашыстоўскай арганізацыі РНЕ

(«Русского Национального Единства»). 16 чэрвеня на допыт у якасьці сьведкі быў выкліканы сябра Кансерватыўна Хрысьціянскай Партыі БНФ Сяргей Каваленка. Нагадаем, што 23 траўня па гэтай справе ў кватэры віцебскага праваабаронцы Леаніда Сьвеціка супрацоўнікі КДБ амаль 9 гадзінаў праводзіліператрус, у выніку якога была канфіскаваная ўся аргтэхніка і друкаваныя выданьні. Л. Сьвецік кансультаваў тых, хто атрымаў допісы ад імя «РНЕ», — дапамагаў ім складаць заявы ў пракуратуру.

Менская пракуратура чарговы раз прыпыніла крымінальную справу, распачатую ў 2005 годзе за паклёп на А. Лукашэнку. Падставай паслужылі мультфільмы палітычнага зьместу, разьмешчаныя на сайце незарэгістраванай арганізацыі «Трэці шлях». У межах гэтай справы ў сакавіку на офісах і кватэрах незалежных журналістаў, якія працавалі на замежныя радыёстанцыі без акрэдытацыі, супрацоўнікі КДБ правяліператрусы, у выніку якіх забралі кампутары і аргтэхніку, патлумачыўшы, што яе правераць на датычнасьць да распаўсюду мультфільмаў. 12 чэрвеня пракуратура паведаміла, што маёмасьць журналістам будзе вернутая.

28 чэрвеня пасьля паседжаньня палітрады Аб’яднанай грамадзянскай партыі супрацоўнікамі міліцыі быў прэвентыўна затрыманы асуджаны раней да абмежаваньня волі па так званым «Працэсе 14-ці» Міхась Пашкевіч, які на паседжаньні быў дэлегаваны партыяй назіральнікам у Цэнтральную выбарчую камісію. 30 чэрвеня судзьдзя Кастрычніцкага райсуду Менску Рыта Шаграй, разгледзеўшы адміністрацыйную справу, заведзеную на маладзевага актывіста па арт. 17.1 КаАП (дробнае хуліганства), вынесла яму арышт на тэрмін 7 сутак і штраф за непавагу да суду ў памеры 10 базавых велічыняў (350 тыс. рублёў).

## Парушэньні права на свабоду асацыяцыяў

19 чэрвеня Міністэрства юстыцыі ў чарговы раз адмовіла «Праваабарончa-асветніцкаму грамадзкаму аб’яднаньню «Рух «За Сва-

боду» ў рэгістрацыі. Падставай для адмовы палічана неадпаведнасьць заяўленых мэтаў і дзейнасьці тым, якія нібыта будуць у рэальнасьці. Як лічыць Мінюст, які не мае прэтэнзіяў да мэтаў, пазначаных у статуце, рэальныя мэты «Руху «За свабоду» не адпавядаюць патрабаваньням заканадаўства Рэспублікі Беларусь, што ў адпаведнасьці з артыкулам 15 Закону РБ «Пра грамадзкія аб'яднаньні» зьяўляецца падставай для адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі.

У чэрвені аргкамітэт па стварэньні Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі атрымаў ліст ад Міністэрства юстыцыі, дзе грамадзкаму аб'яднаньню таксама ўжо ў другі раз адмаўляецца ў рэгістрацыі. Прычынай пазначана тое, што дзяржаўнаму ведамству так і засталіся незразумелымі «мэты, задачы, прадмет і метады дзейнасьці арганізацыі».

## Парушэньні прынцыпу свободы слова і распаўсюду інфармацыі

16 чэрвеня рэдакцыя газеты «Народная Воля» і намесьніца галоўнага рэдактара Марына Коктыш, якія спрабавалі прыцягнуць да судовай адказнасьці Службу бясьпекі прэзідэнта і Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу за адмову акрэдытаваць там журналістку атрымалі з суду Маскоўскага раёну афіцыйныя адказы на свае скаргі. Судзьдзя В. А. Гусакова адмовіла ім у гэтым праве.

18 чэрвеня газета «Витебский курьер» атрымала папярэджаньне адразу па двух артыкулах закону «Аб друку і іншых СМІ». Міністэрства сьцьвярджае, што газета ўказала ў выходных дадзеных несапраўдны адрас рэдакцыі (арт. 26), а таксама не паведаміла Мінінфарму ў належны тэрмін пра зьмену адрасу для ўнясеньня зьменаў у пасьведчаньне аб рэгістрацыі (арт. 11).

20 чэрвеня ў Навабеліцкім раёне Гомелю міліцыя затрымала грамадзкага актывіста гісторыка Сьвятаслава Шапавалава, які раздаваў гараджанам улёткі з тлумачэньнем пазіцыі Аб'яднаных Дэмакратыч-

ных Сілаў рэгіёну да будучых парламенцкіх выбараў. У пастарунку ў С. Шапавалава канфіскавалі 675 улётак і склалі адміністрацыйны пратакол па арт. 22.9 КаАП за «распаўсюд перыядычных друкаваных выданьняў без выходных зьвестак». Аднак улёткі не зьяўляюцца перыядычным друкаваным выданьнем, таму падобныя дзеяньні міліцыянтаў супярэчаць існуючаму заканадаўству.

20 чэрвеня ў Гародні супрацоўнікі міліцыі затрымалі актывіста Беларускага прафсаюзу работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці Уладзіміра Таболу, які распаўсюджваў газеты «Гродзенская салідарнасць» і «Свабода» каля прахадной заводу аўтамабільных агрэгатаў, і даставілі ў пастарунак, дзе склалі пратакол аб выняцьці газетаў. Ад дачы тлумачэньня У. Табола адмовіўся, бо лічыць, што распаўсюд інфармацыі яму гарантаваны Канстытуцыяй, а заканадаўства ён не парушаў. Канфіскаваныя газеты, па словах міліцыянтаў, мусяць прайсьці экспертызу ва ўпраўленьні ідэалогіі Гарадзенскага аблвыканкаму, пасьля чаго будзе прынятае рашэньне ў адносінах да У. Таболы.

## Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў

12 чэрвеня актывіст дэмакратычнага руху Аляксандр Атрошчанка быў выкліканы ў КДБ дзеля тлумачэньняў наконт яго скаргі на супрацоўнікаў гэтай установы, якія летась забралі ў яго з кватэры кампутар і аргтэхніку. Праз некалькі хвілінаў ён патэлефанаваў жонцы і паведаміў, што яго затрымліваюць, тэлефон адключыўся. Амаль увесь дзень сваякі і знаёмыя спрабавалі высьветліць месцазнаходжаньне актывіста. Між тым на закрытым судовым паседжаньні ў судзе Цэнтральнага раёну Менску А. Атрошчанка быў пакараны адміністрацыйным арыштам на тэрмін 15 сутак за абразу судзьдзі Алены Ільіной (арт. 24.1 КаАП) падчас разгляду крымінальнага «Працэсу 14-ці».

27 чэрвеня судзьдзя Маскоўскага райсуду Менску Харкевіч прызнаў сябра БХК з Маладэчна, аднаго з удзельнікаў правядзеньня маніторынгу выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу

Рэспублікі Беларусь Эдуарда Баланчука вінаватым у парушэньні адразу двух артыкулаў адміністрацыйнага кодэксу: арт. 23.4 КаАП — «Непадпарадкаваньне законнаму патрабаваньню службовай асобы пры выкананьні ёю службовых паўнамоцтваў» і арт.17.1 КаАП — «Дробнае хуліганства». Суд прыняў да ўвагі толькі паказаньні міліцыянтаў, якія затрымлівалі праваабаронцу каля сталічнага офісу БХК, і праігнараваў паказаньні сьведкаў з боку абвінавачанага. У выніку Э. Баланчук пакараны 10 суткамі арышту і грашовым штрафам у памеры 30 базавых велічыняў (1 млн 50 тыс. рублёў). Па меркаваньні праваабаронцаў, улады распачалі мэтавыя рэпрэсіі супраць тых, хто адкрыта заявіў пра намер праводзіць маніторынг парламенцкіх выбараў.

27 чэрвеня ў цэнтры Менску быў прэвентыўна затрыманы актывіст грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь» Яўген Афнагель. Супрацоўнікі міліцыі абвінавацілі яго ў нецэнзурнай лаянцы і склалі пратакол па арт. 17.1 КаАП — «Дробнае хуліганства». На наступны дзень суд Цэнтральнага раёну Менску прызнаў актывіста вінаватым і пакараў 10-суткавым арыштам. Раней Я. Афнагель быў завочна асуджаны на 7 сутак арышту за ўдзел у першамайскай дэманстрацыі, якую ладзілі афіцыйныя прафсаюзы каля Нацыянальнай бібліятэкі ў Менску. Такім чынам, актывіст мусіць правесьці ў зьняволеньні 17 сутак.

## Звальненьні і адлічэньні з вучобы па палітычных матывах

12 чэрвеня суд адмовіў у аднаўленьні на працы старшыні раённай суполкі Партыі БНФ з Гарадку Леаніду Аўтухову, які быў звольнены па сканчэньні кантракту. На працягу двух дзён судовага працэсу Л. Аўтухоў спрабаваў давесьці, што працэдура ягонага звальненьня адбывалася з парушэньнямі працоўнага заканадаўства, бо пра тое, што кантракт ня будзе працягнуты, яму паведамілі менш як за месяц. Старшыня райсуду Аляксандр Ляшкевіч не задаволіў патрабаваньняў Л. Аўтухова наконт аднаўленьня на працы, выплаты сярэдняга заробку падчас вымушанага беспрацоўя і кампенсацыі маральнае шкоды.

26 чэрвеня ў судзе Маскоўскага раёну Менску адбыўся разгляд судовай скаргі старшыні культурніцкай камісіі Партыі БНФ Франака Вячоркі на Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, які ў лютым гэтага году адлічыў студэнта з трэцяга курсу факультэту журналістыкі БДУ. Судзьдзя Вольга Гусакова палічыла, што працэдурныя нормы адлічэньня не парушаныя, да таго ж Ф. Вячорка прапусьціў тэрміны.

27 чэрвеня студэнту першага курсу філалагічнага факультэту гарадзенскага ўніверсітэту Сяргею Еніну паведамілі з дэканату, што падрыхтаваны загад аб яго выключэньні з фармулёўкай «акадэмічная непасьпяховасьць». Сапраўднай прычынай адлічэньня студэнт лічыць сваю актыўную грамадзянскую пазіцыю, бо С. Енін — аўтар некалькіх працаў па гісторыі і эканоміцы, у якіх ён выступіў з крытыкай дзеяньняў беларускіх уладаў. Студэнт таксама накіраваў ліст на гарачую лінію рэктарату, у якім раскрытыкаваў палітыку ўнівэрсітэту ў дачыненьні да міжнародных абменаў.

Актывістку Хрысьціянскай дэмакратыі Ганну Антонаву адлічылі з 1 курсу факультэту беларускай філалогіі і культуры менскага педагагічнага ўніверсітэту за тое, што студэнтка ад свайго імя напісала заяву на правядзеньне пікету ў падтрымку палітзьняволенага Аляксандра Казуліна. У дэканаце Г. Антонавай заявілі, што яна «вучыцца ў дзяржаўнай навучальнай установе і абавязана падтрымліваць палітыку нашай дзяржавы і нашага прэзідэнта».

## Парушэньні права на свабоду сумленьня

17 чэрвеня судзьдзя Старадарожскага суду Сяргей Епіхаў прызнаў сьвятара Леаніда Акаловіча вінаватым у парушэньні арт. 23.34 КаАП і прысудзіў яму штраф у памеры 30 базавых велічыняў (1 млн 50 тыс. рублёў). Правапарушэньне сьвятара Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы айца Л. Акаловіча палягала ў асьвячэньні шасьціканцовага крыжа, які быў усталяваны прадстаўнікамі грамадзкасьці ў вёсцы Дражна ў памяць пра мірных жыхароў, забітых савецкімі партызанамі ў 1943 годзе. Праз некалькі дзён мясцовыя ўлады

дэмантавалі крыж, а за ўдзел у жалобнай акцыі памяці па 15 сутак арышту адседзелі актывіст апазіцыі Вячаслаў Сіўчык і пісьменьнік, аўтар кнігі пра трагедыю вёскі Дражна Віктар Хурсік.

## Парушэньні права на свободу мірных сходаў

4 чэрвеня судзьдзя суду Менскага раёну Вячаслаў Тулейка на 10 сутак адміністрацыйнага арышту асудзіў старшыню секцыі «Мемарыял» Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Вячаслава Сіўчыка на падставе арт. 23.34 КаАП за ўдзел у несанкцыянаваным мерапрыемстве — падвядзеньні вынікаў фотаконкурсу беларускай службы «Радыё Свабода» («Маё фота — мае Курапаты»), якое прайшло ва ўрочышчы 3 чэрвеня.

5 чэрвеня судзьдзя Ленінскага райсуду Гародні Натальля Козел прызнала гарадзенскага праваабаронцу Віктара Сазонава і старшыню абласной арганізацыі АГП Юрыя Істоміна вінаватымі ў парушэньні арт. 23.34 КаАП («Парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў») і асудзіла да выплаты буйных штрафаў: па 30 базавых велічыняў (1 млн 50 тыс. рублёў) кожнаму. Правапарушэньне заключалася ў тым, што на шматлюдным канцэрце знакамітага польскага гурта Lombard, які адбыўся ў Гродне 2 траўня, з даху адміністрацыйнага будынку яны шэсьць хвілінаў махалі бел-чырвона-белым сьцягам. 9 чэрвеня за арганізацыю гэтага канцэрту на 40 базавых велічыняў была аштрафаваная старшыня апазіцыйнага «Саюзу палякаў на Беларусі» Анжаліка Борыс.

11 чэрвеня ў Полацку супрацоўнікі міліцыі затрымалі і даставілі ў мясцовы РАУС пяцёх актывістаў Маладога Фронту: Кацярыну Салаўёву, Алеся Круткіна, Мікалая Дземідзенку, Сержука Каралёнка, Алеся Хаберава. Маладафронтаўцы разгарнулі расьцяжку «STOP-ДЫКТАТУРА» насупраць Полацкага выканкаму. Аднаму з актывістаў Алесю Хабераву стала кепска і яго забрала «хуткая дапамога». 12 чэрвеня судзьдзя Н. В. Дзеравенка на падставе складзеных па ч. 3 арт. 23.34 КаАП пратаколаў пакарала затрыманых актывістаў штрафам у

памеры 30 базавых велічыняў (1 млн 50 тыс. рублёў) кожнага за ўдзел у несанкцыянаваным пікетаваньні.

17 чэрвеня судзьдзя Слонімскага раённага суду Аляксандр Шылін прызнаў дэмакратычнага актывіста Алеся Масюка вінаватым у парушэньні арт. 23.34 КаАП за арганізацыю сустрэчы жыхароў з Аляксандрам Мілінкевічам і пакараў яго штрафам у памеры 20 базавых велічыняў (700 тыс. рублёў). Пры гэтым судзьдзя не зьвярнуў увагу на той факт, што адміністрацыйны пратакол на актывіста быў складзены толькі праз месяц пасьля напісаньня міліцэйскага рапарту, хаця па заканадаўстве прадугледжаны тэрмін ня больш як 10 дзён. Хадайніцтвы А. Масюка аб прыцягненьні дадатковых сьведкаў і адвод судзьдзі былі адхіленыя.

20 чэрвеня суд Пухавіцкага раёну прызнаў жыхара пасёлку Дружны Сяргея Салдаценку вінаватым па арт. 23.34 КаАП — «Парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» і пастанавіў спагнаць з яго штраф у памеры 15 базавых велічыняў (525 тыс. рублёў). 28 чэрвеня судзьдзя Пухавіцкага раённага суду Анжаліка Данілава аштрафавала інваліда з Рудзенску Міхаіла Калінкевіча на 10 базавых велічынь (350 тыс. рублёў) за ўдзел 16 траўня ў несанкцыянаваным мітынгу супраць будаўніцтва хімзаводу расійскай прыватнай кампаніяй «Август-Бел». Раней за ўдзел у мітынгу пратэсту суд Пухавіцкага раёну ўжо двойчы караў буйнымі штрафамі актывіста ініцыятыўнай групы супраць будаўніцтва хімзаводу Сяргея Абразоўскага, а таксама дзьвюх настаўніц з Дружнага — Насту і Таццяну Дыльковых. Папярэджаньне пракуратуры атрымала яшчэ адна ўдзельніца, Тацяна Рысявец.

## Дзейнасьць сьпецслужбаў

КДБ працягвае запалохваць студэнтаў. Як распавёў моладзевы актывіст Алесь Галавач, у кабінеце дэканату супрацоўнік КДБ прымушаў яго да супрацоўніцтва, у выпадку адмовы пагражаў адлічэньнем з Беларускага ўніверсітэту культуры, дзе Алесь навуча-

ецца на пятым курсе факультэту традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва.

## Перасьлед грамадзка-палітычных актывістаў і праваабаронцаў

Як у былыя савецкія часы, беларускія ўлады актыўна спрабуюць выкарыстаць абавязковую вайсковую службу як карны інструмент супраць моладзевых дэмакратычных актывістаў. Беларускіх студэнтаў, якія вучацца ў замежных навучальных установах, здымаюць на мяжы і паведамляюць, што ім забаронены выезд за межы Беларусі. Прозьвішчы ўнесеныя ў так званыя «чорныя сьпісы» ваеннымі камісарыятамі, якія спрабуюць такім чынам забраць іх у войска. Моладзевага актывіста Партыі БНФ Франака Вячорку памежнікі не прапусьцілі праз беларуска-літоўскую мяжу на памежным пераходзе Каменны Лог, аднак прычыну не патлумачылі. Між тым Ф. Вячорка прайшоў раённую медкамісію, згодна з якой мае адтэрміноўку ад прызыву ў войска на паўгода, бо перанёс аперацыю на вочы. Студэнта-каліноўца Зьмітра Буянава, які навучаецца ў Гданьскім унівэрсітэце, памежнікі вывелі з цягніка, калі той перасек мяжу з польскага боку і паведамілі, што назад яго ня пусьцяць, бо ён таксама трапіў у «чорны сьпіс». Старшыню Моладзі БНФ Алеся Каліту таксама спрабуюць забраць у войска, нягледзячы на тое, што раённая камісія прызнала яго непрыдатным да службы. У ваенкамаце актывісту далі новае накіраваньне на медкамісію, і зараз А.Каліта праходзіць рэспубліканскую медычную камісію.

# Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, ліпень-жнівень 2008 году

У канцы чэрвеня ў Беларусі стартавала парламенцкая выбарчая кампанія, і летнія месяцы ліпень і жнівень адзначаныя шматлікімі парушэньнямі ў гэтай сьферы. Прадстаўнікоў дэмакратычных сілаў не ўключалі ва ўчастковыя і акруговыя выбарчыя камісіі, аказваўся ціск на сяброў ініцыятыўных групаў вылучэнцаў ад Аб'яднаных Дэмакратычных Сілаў, рабіліся правакацыі супраць грамадзкіх актывістаў, выносіліся адміністрацыйныя пакараньні.

Найбольш актыўна перасьлед апазіцыйных дзеячоў праходзіў у межах расьсьледаваньня выбуху самаробнага выбуховага прыстасаваньня, учыненага ўначы з 3 на 4 ліпеня ў цэнтры сталіцы падчас урачыстага сьвяткаваньня Дня вызваленьня Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якому зараз нададзены статус Дня Незалежнасьці. Як паведаміла Міністэрства аховы здароўя, у выніку выбуху каля стэлы «Менск — горад-герой» па медычную дапамогу зьвярнуліся 54 асобы, 47 з іх былі шпіталізаваныя, у тым ліку двое дзяцей. Па факце здарэньня была ўзбуджаная крымінальная справа паводле ч. 3 арт. 339 КК РБ як асабліва злоснае хуліганства. Да сьледзтва спрычыніліся адразу некалькі дзяржведамстваў: МУС, КДБ і пракуратура. Былі праведзеныя шматлікіяператрусы, допыты, арышты дэмакратычных актывістаў і шараговых сяброў дэмакратычных партыяў і грамадзкіх ініцыятываў, сярод якіх аказаліся чатыры былыя сябры незарэгістраванай арганізацыі «Белы легіён», якая ўжо спыніла дзейнасьць: Віктар Ляшчынскі, Ігар Корсак, Міраслаў Лазоўскі і Сяргей Чыслаў. Таксама ў ізалятар былі зьмешчаныя намесьнік старшыні Моладзі БНФ і праваабаронца Ільля Богдан, сябра Партыі БНФ Антон Койпіш, старшыня аргкамітэту па стварэньні Беларускай Партыі Свабоды Сяргей Высоцкі, сябра АГП Аляксандр Сяргеенка і актывіст кампаніі «Еўрапейская Беларусь»

Павел Кур’яновіч. Падчас допытаў альбо так званых гутарак, сьледчыя распытвалі ня толькі пра выбух, але таксама пра апазіцыйныя арганізацыі ды іхнюю дзейнасьць. Прадстаўнікі апазіцыі заклікалі да незалежнага грамадзкага расьсьледаваньня абставінаў крымінальнага злачынства і засьцераглі ўлады ад выкарыстаньня выбуху як нагоды для новай хвалі барацьбы з палітычнымі апанентамі. Тым ня менш вялікая колькасьць палітычных дзеячоў і грамадзкіх актывістаў не пазьбеглі ўвагі да сябе з боку КДБ і міліцыі: допыты, ператрусы, узяцьце адбіткаў пальцаў, далоняў, сьліны на аналіз — усё гэта ў дачыненьні да некаторых грамадзкіх актывістаў праводзілася нават не адзін раз. Напрыклад, у прэтэндэнта ў кандыдаты па Паўднёва-Заходняй акрузе № 99 Юрася Карэтнікава 10 разоў здымалі адбіткі пальцаў і двойчы бралі сьліну.

Таксама ў гэтыя месяцы набрала моц кампанія па праверцы даходаў і маёмасьці вядомых апазіцыйных дзеячоў, а таксама тых, хто заявіў аб сваім намеры прымаць удзел у парламенцкіх выбарах альбо ажыцьцяўляць маніторынг выбарчай кампаніі.

У жніўні самай доўгачаканай і галоўнай падзеяй стала вызваленьне сьпецыяльнымі ўказамі, падпісанымі А. Лукашэнкам, аб памілаваньні трох апошніх палітвязьняў, якія знаходзіліся за кратамі, — былога кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Казуліна (16 жніўня), прадпрымальніка Сяргея Парсюкевіча і моладзевага актывіста Андрэя Кіма (абодва 20 жніўня). Уся міжнародная супольнасьць вітала іх вызваленьне. Камісар па зьнешніх сувязях і палітыцы добрасуседзтва Еўрасаюзу Беніта Ферэра-Вальднэр назвала гэты крок «знакам, які абнадзейвае». Намесьнік памочніка сакратара Дзяржддэпартаменту ЗША па пытаньнях Еўропы і Азіі Дэвід Меркель, які наведаў Беларусь, правёў шэраг сустрэчаў з прадстаўнікамі ўладаў дзеля абмеркаваньня далейшых крокаў па нармалізацыі беларуска-амерыканскіх адносінаў. Ён заявіў, што лічыць магчымай адмену санкцыяў ЗША ў дачыненьні да Беларусі. Па словах спадара Д. Меркеля, ЗША ухваляюць вызваленьне палітвязьняў і чакаюць правядзеньня дэмакратычных выбараў.

Па меркаваньні ж старшыні Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоля Лябедзькі, адмяняць раней уведзеныя супраць чыноўнікаў

санкцыі нельга, бо не ліквідаваныя прычыны, па якіх гэтыя людзі трапілі ў сьпіс.

Між тым вызваленыя палітвязьні А. Кім, С. Парсюкевіч і А. Казулін 25 жніўня распаўсюдзілі сумесную заяву, у якой патрабуюць сваёй поўнай рэабілітацыі і нагадваюць пра асуджаных па так званым «Працэсе 14-ці». «Мы цьвёрда перакананыя, што вызваленьне некалькіх палітзьняволеных сёньня — гэта не гарантыя таго, што заўтра на іх месцы не апынуцца іншыя. Неабходна дамагацца інстытуцыянальных зьменаў у беларускім заканадаўстве, рэальнага падзелу судовай і выканаўчай уладаў, поўнай рэабілітацыі палітзьняволеных і прадухіленьня падобнай практыкі ў будучыні», — зазначаюць былыя палітзьняволеныя.

4 жніўня інфармацыйныя агенцтвы БелТА і Інтэрфакс са спасылкай на прэзідэнцкую прэс-службу паведамілі, што А. Лукашэнка падпісаў закон «Аб СМІ». Законапраект быў ухвалены Саветам Рэспублікі 28 чэрвеня, у сярэдзіне ліпеня дакумент паступіў на разгляд Канстытуцыйнага Суду (КС) РБ, пасля чаго быў перададзены прэзідэнту. ГА «БАЖ» неаднаразова зьвярталася да дэпутатаў з просьбай накіраваць дакумент на міжнародную эксьпертызу, а таксама прапаноўвала ўласную эксьпертную ацэнку, падрыхтаваную юрыстамі, адзначыўшы шэраг рэгрэсіўных нормаў дакументу. Закон уступіць у сілу з 8 лютага 2009 г.

5 жніўня ў Менску адбылася прэзентацыя рускай версіі часткі справаздачы Абсерваторыі па абароне правоў праваабаронцаў за 2007 год, прысьвечанай краінам Еўропы і СНД. Справаздача паказвае, што свабода аб’яднаньняў і права на мірныя сходы парушаліся ў шматлікіх краінах: дзейнасьць НДА знаходзілася пад пільным назіраньнем, ствараліся перашкоды ў юрыдычным афармленьні дзейнасьці, і некаторыя аб’яднаньні былі ліквідаваныя. На жаль, незаконныя затрыманьні, працэсуальныя парушэньні і перасьлед праваабаронцаў былі паранейшаму вельмі распаўсюджаныя ў краінах, сярод якіх увага нададзеная і Беларусі. У мерапрыемстве ўзяла ўдзел прадстаўніца Сусьветнай Арганізацыі супраць катаваньняў (OMCT), сябра Рады Маладых юрыстаў Грузіі Цінацін Хідашэлі і віцэ-прэзідэнт Міжнароднай Федэрацыі правоў чалавека (FIDH) Алесь Бяляцкі.

# Палітычна матываваныя крымінальныя справы

У ліпені Беларускі Хельсінскі Камітэт перадаў у Падкамітэт па Беларусі Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы і ў Венецыянскую камісію Рады Еўропы заключэньне аб неканстытуцыйнасьці крымінальнага артыкулу 193-1, які прадугледжвае пакараньне да двух гадоў зьняволеньня за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Як патлумачыў кіраўнік юрыдычнай камісіі БХК Гары Паганяйла, юрысты БХК зьвярталіся непасрэдна ў Канстытуцыйны суд, аднак атрымалі адпіску. Менавіта таму праваабаронцы накіравалі свае высілкі, каб міжнародная супольнасьць, міжнародныя праваабарончыя арганізацыі таксама вывучылі сітуацыю ў Беларусі і далі свае незалежныя ацэнкі адносна практыкі, якая абмяжоўвае правы грамадзянаў на асацыяцыю.

22 ліпеня калегія Менскага гарадзкога суду адмовіла ў задавальненьні касацыйных скаргаў 10 моладзевым актывістам па так званым «Працэсе 14-ці». Нагадаем, што 13 з іх у два этапы былі пакарныя судом Цэнтральнага раёну сталіцы за ўдзел у студзеньскай акцыі пратэсту прадпрымальнікаў, а 14-ты навучаецца па праграме Кастуся Каліноўскага ў Польшчы і абʼяўлены ў вышук. На пачатку судовага разгляду старшыня калегіі Уладзімір Назаранка адхіліў хадайніцтва аб вядзеньні працэсу на беларускай мове. Нягледзячы на довады абароны пра тое, што вынесены прысуд не грунтуецца на доказах, што відэаздымкі, якія выкарыстала сьледзтва, былі зробленыя з парушэньнямі закону, судовая калегія пакінула яго нязьменным. Тым ня менш прыцягнутыя да крымінальнай адказнасьці за свае палітычныя перакананьні зьбіраюцца абскарджваць прысуд у вышэйшых судовых інстанцыях.

У Віцебску працягваецца сьледзтва па крымінальнай справе за распальваньне нацыянальнай і рэлігійнай варожасьці, падрабязнасьці не разгалошваюцца, бо гэта тычыцца таямніцы сьледзтва. Віцебскаму праваабаронцу Леаніду Сьвеціку зьмянілі статус сьведкі на галоўнага падазраванага.

Польскія дэпутаты пачалі працэс вылучэньня былога палітвязьня Аляксандра Казуліна на прэмію імя Андрэя Сахарава, якая прызначаецца за дзейнасьць на карысьць правоў чалавека. Ініцыятарам вылучэньня А. Казуліна на гэтую прэстыжную ўзнагароду зьяўляецца старшыня камісіі Еўрапарламенту па кантактах з Беларусьсю Яцэк Пратасевіч. «Мы сабралі ўжо больш за 30 подпісаў. Літаральна апошнія подпісы мы势 плануем сабраць падчас бліжэйшай пленарнай сесіі Еўрапарламенту на пачатку верасьня». Нагадаем, што ўпершыню прэмія Сахарава была прысуджана прадстаўнікам Беларусі ў 2004 годзе. Тады яе атрымала Беларуская асацыяцыя журналістаў. У 2006 годзе лаўрэатам узнагароды Еўрапарламенту стаў Аляксандр Мілінкевіч.

## Парушэньні права на свабоду асацыяцыяў

1 ліпеня група сяброў ліквідаванага ў Берасьці па рашэньні абласнога суду гарадзкога культурна-асьветніцкага грамадзкага аб’яднаньня «Стары горад» накіравала скаргі ў Камітэт ААН па правах чалавека. Сутнасьць індывідуальных зваротаў сяброў арганізацыі Ірыны Лаўроўскай, Паліны Панасюк, Яўгена Бяласіна і Сяргея Панасевіча ў тым, што, па іх меркаваньні, прэтэнзіі, выкладзеныя ўпраўленьнем юстыцыі аблвыканкаму ў зыскавай заяве ў суд, якія леглі ў аснову рашэньня аб ліквідацыі аб’яднаньня, надуманыя. Яны прыводзяць факты, якія пацьвярджаюць гэта, і перакананыя, што рашэньне аб ліквідацыі зьяўляецца расправай з непажаданай уладам грамадзкай арганізацыяй.

15 ліпеня сябры аргкамітэту праваабарончага асьветніцкага грамадзкага аб’яднаньня «Рух «За Свободу» падалі скаргу ў Вярхоўны суд на рашэньне Міністэрства юстыцыі пра нерэгістрацыю аб’яднаньня. Гэта была ўжо трэцяя адмова Мінюсту на працягу году. Судовае паседжаньне адбылося 6 жніўня, Вярхоўны суд амовіў заснавальнікам ПАГА «Рух «За Сваботу» ў задавальненьні скаргі на падставе тэхнічнай памылкі ў гарантыйным пісьме арганізацыі, якая забясьпечвала юрыдычны адрас.

16 ліпеня сябрамі аргкамітэту «Беларускай Хрысьціянскай Дэмакратыі» ў Вярхоўны Суд была пададзеная скарга на рашэньне Міністэрства юстыцыі пра адмову ў рэгістрацыі грамадзкага аб'яднаньня. Гэта была ўжо другая спроба зарэгістраваць аб'яднаньне. 12 жніўня адбыўся разгляд скаргі, і Вярхоўны суд стаў на бок Мінюсту. «Праз месяц-паўтара мы зноў правядзем устаноўчы зьезд і зробім трэцюю спробу зарэгістраваць аб'яднаньне», — паведаміў сябра аргкамітэту па стварэньні БХД Дзяніс Садоўскі.

17 ліпеня Міністэрства юстыцыі Беларусі ў чарговы раз адмовіла ў рэгістрацыі грамадзкага сацыяльна-экалагічнага аб'яднаньня «Цэнтр падтрымкі чарнобыльскіх ініцыятываў», мэта якога — аказаньне дапамогі асобам, пацярпелым ад наступстваў чарнобыльскай катастрофы і іншых тэхнагенных катаклізмаў, якія выклікалі радыяцыйнае апраменьваньне. Ініцыятар стварэньня арганізацыі, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Іван Нікітчанка лічыць, што падставы адмовы, як звычайна, надуманыя. Ён кажа, што раней чыноўнікі знаходзілі «памылкі» ў дакументах, цяпер паведамляюць пра «неадпаведнасьць заканадаўству шэрагу палажэньняў статуту», але не ўдакладняюць, якіх менавіта. Рашэньне Мінюсту заснавальнікі арганізацыі зьбіраюцца аспрэчыць у Вярхоўным судзе Беларусі. 30 ліпеня Вярхоўны суд Беларусі не задаволіў скаргу заснавальнікаў грамадзкага аб'яднаньня пенсіянераў да Міністэрства юстыцыі на адмову ў рэгістрацыі, якое знайшло ў статутных дакументах шэраг недахопаў невыпраўляльнага характару. На думку аднаго з заснавальнікаў Уладзіміра Страха, усе гэтыя парушэньні маглі быць выпраўленыя ў рабочым парадку, аднак Мінюст такой магчымасьці пенсіянерам ня даў. Нагадаем, што гэта была другая спроба атрымаць юрыдычны статус сябрамі арганізацыі, якая ставіць сваёй мэтай абарону сацыяльных правоў сталых людзей.

На пачатку жніўня ўпраўленьне юстыцыі Гарадзенскага аблвыканкаму сёмы раз запар адмовіла ў рэгістрацыі абласной суполцы партыі «Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада». Сябры партыі не выключаюць, што супрацоўнікі ўпраўленьня юстыцыі падмянілі пададзеныя на рэгістрацыю дакументы, бо ў адмове гаворыцца пра не-

дакладныя зьвесткі пра месца працы аднаго з сяброў арганізацыі. Аднак, на думку кіраўніка абласной суполкі партыі БСДГ Віктара Сазонава такога не магло быць у першую чаргу таму, што дакументы на рэгістрацыю падаваліся некалькі разоў, і працоўнае месца сябра партыі не выклікала сумневу ў чыноўнікаў. Грамадзкі актывіст зьвязвае нежаданьне рэгістраваць суполку з той палітыкай, якую праводзяць улады ў дачыненьні да апазіцыйных партыяў і арганізацыяў.

## Парушэньні прынцыпу свободы слова і распаўсюду інфармацыі

17 ліпеня калегія Менскага гарадзкога суду адмовіла ў задавальненьні скаргі карэспандэнта газеты «Народная воля» Марыны Коктыш, якая зьвярталася ў суд з нагоды неакрэдытацыі пры Палаце прадстаўнікоў. Раённы суд не прыняў яе скаргу да разгляду і менавіта гэтыя дзеяньні журналістка спрабавала абскардзіць у вышэйшай інстанцыі. Тым ня менш калегія Менгарсуду чарговы раз стала на бок улады і прызнала правамоцным рашэньне суду першай інстанцыі. Як адзначыў намесьнік старшыні БАЖ юрыст Андрэй Бастунец, які прадстаўляў на судзе інтарэсы М. Коктыш, судовая калегія фактычна згадзілася з тым, што журналіст ня мае права на судовую абарону сваіх парушаных правоў. У сувязі з гэтым прадстаўнікі БАЖ зьбіраюцца зьвяртацца са скаргамі далей: на імя старшыні Менскага гарадзкога суду, а потым і ў Вярхоўны суд Беларусі.

24 ліпеня ў Віцебску супрацоўнікі Менскага ўпраўленьня па барацьбе з арганізаванай злачыннасьцю ў межах сьледства па крымінальнай справе аб выбуху 4 ліпеня правяліператрус у кватэры Жанны Паповай, дырэктаркі выдавецкага дому «Витебский курьер», які выпускае адзіную ў горадзе зарэгістраваную недзяржаўную грамадзка-палітычную газету «Витебский курьер М». У вынікуператрусу з кватэры забралі дыскеты, кампакт-дыскі і флэш-карты, — як патлумачылі міліцыянты, на гэтых носьбітах можа быць схема выбуховага прыстасаваньня. Пасьляператрусу Ж. Папова была дастаўленая ў абласное ўпраўленьне міліцыі па барацьбе з арганізаванай злачыннасьцю «для

апытаньня». Напярэдадні, 21 ліпеня, Ж. Папова накіравала ў міліцыю ліст, у якім патрабавала вярнуць затрыманы наклад першага нумару «Витебского курьера М» альбо патлумачыць прычыну, чаму газеты ўжо некалькі месяцаў знаходзяцца ў міліцыі.

13 жніўня адміністрацыйная камісія Чыгуначнага раёну Віцебску на падставе міліцэйскага пратаколу аштрафавала мясцовага апазіцыянера і распаўсюдніка незалежнай прэсы Барыса Хамайду на 200 тыс. рублёў за парушэньні правілаў гандлю. Па словах сп. Хамайды, ён ня мае намеру аспрэчваць вынесенае рашэньне, бо лічыць, што з 1996 году дзеяньне Канстытуцыі ў Беларусі прыпыненае і, адпаведна, адсутнічае незалежная судовая сістэма. Аднак спыняць дзейнасьць па распаўсюдзе незалежнай прэсы Б. Хамайда таксама не зьбіраецца.

28 жніўня судзьдзя Ленінскага райсуду Менску Міхаіл Хома прысудзіў 10 сутак адміністрацыйнага арышту актывісту грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь» Паўлу Лукшу, які быў затрыманы за распаўсюд самвыдатаўскай газеты «Выбар» яшчэ 18 жніўня. У выданьні былі зьмешчаныя матэрыялы з заклікамі да байкоту верасьнёўскіх парламенцкіх выбараў і пратэстаў супраць магчымых фальсіфікацыяў іх вынікаў. Суд палічыў наяўнасьць у выданьні згаданых публікацыяў заклікам да ўдзелу ў несанкцыянаванай акцыі і арыштаваў актывіста паводле арт. 23.34 КаАП — «Парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў».

У канцы жніўня Міністэрства інфармацыі вынесла недзяржаўнай грамадзка-палітычнай газеце «Бобруйский курьер» адразу два папярэджаньні, якія грунтуюцца на трох артыкулах Закону «Аб друку і іншых СМІ» — арт.11 («Перарэгістрацыя СМІ»), арт. 26 («Выходныя дадзеныя») і арт.32 («Права на атрыманьне інфармацыі»). Рэдактар «Бобруйского курьера» Анатоль Санаценка, які меў асабістую размову з кіраўніком сектару рэгістрацыі СМІ і кантролю за выкананьнем заканадаўства Мінінфармацыі Віктарам Гурэцкім, агучаныя прэтэнзіі да свайго выданьня лічыць надуманымі. Як зазначыў журналіст у гутарцы з прэс-службай БАЖ, асноўнай нагодай для вынясеньня «БК» папярэджаньня стала публікацыя ў адным з ліпеньскіх нумароў га-

зеты інфармацыі пра тое, што Бабруйск адсьвяткуе 27 ліпеня Дзень падпісаньня дэкларацыі аб суверэнітэце Беларусі. Акрамя спрэчнай нататкі ў Мініфармацыі ўзьніклі прэтэнзіі да тэрыторыі распаўсюду газеты і мовы выданьня.

## Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў

1 ліпеня суд гораду Баранавічы і Баранавіцкага раёну арыштаваў на 10 сутак актывіста «Маладога Фронту» з Баранавічаў Зьмітра Станкевіча. Ён быў затрыманы ў цэнтры гораду падчас распаўсюду ўлётак з інфармацыяй пра палітвязьня Андрэя Кіма, пратакол міліцыянты склалі паводле арт. 17.1 КаАП — дробнае хуліганства.

2 ліпеня актывіст грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь» Павел Юхневіч зьмешчаны ў Цэнтр ізаляцыі правапарушальнікаў на Акрэсьціна адбываць 7-суткавы адміністрацыйны арышт, вынесены яму завочна яшчэ ў траўні судом Першамайскага раёну Менску за ўдзел у афіцыйным мітынгу прафсаюзаў каля Нацыянальнай бібліятэкі. Павел Юхневіч вырашыў сам прыйсьці ў Першамайскі РУУС, каб яго не схапілі на вуліцы, як гэта адбылося з другім актывістам «Еўрапейскай Беларусі» Яўгенам Афнагелем.

11 ліпеня судзьдзя Цэнтральнага райсуду сталіцы Тацьцяна Паўлючук прызнала актывістаў АГП вінаватымі ў парушэньні арт. 17.1 КаАП — «Дробнае хуліганства» і вынесла пакараньне ў выглядзе адміністрацыйнага арышту: Кірылу Паўлоўскаму на 10 сутак, Міхасю Пашкевічу і Віталю Стажараву — на 15 сутак. Яны былі затрыманыя раніцай пасьля таго, як хацелі даведацца ў КДБ пра лёс свайго паплечніка Аляксандра Сяргеенкі. Супрацоўнікі міліцыі даставілі актывістаў АГП у Цэнтральны РУУС, дзе склалі пратаколы за нецэнзурную лаянку ў грамадзкім месцы.

16 ліпеня віцебскі праваабаронца Павел Левінаў адпраўлены з бальнічнага ложку адбываць 10-дзённы адміністрацыйны арышт, выне-

сены яму яшчэ 26 траўня. Сябра БХК прызнаны судзьдзёй Чыгуначнага райсуду Валянцінай Кісьмярошкінай вінаватым у дробным хуліганстве, а менавіта нецэнзурнай лаянцы на адрас супрацоўнікаў міліцыі пры затрыманьні яго 27 сакавіка. Тады праваабаронца спрабаваў трапіць у кватэру да журналіста Вадзіма Баршчэўскага, дзе адбываўсяператрус. Павел Левінаў амаль два месяцы спрабаваў аспрэчыць судовую пастанову, паводле якой апрача арышту ён быў пакараны штрафам у памеры 20 базавых велічыняў (700 тыс. рублёў) па абвінавачаньні ў непадпарадкаваньні міліцыянтам. Паводле праваабаронцы, увесь гэты час супрацоўнікі Першамайскага РАУС рабілі захады, каб гвалтам даставіць яго пад арышт: дзяжурылі каля ягонай кватэры і адсочвалі ягоныя перамяшчэньні па горадзе.

28 ліпеня судзьдзя Бабруйскага райсуду Аляксей Клімаў прызнаў мясцовага палітыка, прэтэндэнта ў кандыдаты на маючых адбыцца парламенцкіх выбарах Алеся Чыгіра вінаватым у парушэньні трох адміністрацыйных артыкулаў (дробнае хуліганства, непадпарадкаваньне супрацоўнікам міліцыі і пашкоджаньне транспартнага сродку — таксоўкі) і пакараў арыштам на тэрмін 10 сутак і штрафам у памеры 60 базавых велічыняў (2 млн 100 тыс. рублёў). Палітыку далі магчымасьць абскардзіць прысуд на працягу 5 дзён, таму ён застаўся на волі. 14 жніўня Магілёўскі абласны суд не задаволіў скаргі Алеся Чыгіра на пастановы суду першай інстанцыі. Судзьдзя абласнога суду Мікалай Гладкі агучыў толькі прысуд і не прывёў ніякіх аргументаў.

30 ліпеня па абвінавачаньні ў арганізацыі несанкцыянаванага мітынгу супраць будаўніцтва заводу па вытворчасьці пестыцыдаў у пасёлку Дружным, які адбыўся 27 чэрвеня, судзьдзя Пухавіцкага райсуду Анатоль Вяжэвіч аштрафаваў грамадзкага актывіста Сяргея Абразоўскага на 50 базавых велічыняў (1 млн 750 тыс. рублёў). Сп. Абразоўскага караюць штрафам ужо трэці раз.

У жніўні актывіст БХД Кастусь Шыталь быў выкліканы да судовага выканаўцы Докшыцкага раённага суду «для выплаты прысуджаных 70 тыс. беларускіх рублёў». Як высьветлілася, гэта быў штраф за правядзеньне пікету на рынку ў Докшыцах 9 траўня. Суд адбыўся

10 ліпеня, аднак, па словах К. Шыталя, позву ён не атрымліваў, хоць у пастанове напісана, што ён быццам «не зьявіўся на суд, хаця быў праінфармаваны адпаведным чынам».

## Парушэньні права на свободу мірных сходаў

У ліпені Менгарвыканкам не дазволіў правядзеньне пікетаў салідарнасьці са зьняволеным лідэрам БСДП (Грамада) Аляксандрам Казуліным на вуліцы Арлоўскай, запланаваных на 6—7 ліпеня і прымеркаваных да другой гадавіны судовага працэсу над палітыкам. У афіцыйным лісьце сталічных уладаў адмова ў правядзеньні пікетаў ніяк не матывуецца. Між тым пляцоўка насупраць цырку шапіто па вуліцы Арлоўскай уваходзіць у сьпіс месцаў, дзе дазволена правядзеньне масавых мерапрыемстваў.

14 ліпеня ў Менску на Кастрычніцкай плошчы каля 50 прадстаўнікоў палітычных партыяў і рухаў правялі акцыю супраць зьняволеньня актывістаў апазіцыі, арыштаваных пасьля выбуху 4 ліпеня. Мірнае мерапрыемства было жорстка падаўленае, у часе разгону байцы сьпецназу зьбілі лідэра АГП Анатоля Лябедзьку. Па выніках медыцынскага агляду ў палітыка зафіксаваныя пяць гематомаў, аднак, нягледзячы на медычнае пацьверджаньне фізічных пашкоджаньняў, нанесеных міліцыянтамі, палітык ня бачыць сэнсу зьвяртацца ў суд.

Берасьцейскаму актывісту і праваабаронцу Раману Кісьляку гарадзкія ўлады забаранілі правядзеньне акцыі «Марш дробных хуліганаў», які быў запланаваны на 30 ліпеня. Гэтай акцыяй праваабаронца зьбіраўся прыцягнуць увагу грамадзкасьці да масавых прыкладаў адміністрацыйных затрыманьняў і пакараньняў па абвінавачаньні ў дробным хуліганстве напярэдадні значных грамадзка-палітычных падзеяў у краіне. Афіцыйная прычына адмовы ў правядзеньні маршу — неадпаведнасьць заяўленага месца рашэньню гарвыканкаму «Аб вызначэньні сталага месца для правядзеньня масавых мерапрыемстваў у Берасьці». 19 заяўнікаў запланаванага маршу абскардзілі рашэньне гарвыканкаму, які забараніў правядзеньне

акцыі, у судзе. Тым ня менш у судзе адмовіліся разглядаць скаргу на падставе непадведамаснасьці.

12 жніўня суд Цэнтральнага раёну сталіцы асудзіў моладзевую актывістку Маўлюду Атакулаву на 10 сутак арышту. Яна была затрыманая напярэдадні разам з салігорскімі маладафронтаўцамі Іванам і Ільлёй Шыламі, Андрусём Тычынам падчас спробы пікетаваць расейскую амбасаду. Затрыманых даставілі ў пастарунак, аднак, паколькі хлопцы былі непаўнагадовымі, на іх склалі адміністрацыйныя пратаколы і адпусьцілі пасьля зьяўленьня бацькоў, а Маўлюда Атакулава ноч правяла ў ізалятары. Судзілі актывістку за зачыненымі дзьвярыма, ніхто з яе паплечнікаў ня змог патрапіць у залу паседжаньня. Пра прынятае рашэньне стала вядома толькі пасьля таго, як дзяўчыну выводзілі з будынку суду.

Менгарвыканкам забараніў правядзеньне 31 жніўня ў цэнтры сталіцы мітынгу супраць ваенных дзеяньняў у падтрымку захаваньня тэрытарыяльнай цэласнасьці Грузіі. Заяўку на правядзеньне акцыі падавалі актывісты Моладзі БНФ. Фармальнай прычынай адмовы было тое, што запланаванае месца — Плошча Якуба Коласа — знаходзіцца блізка да лініі метро, а гэта супярэчыць закону аб правядзеньні масавых мерапрыемстваў. Разам з тым сталічныя ўлады не прапанавалі ніякіх альтэрнатыўных варыянтаў для месца збору, як таго патрабуе заканадаўства.

## Звальненьні і адлічэньні з вучобы па палітычных матывах

14 ліпеня адбыўся суд над актывістам «Маладога Фронту» і БХД Паўлам Наздрой па справе, заведзенай Мазырскім ваенкаматам у чэрвені. Ён абвінавачваўся ў тым, што некалькі гадоў таму не паведаміў у ваенкамат пра сваё звальненьне з працы. Суд прызнаў актывіста вінаватым у парушэньні правілаў вайсковага рэжыму і пакараў штрафам у памеры дзьвюх базавых велічыняў. Аднак, па словах П. Наздры, іншыя падсудныя, з якімі ў гэты дзень судзіўся ваен-

камат, атрымалі толькі папярэджаньні, таму ён расцэньвае гэты суд як выкананьне загаду і чарговую спробу ціску на яго з-за актыўнай грамадзка-палітычнай дзейнасьці.

30 ліпеня актывіста Полацкай філіі «Маладога Фронту» Алеся Круткіна забралі з кватэры супрацоўнікі міліцыі і адвезьлі ў Полацкі РАУС, дзе склалі адміністрацыйны пратакол па арт. 25.1 КаАП за няяўку ў ваенкамат. Аднак прызыў 18-гадовага А. Круткіна ў войска ня можа лічыцца законным, бо напрыканцы чэрвеня ён быў беспадстаўна адлічаны з 1-га курсу гістарычнага факультэту БДУ. Між тым Алесь Круткін паступіў ва ўнівэрсітэт без уступных выпрабаваньняў, бо зьяўляўся пераможцам рэспубліканскай алімпіяды па гісторыі.

Кіраўнік Кобрынскай арганізацыі Партыі БНФ Аляксандр Мех, які зьяўляецца кандыдатам у сьпісе АДС на парламенцкія выбары, звольнены з пасады інжынера Упраўленьня магістральных газаправодаў ААТ «Белтрансгаз». Перад гэтым начальнік Кобрынскага УМГ Уладзімір Галашка і начальнік Кобрынскай управы КДБ Андрэй Басько 16 хвілінаў праводзілі з ім так званую «прафілактычную гутарку». Пад пагрозай звальненьня з працы яны змушалі А. Меха адмовіцца ад удзелу ў выбарах, казалі, што ён ня знойдзе працы ва ўсёй Беларусі, ціснулі на тое, што ў яго сям’я — малыя дзеці і жонка. Прапановы начальніка і кадэбіста грамадзка-палітычны дзеяч запісаў на дыктафон. Гутарка была агучаная ў незалежных СМІ. Рашэньне адміністрацыі не працягваць працоўны кантракт Аляксандр Мех абскардзіў у раённым судзе. Судовае паседжаньне працягвалася тры дні, аднак 22 жніўня судзьдзя Кобрынскага райсуду Аляксандар Бабаскін вынес рашэньне адмовіць сябру Партыі БНФ А. Меху па ўсіх пунктах ягонага зыску.

# Агляд-хроніка парушэньня правоў чалавека ў Беларусі, верасень 2008 году

2 верасьня ў Менску адбылася прэзентацыя дакладу «Умовы ўтрыманьня пад вартай у Рэспубліцы Беларусь», падрыхтаванага Міжнароднай федэрацыяй правоў чалавека (FIDH) з дапамогай беларускіх праваабаронцаў. Даклад складзены па выніках працы міжнароднай дасьледчай місіі і зьяўляецца каштоўнай крыніцай апошняй інфармацыі аб умовах зьняволеньня ў Беларусі, бо з прычыны адсутнасьці кантролю за пенітэнцыярнай сістэмай Беларусі з боку незалежных, нацыянальных або міжнародных механізмаў, інфармацыя пра умовы ўтрыманьня вязьняў у краіне практычна адсутнічае. Падчас прэзентацыі генеральны сакратар FIDH Луіс Перэс павітаў рашэньне беларускіх уладаў, якія вызвалілі ў жніўні апошніх палітвязьняў, але канстатаваў, што сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі па-ранейшаму выклікае занепакоенасьць у міжнароднай грамадзкасьці. У справаздачы зробленая выснова, што «ўмовы ўтрыманьня пад вартай у Беларусі надзвычай нездавальняючыя і ўяўляюць сабою формы бесчалавечнага абыходжаньня, забароненага Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах, Канвенцыяй ААН супраць катаваньняў і іншага жорсткага, бесчалавечнага і прыніжальнага абыходжаньня».

28 верасьня адбыліся выбары дэпутатаў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацьвёртага скліканьня. Парламенцкія выбары адбываліся на фоне складанай сітуацыі з правамі чалавека. Асноўныя грамадзка-палітычныя правы, такія, як свабода слова, свабода мірных сходаў і асацыяцыяў, заставаліся істотна абмежаванымі, мелі месца факты палітычна матываванага перасьледу апанентаў рэжыму з боку афіцыйных уладаў Беларусі, што не спрыяла правядзеньню выбараў у атмасьферы даверу. Нягледзячы на шматлікія абяцаньні кіраўніцтва краіны правесьці свабодныя

і дэмакратычныя выбары, так і не былі выкананыя рэкамендацыі АБСЕ, зробленыя падчас папярэдніх выбараў. Цэнтральная камісія па правядзеньні выбараў і рэспубліканскіх рэферэндумаў адмовілася праводзіць перамовы з прадстаўнікамі АДС па пытаньнях магчымасьці паляпшэньня ўмоваў правядзеньня выбарчай кампаніі.

Згодна з афіцыйнымі зьвесткамі ў галасаваньні ўзялі ўдзел 75,3% выбаршчыкаў, усе 110 дэпутатаў былі абраныя ў выніку галасаваньня ў першым туры. Па словах старшыні ЦВК Лідзіі Ярмошынай, было зэканомлена каля 2 млрд рублёў. Гэтыя сродкі затым у асноўным былі выдаткаваныя на прэміраваньне сяброў выбарчых камісіяў. Ніводны з прадстаўнікоў апазіцыі ў парламент ня трапіў. Сьпіс кандыдатаў, якія прайшлі ў Палату прадстаўнікоў, агучаны Л. Ярмошынай, амаль цалкам супаў з апублікаваным за некалькі дзён да выбараў газетай «Народная воля» сьпісам зацьверджаных уладамі кандыдатаў, дасланым у рэдакцыю гэтай газеты ананімным чыноўнікам.

У парламенцкіх выбарах узялі ўдзел 263 кандыдаты, з іх, па дадзеных АДС, на апошнім этапе заставалася 66 прадстаўнікоў ад апазіцыі. Прыкладна на 30 акругах выбары праходзілі без апазіцыйных кандыдатаў. У цэлым па Беларусі 16 акругаў аказаліся безальтэрнатыўнымі. Пасьля падліку галасоў у Цэнтрвыбаркам было пададзена 24 скаргі з патрабаваньнем прызнаць выбары несапраўднымі, іх вынікі аспрэчваліся ў 20 акругах, аднак ЦВК адмовілася разглядаць гэтыя скаргі і перанакіравала іх у акруговыя выбарчыя камісіі.

Як адзначылі праваабаронцы-ўдзельнікі маніторынгу, які ажыцьцяўляўся на падставе доўгатэрміновага назіраньня за асноўнымі этапамі выбарчай кампаніі і адбываўся на 86 выбарчых акругах, працэдуры фармаваньня і склад акруговых і асабліва ўчастковых выбарчых камісіяў, недастковая празрыстасьць рэгістрацыі кандыдатаў, прымус да ўдзелу ў датэрміновым галасаваньні, закрытасьць выбараў для назіральнікаў не адпавядалі стандартам Капенгагенскага дакументу АБСЕ і беларускаму заканадаўству. Парушэньні правілаў падліку галасоў і немагчымасьць назіральнікам рэальна сачыць за гэтым працэсам не дае падставаў для даверу агучаным выбарчымі камісіямі вынікаў выбараў. Згодна з дзеючым заканадаўствам, датэрміновае галасаваньне пачалося за 5 дзён да прызначанай даты — у аўторак, 23 верасьня. Сярод тыповых парушэньняў падчас датэрміновага гала-

саваньня каардынатары кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» адзначылі немагчымасьць атрыманьня назіральнікамі якой-небудзь інфармацыі ад членаў участковых выбарчых камісіяў, напрыклад, колькі бюлетэняў было дастаўлена на выбарчыя ўчасткі, колькі чалавек уключана ў сьпісы для галасаваньня, колькі прагаласавала за пэўны прамежак часу. На некаторых участках у першы дзень датэрміновага галасаваньня скрыні былі апячатаныя «ўсьляпую» без адкрыцьця і прад'яўленьня іх для агляду сябрам участковых выбарчых камісіяў.

Па ўсёй краіне зафіксаваныя шматлікія факты прымусу да ўдзелу ў датэрміновым галасаваньні. Гэта адбывалася паўсюль: на прадпрыемствах, у навучальных установах. Пісьмовыя заклікі да датэрміновага галасаваньня разьмяшчаліся ў грамадзкіх месцах (крамах, майстэрнях, цырульнях, лазьнях і г. д.), жылых дамах. Апроч таго, ад выбаршчыкаў сьвядома утойвалася, што права датэрміновага галасаваньня можа быць скарыстанае толькі ў выпадку адсутнасьці магчымасьці ў дзень выбараў знаходзіцца па месцы свайго жыхарства. Але ня толькі выкарыстаньне адміністрацыйнага рэсурсу значыцца сярод парушэньняў. Зафіксаваныя затрыманьні і канфіскацыі перадвыбарчых матэрыялаў. 23 верасьня рэпарцёру незалежнай штодзённай газеты «Народная воля» Юрыю Дзядзінкіну, нягледзячы на наяўнасьць прэс-карты, забаранілі рабіць фотаздымкі на выбарчым ўчастку № 398 у Менску. Сябры камісіі спасылаліся на адпаведнае рашэньне старшыні ўчастковай выбарчай камісіі. Сакратар ЦВК Мікалай Лазавік патлумачыў гэтую забарону няздольнасьцю журналіста наладзіць «чалавечыя стасункі» з сябрамі ўчастковай камісіі. Таксама зафіксаваныя факты гвалтоўнага перасьледу: 28 верасьня ў Віцебску каля 20-й гадзіны вечару зьбілі рэдактара недзяржаўнай газеты «Курьер из Витебска» Уладзіміра Базана, які быў назіральнікам на выбарчым участку № 34 Віцебскай Кастрычніцкай выбарчай акругі № 20. Падобным чынам ва ўласным пад'езьдзе быў зьбіты незалежны кандыдат Андрэй Левінаў.

Міжнародная місія назіральнікаў Арганізацыі па бясьпецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ) не прызнала парламенцкіх выбараў, якія адбыліся ў Беларусі 28 верасьня, адпаведнымі дэмакратычным стандартам, адзначыўшы пры гэтым вялікую колькасьць парушэньняў

і фальсіфікацыяў. Незадаволенымі правядзеньнем выбараў засталіся і ЗША. Місія ж назіральнікаў ад СНД прызнала парламенцкія выбары свабоднымі і дэмакратычнымі.

Прадстаўнікі апазіцыі абвясьцілі, што вынікі выбараў былі падтасаваныя, а яўка выбаршчыкаў на ўчасткі — завышаная. 28 верасьня ў цэнтры сталіцы адбылася акцыя пратэсту супраць фальсіфікацыі вынікаў парламенцкіх выбараў, якую міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў назваў грубым парушэньнем правапарадку і заявіў, што гэтаму будзе дадзена прававая ацэнка.

Старшыня грамадзкага аб'яднаньня «Беларуская асацыяцыя журналістаў» Жанна Літвіна стала лаўрэатам прэміі Фонду імя Фрыдрыха Эберта па правах чалавека ў 2008 годзе.

## Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў

У верасьні Клецкі райвыканкам прыняў рашэньне за № 886 «Аб надзяленьні службовых асобаў Клецкага райвыканкаму паўнамоцтвамі на складаньне пратаколаў аб адміністрацыйных парушэньнях». Насельніцтва пра гэта папярэджана праз мясцовую райгазету «Да новых перамог», паведаміў праваабаронца і выдавец Сяргей Панамароў. У сьпісе чыноўнікаў-выканаўцаў — усе намесьнікі старшыняў райвыканкаму, начальнікі ўпраўленьняў, вядучыя сьпецыялісты, а таксама міліцыянты і нават супрацоўнікі ідэалагічнага аддзелу. Таксама сваім рашэньнем Клецкі райвыканкам абавязаў усе тамтэйшыя сельскія выканаўчыя камітэты прыняць адпаведныя рашэньні — надаць сельсаветчыкам права штрафаваць сваіх аднавяскоўцаў. Караць будуць ня толькі за сьмецьце, пустазельле і лаянку, але перадусім — за абразу чыноўнікаў, парушэньні пры наведваньні будынкаў і кабінетаў улады. Усяго так званых штрафных артыкулаў — больш за 45.

13 верасьня падчас афіцыйных урачыстасьцяў да Дня Гомелю, які адзначаў 866-ю гадавіну заснаваньня, актывісты мясцовага «Маладога Фронту» ўзьнялі бел-чырвона-белы сьцяг. Міліцыянты адразу

выхапілі з натоўпу Андруся Цянюту і, зьбіваючы, паваліілі на зямлю. У выніку А. Цянюту пашкодзілі калена і вывіхнулі палец. У пастарунку на маладафронтаўца склалі некалькі пратаколаў, сярод якіх супраціў міліцыі і брыдкаслоўе. Ноч хлопец правёў у асобным пакоі, седзячы на бетонавай падлозе. Раніцай наступнага дня ён запатрабаваў, каб выклікалі лекара, бо кепска сябе адчуваў. Медыкі дыягназавалі сімптомы пнеўманіі, тым ня менш на волю маладафронтаўца выпусьцілі толькі праз 15 гадзінаў. 23 верасня А. Цянюту зьнялі з цягніка, што накіроўваўся ў Менск. Міліцыянты абвінавацілі актывіста ў тым, што ён ухіляецца ад судовага працэсу і пратрымалі да раніцы ў ізалятары. На наступны дзень Чыгуначны райсуд Гомелю пакараў маладафронтаўца адміністрацыйным арыштам тэрмінам на 7 сутак і штрафам у памеры 20 б. в. (700 тыс. рублёў).

Уначы з 14 на 15 верасьня ў Берасьці за нанясеньне графіці «БАЙКОТ!» былі затрыманыя моладзевыя актывісты Міхась Ільін і Яўген Скрабец. Толькі раніцай пасьля правядзеньня эксьпертызы, ці не падпадае нанесеная шкода пад крымінальную справу, міліцыянты склалі адміністрацыйныя пратаколы па арт. 17.1 — «Дробнае хуліганства». Суд Маскоўскага раёну Берасьця пакараў М. Ільіна і Я. Скрабца на 5 сутак арышту кожнага.

5 верасьня суд Савецкага раёну Менску пакараў 15 суткамі арышту моладзевага актывіста Вадзіма Ханяўку па абвінавачаньні ў дробным хуліганстве. Па выхадзе на волю В. Ханяўка распавёў падрабязнасьці свайго затрыманьня: «Я толькі ўвайшоў у гараж, дзе знаходзіліся некаторыя матэрыялы па кампаніі «БАЙКОТ 2008!», як да гаражу пад’ехаў «уазік» з амапаўцамі, якія, відавочна, высочвалі мяне. Мяне паваліілі на зямлю і пачалі зьбіваць, пасьля адвезьлі ў Савецкі РАУС і склалі фальшывы пратакол».

Таксама 5 верасьня быў затрыманы актывіст «Маладога Фронту» Дзяніс Карноў, у якога міліцыя і супрацоўнікі КДБ правялі дома ператрус. Праз некалькі гадзінаў маладафронтавец быў вызвалены з пастарунку.

29 верасьня камісія па справах непаўнагадовых Салігорскага райвыканкаму разгледзела адміністрацыйныя справы ўдзельнікаў ан-

тываеннай акцыі, якая адбылася 11 жніўня ў Менску каля расійскай амбасады і была разагнаная міліцыяй з ужываньнем фізічнай сілы і сьпецсродкаў. 16-гадоваму Ільлю Шылу за парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў вынесенае папярэджаньне, ягоны брат Іван Шыла пакараны штрафам у памеры 25 б. в. (875 тыс. рублёў). Раней за ўдзел у мірнай акцыі пратэсту актывістка «Маладога Фронту» Людвіся Атакулава атрымала і адбыла 10 сутак арышту, а на Андруся Тычыну быў накладзены штраф у памеры 25 базавых велічыняў.

## Катаваньні і іншыя віды жорсткага, бесчалавечнага абыходжаньня

1 верасьня ў Салігорску была затрыманая і зьбітая міліцыянтамі Яна Палякова, якая зьяўлялася сябрам ініцыятыўнай групы кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Вольгі Казулінай. Трое супрацоўнікаў праваахоўных органаў даставілі яе ў пастарунак, дзе Я. Паляковай стала кепска, пасьля чаго «хуткая» пад аховай міліцыі адвезла яе ў шпіталь. Лекары зафіксавалі цялесныя пашкоджаньні на руцэ і нагах. Яна Палякова зьвярнулася са скаргай у пракуратуру, у якой просіць правесьці праверку дзеяньняў службовых асобаў, якія перавысілі службовыя паўнамоцтвы.

7 верасьня сябра моладзевага крыла АГП з Берасьця Юры Панасюк зьвярнуўся да праваабаронцаў і паведаміў пра грубыя, незаконныя дзеяньні сьпецслужбаў у дачыненьні да яго, а таксама ўжываньне катаваньняў, якія мелі месца ў сувязі з расьсьледаваньнем справы аб выбуху ў Менску. Людзі ў цывільным падыйшлі да хлопца, адзін з іх, нічога не тлумачачы, нанёс удар у грудзі, двое астатніх схапілі за рукі, сілком надзелі кайданкі і заштурхнулі на задняе сядзеньне аўтамабілю. Пагражалі, каб не лез у палітыку. Пры гэтым адзін дастаў цясак, Юры рукамі ў наручніках спрабаваў яго адбіць і параніў на левай руцэ два пальцы, пацякла кроў. Атрымаў удары ў галаву, пасьля чаго з яго зьнялі кайданкі і выштурхнулі з машыны. «Лічу, што гэтая акцыя — не што іншае, як запалохваньне моладзевых актывістаў», — сьцвярджае Ю. Панасюк.

# Парушэньні прынцыпу свободы слова і распаўсюду інфармацыі

9 верасьня суд Іўеўскага раёну на падставе заявы начальніка упраўленьня КДБ па Гарадзенскай вобласьці І. Сяргіенкі прызнаў нумар незалежнай газеты «Свабода» № 127 (14–27.08.2008) экстрэмісцкім выданьнем і вынес рашэньне аб зьнішчэньні накладу, канфіскаванага 19 жніўня на трасе Менск–Гародня. Судзьдзя А. Тоўсьцік падтрымаў меркаваньне супрацоўніка органаў бясьпекі і пагадзіўся з тым, што шэраг зьмешчаных у газеце артыкулаў утрымліваюць матэрыялы, якія прапагандуюць экстрэмісцкую дзейнасьць і генацыд грузінскіх уладаў у дачыненьні да асецінскага народу. Паколькі на тэрыторыі Беларусі гэтае выданьне лічыцца пазазаконным, тыя грамадзяне, якія будуць затрыманыя за распаўсюд газеты, могуць прыцягвацца да адказнасьці паводле крымінальнага кодэксу. Сама справа была першай з шэрагу судовых разьбіральніцтваў, якія праходзяць на Гарадзеншчыне паводле заяваў КДБ аб прызнаньні матэрыялаў, канфіскаваных на працягу некалькіх гадоў, экстрэмісцкімі.

18 верасьня ў судзе Кастрычніцкага раёну Гародні адбылася папярэдняя гутарка бакоў па грамадзянскай справе «Аб прызнаньні інфармацыйных матэрыялаў экстрэмісцкімі», распачатая гарадзенскім абласным камітэтам КДБ. Як высьветлілася ў судзе, адказчыкамі па справе выступаюць 9 асобаў, у якіх за апошнія гады на мяжы вымалі «патэнцыйна экстрэмісцкую» прадукцыю: моладзевыя актывісты, студэнты Барыс Гарэцкі, Яўген Скрабутан, Аляксей Трубкін, Зьміцер Мальчык, журналіст Анджэй Пісальнік, сябар АГП Уладзімір Ларын, праваабаронца Валеры Шчукін, Юры Марціновіч і Станіслаў Ёдка. Сярод так званых экстрэмісцкіх матэрыялаў фігуруе «Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі ў 2004 годзе», канфіскаваны мытнікамі ў А. Трубкіна. Як зазначана ў дакуменце, кніга «ўтрымлівае значную колькасьць фотаматэрыялаў з масавымі несанкцыянаванымі пратэстнымі акцыямі ў Рэспубліцы Беларусь («Дзень Волі», «Чарнобыльскі шлях», «Дзяды») антыбеларускай скіраванасьці <...>, утрымлівае матэрыялы з прыкметамі закліку да захопу дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам і арганізацыі масавых беспарадкаў».

З дзевяці выкліканых у суд прыйшлі трое. Пасьля правядзеньня гутаркі асобна з кожным судзьдзя Аляксандр Сіцько паведаміў, што справа будзе разглядацца ў кастрычніку. Журналісты і праваабаронцы на гутарку не дапускаліся.

15 верасьня судзьдзя Пухавіцкага райсуду Лілія Рухлевіч адхіліла скаргу жыхароў пасёлку Дружны на кіраўніцтва Пухавіцкага райвыканкаму, якое не дазваляла насельніцтву знаёміцца з дакументамі, зьвязанымі з будаўніцтвам хімічнага заводу расійскай прыватнай кампаніі «Август-Бел». Судовы працэс праходзіў цягам некалькіх дзён, і напачатку, 10 верасьня, было пацьверджана права грамадзкасьці атрымаць экалагічную інфармацыю, і дакументы, зьвязаныя з будаўніцтвам шкоднай вытворчасьці, былі запатрабаваныя з райвыканкаму. Аднак 12 верасьня з імі азнаёміліся толькі судзьдзя і пракурор, дакументы не былі далучаныя да матэрыялаў справы. Заяўніца ад грамадзкасьці Настасься Рысявец лічыць гэта вынікам пэўнага ціску, бо «акрамя экалагічнай інфармацыі ў гэтых дакументах якраз утрымліваецца тое, што мясцовае насельніцтва супраць будаўніцтва гэтага заводу». «І таму гэтыя пратаколы вельмі важна атрымаць. Мы імкнемся даказаць, што насельніцтва выказвалася супраць, а ўлада пра гэта хлусіць», — запэўніла Н. Рысявец. Яна заявіла, што рашэньне суду будзе абскарджанае ў вышэйшай інстанцыі.

14 верасьня падчас распаўсюду апошняга нумару незалежнай газеты «Свабодны Салігорск» на цэнтральным рынку гораду быў затрыманы маладафронтаўскі актывіст Андрусь Тычына. Закаванага ў кайданкі хлопца міліцыянты даставілі ў мясцовы РАУС, дзе канфіскавалі 40 асобнікаў бюлетэню, склаўшы адпаведны пратакол. Праз гадзіну пасьля затрыманьня маладафронтаўца вызвалілі.

## Парушэньні права на свабоду мірных сходаў

12 верасьня ад імя намесьніцы старшыні «Маладога Фронту» Насты Палажанкі ў Менгарвыканкам была пададзеная заяўка на правядзеньне 28 верасьня на Кастрычніцкай плошчы мітынгу з мэтаю

«данясеньня інфармацыі да грамадзянаў Беларусі аб фальсіфікацыі парламенцкіх выбараў і рэпрэсіях падчас выбарчага фарсу ў дачыненьні да ўсяго грамадзтва». Гарадзкія ўлады далі адмоўны адказ па прычыне нібыта немагчымасьці правядзеньня такога роду акцыяў у цэнтры беларускай сталіцы. Больш за тое, напярэдадні 28 верасьня ў міліцыю і пракуратуру пачалі выклікаць тых, хто актыўна заклікаў да ўдзелу ў акцыі, каб папярэдзіць аб магчымай крымінальнай адказнасьці.

15 верасьня актывістам Полацкага «Маладога Фронту» адмовілі ў правядзеньні пікету «БАЙКОТ 2008!», заяўленага на 20 верасьня. Па словах заяўніка акцыі Алеся Круткіна, афіцыйнай падставай для адмовы сталася нібыта тое, што ў кінатэатры, каля якога планавалася зладзіць акцыю, у гэты час адбудзецца прагляд дзіцячых фільмаў і пікетоўцы будуць замінаць у правядзеньні кінапрагляду. «Гэта яўнае парушэньне заканадаўства, таму мы ўжо падалі скаргі на Полацкі выканкам у пракуратуру, мясцовую выбарчую камісію і Цэнтральную выбарчую камісію», — зазначыў А. Круткін. Нагадаем, некалькі тыдняў таму сакратар Цэнтрвыбаркаму Мікалай Лазавік паведаміў, што агітаваць за байкот парламенцкіх выбараў у Беларусі не забаронена.

Улады Барысаву забаранілі правядзеньне фестывалю хрысьціянскай музыкі, арганізаванага прадстаўнікамі праваслаўнай, каталіцкай і пратэстанцкай канфесіяў. Удзел у ім меліся прыняць каля сотні музыкаў і сьпевакоў з розных рэгіёнаў Беларусі, пачатак фестывалю быў прызначаны на 16 верасьня, заканчэньне — на 21 верасьня. На адкрыцьцё запланаванага мерапрыемства сабралася каля паўтары тысячы чалавек, але за 10 хвілінаў да пачатку прадстаўніца ідэалагічнага аддзелу райвыканкаму Барысаву паведаміла, што дазвол на правядзеньне імпрэзы «страціў юрыдычную моц» і фестываль забаронены. Чыноўніца патлумачыла, што арганізатары не ўзгаднілі праграму свайго фестывалю, не вырашылі пытаньні бясьпекі мерапрыемства, уборкі сьмецьця. Выправіць сітуацыю не ўдалося.

# Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў

30 верасьня ў Рэчыцкім раённым судзе распачаты папярэдні разгляд зыску незалежнага Беларускага прафсаюзу радыёэлектроннай прамысловасьці да мясцовага райвыканкаму, які адмовіўся паставіць на ўлік створаную тут раённую прафсаюзную суполку. Судзьдзя Анатоль Стрэльчанка запытаў неабходныя дакументы, каб пацьвердзіць уступленьне ў прафсаюз РЭП новых сяброў і законнасьць стварэньня тэрытарыяльнай суполкі. На наступнае паседжаньне ў якасьці сьведкаў выpашана выклікаць і некаторых сяброў гэтага прафсаюзу. Чакаецца, што рашэньне наконт пастаноўкі на ўлік суполкі незалежнага прафсаюзу ў Рэчыцы будзе вынесена 6 кастрычніка.

Дарэчы, гэта ўжо другі судовы працэс у Рэчыцы, каб прымусіць райвыканкам паставіць на ўлік новую прафсаюзную суполку РЭП. Улетку гэты ж судзьдзя А. Стрэльчанка пакінуў без разгляду аналагічны зыск Беларускага прафсаюзу РЭП да выканкаму, спаслаўшыся на тое, што тут мае месца спрэчка двух суб’ектаў гаспадараньня.

# Звальненьні і адлічэньні з вучобы па палітычных матывах

На пачатку верасьня з Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэту імя Аркадзя Куляшова адлічаны студэнт 1 курсу факультэту замежных моваў Расьціслаў Панкратаў з фармулёўкай «за непасьпяховасьць». Сапраўднай прычынай моладзевы актывіст лічыць сваю грамадзка-палітычную дзейнасьць, бо да яго неаднаразова прыходзілі супрацоўнікі КДБ па справе «Маладога Фронту» і пагражалі адлічэньнем з навучальнай установы.

З гэтага ж універсітэту была адлічаная студэнтка 3-га курсу, сябра БХД Тацяна Шамбалава, якая ўдзельнічала ў выбарчай кампаніі ў Палату Прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу РБ у якасьці прэтэндэнта ў кандыдаты ад Аб’яднаных дэмакратычных сілаў (АДС).

З Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэту адлічаны рэгіянальны актывіст «Маладога Фронту» Мікола Дземідзенка, які скончыў першы курс гісторыка-філалагічнага факультэту. Яго некалькі разоў

затрымлівалі супрацоўнікі міліцыі за налепкі «Байкот» і раздачу агітацыйнай літаратуры.

Гомельскага каардынатара аргкамітэту БХД Кастуся Жукоўскага звольнілі з працы пасьля таго, як да кіраўніка прадпрыемства прыйшлі невядомыя асобы, якія цікавіліся апазіцыйным актывістам. Пасьля размовы з імі дырэктар прадпрыемства «Інтэргрань» параіў К. Жукоўскаму забраць заяву аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы. Актывіст адмовіўся, і тады яму прапанавалі падаць заяву на звальненьне. Кіраўнік ініцыятыўнай групы К. Жукоўскага Аляксандр Сівакоў таксама быў звольнены з працы пасьля размовы з кіраўніцтвам і парады спыніць дзейнасьць у выбарчай кампаніі.

29 верасьня кіраўніцтва Цэнтральнай раённай бальніцы Слоніму паведаміла Івану Бедку, кіраўніку выбарчага штабу апазіцыйнага кандыдата Івана Шэгі, аб датэрміновым спыненьні кантракту без тлумачэньня прычынаў. «Уручылі паведамленьне, што са мною спыняецца кантракт за год да пенсіі. Я зьбіраюся падаваць скаргу ў суд, бо існуе закон, паводле якога ня маюць права спыняць кантракт за 3 гады да пенсіі», — распавёў актывіст.

## Свабода сумленьня

Увечары 10 верасьня падчас правядзеньня чарговай малітвы за вяртаньне будынку Менскага касьцёлу Сьвятога Язэпа з вернікамі сустрэўся начальнік адзьдзелу Камітэту ўпаўнаважанага па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў Аляксандр Калінаў. Чыноўнік паабяцаў вярнуць будынак былога храму вернікам і заклікаў іх спыніць бестэрміновы пост за вяртаньне комплексу Менскага манастыра бернардынцаў з касьцёлам — помніка архітэктуры барока XVII стагодзьдзя (з 19 сакавіка 2005 года такія малебны праводзяцца штодзённа).

## Сьмяротнае пакараньне

У 2008 годзе ў Беларусі вынесены адзін сьмяротны прысуд. Пра гэта 9 верасьня на прэс-канферэнцыі ў Менску паведаміў старшыня Вярхоўнага суду Валянцін Сукала. Гэтая лічба, паводле ягоных словаў, сьведчыць аб «вельмі рэдкім» прымяненьні ў краіне вышэйшай меры пакараньня, «аб практычным мараторыі на гэты від пакараньня». Таксама ён зазначыў, што заканадаўчае ўвядзеньне мараторыю на пакараньне сьмерцю адносіцца да кампетэнцыі прэзідэнта і заканадаўцаў, але судзьдзі псіхалагічна гатовыя да ўвядзеньня мараторыю. Пры гэтым, падкрэсьліў В. Сукала, нельга забываць аб выніках рэферэндуму 1996 году, на якім большасьць грамадзянаў Беларусі падтрымалі наяўнасьць пакараньня сьмерцю ў заканадаўстве.

## Палітычна матываваныя крымінальныя справы

Экс-кандыдат на прэзідэнцкіх выбарах і вызвалены нядаўна палітвязень Аляксандр Казулін вылучаны польскімі дэпутатамі на прэмію Еўрапарламенту імя Андрэя Сахарава. Лаўрэата прэміі абвесьцяць у сярэдзіне кастрычніка. Прэмія «За свабоду думкі» імя Андрэя Сахарава заснаваная Еўрапарламентам у 1988 годзе. Яе ўручаюць штогод «за дасягненьні ў справе абароны правоў чалавека і асноўных свабодаў». У 2004 годзе гэтую ўзнагароду атрымала Беларуская асацыяцыя журналістаў, у 2006 годзе — былы кандыдат у прэзідэнты Беларусі, лідэр незарэгістраванага руху «За свабоду» Аляксандр Мілінкевіч.

# Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, кастрычнік-лістапад 2008 году

Пасьля завяршэньня ў канцы верасьня выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу РБ, у кастрычніку яшчэ праводзіліся абскарджаньні іх вынікаў, падводзіліся высновы. У Цэнтрвыбаркам паступіла 35 скаргаў. 13 кастрычніка на паседжаньні ЦВК не задаволілі скаргі 27 былых кандыдатаў у дэпутаты, а 24 кастрычніка яшчэ па пяці скаргах, у якіх апратэстоўваліся вынікі выбараў, было прынятае адмоўнае рашэньне. Сакратар Цэнтральнай камісіі Мікалай Лазавік зазначыў, што больш заяўнікам скардзіцца няма куды: «Выбарчае заканадаўства прадугледжвае, што ў гэтых пытаньнях рашэньне Цэнтральнай выбарчай камісіі зьяўляецца канчатковым і абскарджаньню не падлягае».

9 кастрычніка Прэзідыум палітсавету АДС на сваім паседжаньні падвёў вынікі парламенцкіх выбараў і даў ацэнку выбарчай кампаніі з боку калектыўнай структуры апазіцыі. У заяве прэзідыуму палітсавету АДС канстатуецца, што «на заключным этапе выбараў у Палату прадстаўнікоў у некаторых акругах дэмакратычныя кандыдаты адчувалі сур’ёзнае супрацьдзеяньне ў правядзеньні выбарчай кампаніі». Аўтары дакументу зазначаюць, што назіральнікі, насуперак запэўніваньням прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, на пераважнай большасьці ўчасткаў не былі дапушчаныя да назіраньня за працэдурай падліку галасоў, а з некаторых участкаў назіральнікі ад АДС былі выдаленыя прадстаўнікамі сілавых структур. Лідэры апазіцыйных сілаў зьвярнулі ўвагу на тое, што «ўлады адхілілі канструктыўную прапанову палітычных партыяў аб правядзеньні тэлевізійных дэбатаў паміж кандыдатамі ў дэпутаты ад улады і ад адзінага сьпісу АДС па актуальных пытаньнях, што цікавяць выбаршчыкаў; улады выкарыстоўвалі працэдуру датэрміновага галасаваньня для ства-

рэньня неабходнай яўкі выбаршчыкаў і фальсіфікацыі вынікаў галасаваньня». Прэзідыум палітсавету АДС падзяляе ацэнку выбарчай кампаніі, што дала міжнародная місія назіральнікаў АБСЕ, як не адпаведнай дэмакратычным стандартам гэтай арганізацыі і пацьвярджае правільнасьць стратэгіі АДС, скіраванай на прадастаўленьне пераканаўчых доказаў недэмакратычнасьці выбарчай кампаніі на ўсіх яе этапах і фальсіфікацыі вынікаў галасаваньня. Лідэры апазіцыі лічаць найважнейшай задачай АДС канцэнтрацыю намаганьняў на зьмяненьні выбарчага заканадаўства і правапрымяняльнай практыкі для правядзеньня сапраўды свабодных і справядлівых выбараў.

9 кастрычніка Еўрапейскі парламент ухваліў рэзалюцыю па Беларусі. Праект быў ухвалены абсалютнай большасьцю галасоў: «за» прагаласавалі 597 дэпутатаў, 31 — «супраць», 22 дэпутаты ўстрымаліся. У рэзалюцыі Еўрапарламент заклікаў выканаўчыя органы Еўрасаюзу спрасьціць працэдуру атрыманьня еўрапейскіх візаў для грамадзянаў Беларусі, а таксама прыпыніць візавыя санкцыі супраць некаторых беларускіх чыноўнікаў на паўгады, каб за гэты час у Беларусі быў перагледжаны дыскрымінацыйны закон аб сродках масавай інфармацыі. Пры гэтым прапанова прыпыніць візавыя санкцыі не датычыцца асобаў, што ўдзельнічалі ў парушэньнях дэмакратычных выбарчых стандартаў і правоў чалавека. Пры гэтым, аднак, у рэзалюцыі выказваецца «глыбокае расчараваньне» тым, што ў Беларусі не адбылося дэмакратычных зьменаў, на якія спадзяваўся Еўрасаюз, і што, нягледзячы на невялікія паляпшэньні, выбары не адпавядалі стандартам Арганізацыі бясьпекі і супрацоўніцтва ў Еўропе. У рэзалюцыі таксама ўтрымліваецца заклік да беларускага ўраду скасаваць шэраг артыкулаў крымінальнага кодэксу, якія выкарыстоўваюцца для рэпрэсіяў, устрымацца ад перасьледу беларускіх студэнтаў, якія вучацца за мяжой пасьля выключэньня з беларускіх універсітэтаў за грамадзкую дзейнасьць, а таксама зьняць перашкоды на шляху рэгістрацыі няўрадавых арганізацыяў. У рэзалюцыі выказваецца асуджэньне таго, што Беларусь адзіная сярод краінаў Еўропы захоўвае сьмяротнае пакараньне.

13 кастрычніка Еўрасаюз прыпыніў візавыя санкцыі ў дачыненьні да прэзідэнта Лукашэнкі і іншых высокапастаўленых чыноўнікаў, уведзеныя пасьля прэзідэнцкіх выбараў 2006 году. У чорным сьпісе

засталіся толькі чацьвёра фігурантаў мемарандуму Х. Пургурыдэса ды кіраўніца Цэнтрвыбаркаму. У. Шэйман, У. Навумаў, Д. Паўлічэнка, Ю. Сівакоў і Л. Ярмошына застаюцца неўязнымі ў краіны ЕС. Прыпыненьне санкцыяў будзе перагледжана праз шэсьць месяцаў, за гэты час мяркуецца ацаніць, якія зрухі ў дэмакратызацыі зробленыя беларускімі ўладамі. А вось ЗША не далучыліся да такога рашэньня. Як адзначыў намесьнік дзяржсакратара ЗША Дэвід Меркель, Вашынгтон адрэагаваў на вызваленьне палітвязьняў спыненьнем на паўгоду санкцыяў адносна двух беларускіх прадпрыемстваў канцэрну «Белнафтахім» — «Лакафарба» і «Полацкшкловалакно». ЗША мяркуюць зьмякчыць санкцыі адносна Беларусі, калі афіцыйны Менск зробіць новыя крокі, каб палепшыць сітуацыю з правамі чалавека і разьвіцьцём грамадзянскай супольнасьці.

Беларусь заняла 154 месца сярод 173 у рэйтынгу свабоды СМІ за 2008 год. Гэты рэйтынг штогод вызначае ў Парыжы міжнародная праваабарончая арганізацыя «Рэпарцёры бяз межаў». Справаздачы арганізацыі рыхтуюцца ў цесным супрацоўніцтве з незалежнымі журналісцкімі арганізацыямі многіх краінаў сьвету. Паводле эксьпертаў арганізацыі, у параўнаньні з 2007 годам сітуацыя са свабодай СМІ ў Беларусі не палепшылася. Сёлетняя 154-я пазіцыя Беларусі яшчэ больш нізкая за леташнюю, калі краіна была на 151-м месцы. У справаздачы адзначаецца, што беларускія ўлады, якія маюць выключную манаполію на электронныя СМІ, працягваюць аказваць ціск на незалежныя друкаваныя ды інтэрнэт-выданьні.

## Парушэньні прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі

6 кастрычніка рэдакцыя незалежнай газеты «Наша Ніва» ў чарговы раз атрымала ад рэспубліканскага прадпрыемства «Белсаюздрук» адмову на распаўсюд выданьня праз сваю гандлёвую сетку. Як заўважыў у гутарцы з прэс-службай БАЖ галоўны рэдактар «Нашай Нівы» Андрэй Скурко, кіраўніцтва рэдакцыі плануе і далей зьвяртацца з прапановамі аб аднаўленьні супрацоўніцтва, каб паказаць

такім чынам, што не зьбіраецца мірыцца з эканамічнай і палітычнай дыскрымінацыяй недзяржаўнай прэсы. Нагадаем, распаўсюд газеты «Наша Ніва», як і шэрагу іншых недзяржаўных грамадзка-палітычных выданьняў, «Белсаюздрук» скасаваў з пачатку 2006 году (напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў). Тады ж адмовілася распаўсюджваць па падпісцы недзяржаўныя газеты «Белпошта». З таго часу ўсе спробы незалежных выданьняў вярнуцца ў дзяржаўную сістэму распаўсюду ня мелі посьпеху.

5 лістапада Калегія Гарадзенскага абласнога суду адмяніла рашэньне Іўеўскага райсуду, які з падачы начальніка ўпраўленьня КДБ па Гарадзенскай вобласьці Ігара Сяргеенкі прызнаў экстрэмісцкімі матэрыялы, апублікаваныя ў жнівеньскім нумары незарэгістраванай газеты «Свабода». Свой вердыкт абласныя судзьдзі абгрунтавалі тым, што раённы суд разгледзеў справу з парушэньнем прадугледжанай законам працэдуры — пры адсутнасьці ўсіх зацікаўленых бакоў. Справа накіраваная на новы разгляд.

19 лістапада фотакарэспандэнт Уладзь Грыдзін суправаджаў моладзевых актывістаў Партыі БНФ, якія ў Міжнародны дзень студэнтаў раздавалі ўлёткі з тэкстам Дэкларацыі правоў студэнтаў на плошчы Незалежнасьці і ў Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце. Ахоўнікі навучальнай установы затрымалі маладых людзей разам з фотажурналістам і перадалі іх міліцыянтам. Высьвятленьне асобаў адбывалася ў пастарунку, куды даставілі ўсіх затрыманых. Праз паўтары гадзіны ўсіх адпусьцілі на волю.

21 лістапада ў будынку адміністрацыі Савецкага раёну Менску за распаўсюд недзяржаўнай грамадзка-палітычнай газеты «Новы час», якая афіцыйна зарэгістраваная Мініфармацыі і легальна друкуецца ў Беларусі, былі затрыманыя сябры «Маладых дэмакратаў» Міхаіл Пашкевіч і Даніла Барысевіч, якія наведвалі кабінеты чыноўнікаў і раздавалі ім сьвежыя нумары газеты. У адказ на гэта адзін з супрацоўнікаў выканкаму выклікаў нарад міліцыі, які даставіў грамадзка-палітычных актывістаў у пастарунак для разьбіральніцтва.

# Парушэньні права на свабоду асацыяцыяў

У кастрычніку намесьнік старшыні Гомельскай абласной арганізацыі АГП Уладзімір Кацора зьвярнуўся ў Канстытуцыйны суд з патрабаваньнем выканаць рашэньне Камітэту ААН па правах чалавека аб аднаўленьні дзейнасьці грамадзкага аб’яднаньня «Грамадзянскія ініцыятывы». У кастрычніку 2006 году камітэт прызнаў, што ГА «Грамадзянскія ініцыятывы», ліквідаванае ў 2003 годзе рашэньнем Гомельскага абласнога суду, падлягае аднаўленьню на працягу 90 дзён пасьля прыняцьця згаданых меркаваньняў аб парушэньні з боку Рэспублікі Беларусь права на свабоду асацыяцыяў. Аднак шматразовыя звароты ў кампетэнтныя дзяржаўныя органы краіны былі беспасьпяховымі, у сувязі з чым У. Кацора просіць КС прыняць меры для рэалізацыі грамадзянамі сваіх правоў. Аналагічныя звароты накіраваныя ў МЗС і Міністэрства юстыцыі.

16 кастрычніка Міністэрства юстыцыі адмовіла ў рэгістрацыі рэспубліканскага грамадзкага аб’яднаньня беларускіх пенсіянераў «Наша пакаленьне». Як паведаміла БелаПАН кіраўнік ініцыятыўнай групы па яго стварэньні Тацяна Зялко, па словах начальніка ўпраўленьня грамадзкіх аб’яднаньняў Мінюсту Алега Сьліжэўскага нагодай для адмовы сталі заявы сяброў ініцыятыўнай групы: адзін з іх паведаміў, што ён нібыта ня ўдзельнічаў ва ўстаноўчым зьезьдзе; паводле інфармацыі другога, зьезд праводзіўся ня ў Менскай вобласьці, а ў сталіцы. Сябры ініцыятыўнай групы маюць намер адстойваць сваё права на аб’яднаньне, абараняць правы пенсіянераў, займацца інфармацыйнай і асьветніцкай дзейнасьцю. Між тым многія з тых, хто ўвайшоў у склад новай арганізацыі, у 2005—2006 гадах ужо спрабавалі стварыць рэспубліканскае грамадзкае аб’яднаньне пенсіянераў «Старэйшыны». Тады Мінюст адмовіў заяўнікам у рэгістрацыі арганізацыі, ня мела посьпеху і спроба абскарджваць гэтую адмову ў Вярхоўным судзе.

## Парушэньні права на свободу мірных сходаў

У кастрычніку сталічныя ўлады адмовілі Партыі БНФ ў арэндзе памяшканьня для сьвяткаваньня 20-годзьдзя свайго стварэньня. Кіраўніцтва партыі мела намер правесьці 19 кастрычніка вялікую ўрачыстую імпрэзу ў памяшканьні сталічнага Дому культуры МАЗ і зьвярнулася ў адміністрацыю Дому культуры з адпаведнай заявай 9 верасьня. У якасьці рэзервовага варыянту разглядалася зала Менскага міжнароднага адукацыйнага цэнтру імя Я. Раў, куды таксама 9 верасьня была накіраваная заява аб прадастаўленьні магчымасьці арэнды памяшканьня. 15 верасьня кіраўніцтва партыі дадаткова зьвярнулася ў адміністрацыю прэзідэнта і Менгарвыканкам з просьбай аб спрыяньні ў арэндзе любога з названых памяшканьняў ці прадастаўленьні любога іншага памяшканьня. Адміністрацыя перанакіравала заяву ў Менгарвыканкам, а той, у сваю чаргу, праінфармаваў аб тым, што «вызначэньне месца правядзеньня сходу зьяўляецца абавязкам асобаў, адказных за арганізацыю і правядзеньне дадзенага мерапрыемства».

20 кастрычніка Вярхоўны суд не задаволіў скаргу берасьцейскага актывіста Андрэя Шарэнды, аштрафаванага на 50 базавых велічыняў за ўдзел 21 студзеня ў акцыі пратэсту прадпрымальнікаў у Менску. Апазіцыянер сьцьвярджае, што такое пакараньне парушыла ягоныя грамадзянскія правы, у тым ліку права на вольнае выказваньне думкі і на мірны сход. Аднак Вярхоўны суд палічыў, што сваімі дзеяньнямі А. Шарэнда парушыў парадак правядзеньня масавых мерапрыемстваў.

Астравецкі райвыканкам адмовіў грамадзкім актывістам Мікалаю Уласевічу і Івану Круку ў правядзеньні на тэрыторыі Астравецкага раёну ў лістападзе пяці інфармацыйных пікетаў, мэтай якіх быў намер давесьці мясцоваму насельніцтву праўду пра ўсю небясьпеку і наступствы пабудовы АЭС на тэрыторыі раёну, які зараз зьяўляецца адным з экалагічна найчысьцейшых у Беларусі і адным з найбольш персьпектыўных для развіцьця турызму. Мікалай Уласевіч, былы настаўнік геаграфіі, які ўзначальвае аргкамітэт грамадзянскай ініцыятывы супраць будаўніцтва АЭС, ужо выступаў публічна з крытыкай праекту. У лісьце за подпісам першага намесьніка старшыні

Астравецкага райвыканкаму Славінскага адмова тлумачыцца тым, што «цели и способы проведения пикетирования превышают требования, изложенные в Законе Республики Беларусь от 30 декабря 1997 г. №114-3 «О массовых мероприятиях в Республике Беларусь».

## Палітычна матываваныя крымінальныя справы

27 кастрычніка ў Менску быў узяты пад варту і зьмешчаны ў СІЗА грамадзкі актывіст Аляксандр Баразенка, які зьяўляецца апошнім з абвінавачаных па «Працэсу 14-ці» — крымінальнай справе, узбуджанай па арт. 342 КК Рэспублікі Беларусь у дачыненьні да ўдзельнікаў студзеньскай мірнай акцыі пратэсту прадпрымальнікаў. За кратамі А. Баразенка правёў тыднёвую галадоўку пратэсту супраць ужытай меры стрыманьня. Як заявіў адвакат Павел Сапелка ў размове з журналістамі, слуханьне справы маглі б прызначыць хутчэй ці зьмяніць меру стрыманьня для яго падабароннага, каб той не знаходзіўся ў турме ў чаканьні судовага паседжаньня. Тым ня менш дамагчыся гэтага адвакату не ўдалося. Разгляд справы прызначаны на 8 снежня ў Цэнтральным судзе сталіцы. Судзіць актывіста будзе судзьдзя Натальля Вайцяховіч. Раней паведамлялася, што працэс будзе весьці Валеры Есьман, які быў зьняты з пасады за датычнасьць да карупцыйных злачынстваў.

Шэраг акцыяў салідарнасьці са зьняволеным А. Баразенкам правялі моладзевыя актывісты, некаторыя з іх скончыліся затрыманьнямі ўдзельнікаў супрацоўнікамі міліцыі літаральна ў першыя хвіліны. Так, 24 лістапада супраць моладзі ўжылася фізічная сіла. У гэты дзень было затрымана 13 чалавек. Паводле словаў адной з іх, актывісткі Паліны Дзьякавай, усіх адвезьлі ў Маскоўскі РУУС, бралі там адбіткі пальцаў, перапісвалі пашпартныя зьвесткі.

У канцы кастрычніку асуджаны па крымінальным «Працэсе 14-ці» каардынатар руху «Маладая Беларусь» па Менску Уладзімір Сяргееў атрымаў пастанову з адмовай у задавальненьні надзорнай скаргі на прысуд, вынесены 22 красавіка, згодна з якім ён быў прызнаны вінаватым па арт. 342.1 КК РБ і асуджаны да выплаты штрафу ў памеры 100 б. в.

(3 млн 500 тыс. рублёў) за ўдзел у мітынгу прадпрымальнікаў 10 студзеня. У афіцыйнай пастанове за подпісам старшыні Менскага гарадзкога суду В. Г. Пуцілы сьцьвярджаецца, што «віноўнасьць ва ўчыненьні правапарушэньня даказаная цалкам» і «падставаў для адмены прысуду ня маецца». Рашэньне прынятае, нягледзячы на довады асуджанага аб шматлікіх парушэньнях падчас працэсу, разыходжаньнях сьведчаньняў міліцыянтаў з рэчаіснасьцю, незаконнасьці выкарыстаньня ў якасьці рэчавых доказаў відэа- і фотаматэрыялаў сумнеўнага паходжаньня. «Сёньня нам нічога не застаецца, як працягваць змагацца за справядлівасьць і дабівацца скасаваньня прысуду. Я буду браць удзел у інфармацыйных кампаніях з заклікам перагледзець нашую справу разам са сваёй «14-кай», а таксама разам з паплечнікамі па «Маладой Беларусі». Мы павінны абавязкова паўплываць на падзеі, пакуль у нас яшчэ ёсьць такая магчымасьць», — упэўнены У. Сяргееў.

У лістападзе спыненыя крымінальныя справы ў дачыненьні да трох падазраваных у датычнасьці да выбуху ў Менску ў ноч з 3 на 4 ліпеня. Пра гэта стала вядома Міхаілу Шарамету, які атрымаў афіцыйны ліст са сьледчага упраўленьня УУС Менгарвыканкаму 29 лістапада. Таксама больш не зьяўляюцца падазраванымі лідэр незарэгістраванай арганізацыі «Правы альянс» Юрась Карэтнікаў і праваабаронца Ільля Богдан.

## Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў

1 кастрычніка адразу пасьля правядзеньня парламенцкіх выбараў бабруйскі грамадзкі актывіст Аляксандр Чыгір адпраўлены ў ізалятар часовага ўтрыманьня адбываць вынесенае судом 28 ліпеня пакараньне — 10 сутак арышту. Адміністрацыйная справа была заведзеная на А. Чыгіра пасля выпадку з таксістам, які 29 траўня вёз яго разам з дачкой і жонкай дахаты. Таксоўшчык адмовіўся даць чэк і завёз пасажыра ў пастарунак. Пасля гэтага А. Чыгіра абвінавацілі ў пагрозах на адрас таксоўшчыка, пашкоджаньні машыны і непадпарадкаваньні супрацоўнікам міліцыі. Нягледзячы на нанесеныя міліцыянтамі пабоі,

іх дзеяньні былі прызнаныя судом правамоцнымі, а актывіста суд пакараў арыштам і штрафамі ў памеры 2 млн 100 тыс. рублёў. Яшчэ 900 тыс. рублёў за рамонт нібыта пашкоджанай машыны А. Чыгір мусіць выплаціць вадзіцелю таксоўкі С. Касіловічу. Такое рашэньне 4 кастрычніка прыняў Бабруйскі гарадзкі суд.

24 кастрычніка ў Сьветлагорску судзьдзя раённага суду Ірына Алісейка пакарала буйнымі штрафамі ў памеры 1 млн 400 тыс. рублёў трох мясцовых дэмакратычных актывістаў — кіраўніка раённай арганізацыі ПКБ Сьвятлану Міхальчанку, сяброў Партыі БНФ Віктара Ахрамчука і Сяргея Шавяленку. Актывісты былі затрыманыя міліцыянтамі напярэдадні парламенцкіх выбараў, яны былі даверанымі асобамі кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў ад Аб’яднаных дэмакратычных сілаў Сяргея Дайнэкі. У іх канфіскавалі газеты «Товарищ», а таксама малафарматныя выданьні «Выбар-08» і «Глоток воздуха». Апрача гэтага, на кватэры ў С. Міхальчанкі міліцыянты правяліператрус. Пасьля выбараў апазіцыянераў выклікалі ў мясцовую пракуратуру, якая і накіравала адміністрацыйныя пратаколы ў суд. Усе трое абвінавачаны ў распаўсюдзе бюлетэняў «Выбар-08» без выходных зьвестак, а таксама ў абразе гонару і годнасьці высокіх дзяржаўных асобаў, якая нібыта ўтрымліваецца ў публікацыях бюлетэню «Глоток воздуха». Паказальна, што хадайніцтва адваката і абвінавачаных на правядзеньне экспертызы зьместу публікацыяў судзьдзя Алісейка адхіліла.

13 лістапада суд Ленінскага раёну Гародні пакараў буйнымі штрафамі трох грамадзкіх актывістаў, якія 16 кастрычніка ў выніку стыхійнай і мірнай акцыі пратэсту супраць сьпілоўваньня старых дрэваў на завулку Тэлеграфным былі затрыманыя супрацоўнікамі міліцыі. Як сьцьвярджае біёлаг і эколаг Ігар Лапеха, работы гэтыя ў горадзе вяліся і вядуцца з відавочнымі парушэньнямі дзеючага заканадаўства. Разгляд адміністрацыйных справаў вяла судзьдзя Натальля Козел. У выніку разгляду Эдвард Дмухоўскі быў пакараны штрафам у памеры 5 базавых велічыняў за нібыта ўчыненае хуліганства. Больш жорсткі прысуд атрымаў Ігар Лапеха паводле двух артыкулаў КаАП — ч.1 арт. 17 (хуліганства) і ч. 4 арт. 23. (непадпарадкаваньне службовым асобам) — агулам штраф у памеры 30 б. в. (5+25), што складае 1 млн 50 тыс. рублёў.

Беспрацоўнай маладой дзяўчыне Надзеі Крапівінай, якая жыве на ўтрыманьні толькі маці, судзьдзя вынесла штраф у памеры 25 б. в. таксама па двух адміністрацыйных артыкулах.

26 лістапада Віцебскі абласны суд адмяніў пастанову Чыгуначнага райсуду Віцебску аб прыцягненьні экс-кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў па Віцебскай-Чыгуначнай выбарчай акрузе № 19 Андрэя Левінава да адміністрацыйнай адказнасьці ў выглядзе штрафу ў памеры 10 базавых велічыняў за нібыта наўмыснае прычыненьне супрацоўніку Упраўленьня ўнутраных справаў Вітаблвыканкаму А. С. Захараву цялесных пашкоджаньняў. У скарзе на пастанову раённага суду А. Левінаў указаў, што інкрымінуемага правапарушэньня не ўчыняў і прывёў факты фальсіфікацыі матэрыялаў справы і шматлікіх працэсуальных парушэньняў.

## Парушэньні выбарчых правоў грамадзянаў

Адказнаму сакратару аргкамітэту па стварэньні БХД Дзянісу Садоўскаму, які быў кандыдатам у дэпутаты па 103 Масюкоўшчынскай акрузе, пракуратура адмовіла ў разглядзе скаргаў на парушэньні, зафіксаваныя ва ўчастковых камісіях у дзень выбараў. Дз. Садоўскі на наступны дзень пасьля выбараў даслаў у пракуратуру заявы і акты аб парушэньні Выбарчага кодэксу Рэспублікі Беларусь, складзеныя ім самім і яго даверанымі асобамі ў дзень выбараў. 9 кастрычніка Дзянісу Садоўскаму былі вернутыя заявы і акты, якія старэйшы саветнік юстыцыі пракуратуры Фрунзенскага раёну А. М. Свірыдовіч палічыў «пададзенымі з парушэньнем усталяваных заканадаўствам патрабаваньняў». «У звароце я патрабаваў правядзеньня сьледчых мерапрыемстваў па фактах парушэньня выбарчага заканадаўства, прыцягненьня да адказнасьці асобаў, якія ўчынялі фальсіфікацыю выбараў і правядзеньня паўторнага галасаваньня. Замест гэтага яны зрабілі мне звычайную адпіску, што па фармальных прычынах ня могуць разгледзець мае скаргі. Беззаконьне адбывалася падчас выбараў, беззаконьне працягваецца і ў пракуратуры», — сказаў Дз. Садоўскі.

У кастрычніку выбарчая камісія Буда-Кашалёўскай акругі падала судовы зыск на былога кандыдата ў дэпутаты Кастуся Жукоўскага, каб спагнаць грашовую кампенсацыю за зьняцьце з выбараў. Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына ў інтэрвію БелаПАН паведаміла, што былыя кандыдаты ў дэпутаты, якія зьняліся з выбараў, паводле закону абавязаны кампенсаваць сродкі, патрачаныя імі на выраб агітацыйных матэрыялаў. Сакратар Цэнтрвыбаркаму Мікалай Лазавік, каментуючы прэтэнзіі выбарчай Буда-Кашалёўскай камісіі да К. Жукоўскага, акцэнтаваў увагу на прычыне «зьняцьця кандыдатуры»: «Калі кандыдат выкарыстаў сродкі, выдаткаваныя на агітацыйную прадукцыю, а потым зьняў сваю кандыдатуру без паважлівых прычынаў, то паводле закону мусіць гэтыя сродкі кампенсаваць». Аднак у заканадаўстве не прапісана, што ёсьць паважлівай прычынай. Прычынай зьняцьця сваёй кандыдатуры ў першы дзень датэрміновага галасаваньня К. Жукоўскі назваў няроўныя ўмовы вядзеньня перадвыбарчай агітацыі з кандыдатам ад улады Уладзімірам Кужанавым. Апрача таго, у склад участковых выбарчых камісіяў мясцовыя ўлады не ўключылі ніводнага з шаснаццаці прапанаваных прадстаўнікоў дэмсілаў. 20 лістапада судзьдзя Цэнтральнага раёну Гомелю Жана Андрэйчык задаволіла зыск акруговай камісіі на спагнаньне «выбарчых» грошай з дэмакратычнага кандыдата. К. Жукоўскі абавязаны вярнуць на рахунак Буда-Кашалёўскага райвыканкаму больш як 1 млн 700 тыс. рублёў, якія былі выкарыстаныя на перадвыбарчыя ўлёткі.

20 лістапада Сенненскі раённы суд аштрафаваў на 20 базавых велічыняў (700 тыс. рублёў) сябра ўчастковай выбарчай камісіі, настаўніцу пачатковых класаў сярэдняй школы вёскі Ходсы Сенненскага раёну Натальлю Нікіціну. 26 верасьня, падчас датэрміновага галасаваньня, сябры ініцыятыўнай групы кандыдата ў дэпутаты Сяргея Вазьняка літаральна схапілі яе за руку, злавіўшы за фальсіфікацыяй дакументаў. Спадар Вазьняк падкрэсьліў, што гэта ці не адзіны выпадак за час улады А. Лукашэнкі, калі парушальнік выбарчага заканадаўства нясе пакараньне праз суд. Насамрэч шматлікія выпадкі фальсіфікацыі падчас выбараў паўсюдна замоўчваюцца.

# Звальненьні і адлічэньні з вучобы па палітычных матывах

На пачатку лістапада з Магілёўскага прафесійнага ліцэю № 2 з фармулёўкай «за грубае парушэньне дысцыпліны» адлічаны 18-гадовы актывіст Станіслаў Сенакосаў. «Я зьвязваю сваё адлічэньне з тым, што займаюся грамадзкай дзейнасьцю. Са мной размаўляла кіраўніцтва. Казалі, калі я не спыню гэтага, у мяне будуць праблемы з навучаньнем. Калі мне споўніцца васямнаццаць гадоў, мяне папросту адлічаць. Тады я не надаў гэтаму вялікага значэньня. Вось мне нядаўна споўнілася васямнаццаць гадоў, я прапусьціў адны заняткі, і ў сувязі з гэтым мне падпісалі загад аб адлічэньні. Там напісалі, што я парушыў унутраны расклад», — распавеў Станіслаў Сенакосаў.

Звольнены з працы кандыдат у дэпутаты на парламенцкіх выбарах Віктар Падчыненкаў, які працаваў у гарадзенскай прыватнай фірме ТАА «НьюТонМэбля» цесьляром. 1 кастрычніка ягоны кіраўнік папрасіў напісаць заяву на звальненьне па ўласным жаданьні, спаслаўшыся на тое, што да яго з гэтым патрабаваньнем прыходзілі людзі «з органаў».

# Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, сьнежань 2008 году

Апошні месяц году падсумаваў ягоныя вынікі і прадэманстраваў, што праблемы з правамі чалавека ў Беларусі застаюцца на ранейшым узроўні, і сітуацыя не мяняецца. З аднаго боку, адбылося вяртаньне дзьвюх незалежных газетаў у дзяржаўную сістэму распаўсюду, прайшла з чацьвёртай спробы рэгістрацыя грамадзкага праваабаронча-асьветніцкага аб'яднаньня «Рух «За свабоду». З другога боку, захаваўся адміністрацыйны ціск на апазіцыйна настроеных грамадзянаў.

10 сьнежня ўся сусьветная грамадзкасьць адзначала 60-годзьдзе прыняцьця найважнейшага дакументу — Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Беларускія ўлады праігнаравалі гэтую дату і прынялі ўсе меры, каб праваабаронцы не змаглі зладзіць акцыяў, прымеркаваных да яе.

Таксама ў Беларусі захаваўся палітычна матываваны крымінальны перасьлед удзельнікаў мірных дэмакратычных акцыяў. Вынесены прысуд апошняму ўдзельніку «Працэсу 14-ці» моладзеваму актывісту Аляксандру Баразенку ў выглядзе абмежаваньня волі.

Міжнародная праваабарончая арганізацыя Amnesty International выдала штогадовую справаздачу аб становішчы з правамі чалавека ў сьвеце за мінулы год (з траўня 2007 па травень 2008 г.). У разьдзеле дакладу, прысьвечаным Беларусі, адзначаецца ціск уладаў на грамадзянскую супольнасьць, юрыдычны перасьлед апазіцыйных актывістаў, а таксама працяг выкананьня сьмяротных пакараньняў. Беларусь — адзіная краіна ня толькі ў Еўропе, але і ў рэгіёне, якая працягвае выконваць сьмяротныя пакараньні. У дакладзе прыводзяцца шматлікія выпадкі крымінальнага перасьледу актывістаў «Маладога Фронту», якія прыцягваліся да адказнасьці за «дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі». Таксама прыгадваецца выпадак з праваабарончай

арганізацыяй «Вясна», якая была зьліквідаваная ў 2003 годзе. Летась у ліпені Камітэт ААН па правах чалавека прыняў пастанову, у якой расцаніў ліквідацыю «Вясны» як парушэньне беларускімі ўладамі права на свабоду асацыяцыяў і прапанаваў выправіць сітуацыю, аднак беларускія ўлады праігнаравалі гэтую рэкамендацыю. У справаздачы Amnesty International сьцьвярджаецца, што Беларусь застаецца несвабоднай краінай.

Дэмакратычная краіна ня можа існаваць без свабоды слова, а ў Беларусі працягваецца ціск на незалежныя СМІ і праходзіць прымусовая падпіска на дзяржаўныя СМІ. Так, напрыканцы сьнежня шэраг дзяржаўных установаў, арганізацыяў і прадпрыемстваў удзельнічалі ў кампаніі па абавязковай ведамаснай падпісцы на дзяржаўныя выданьні. Рэдактары «Нашай Нівы» і «Народнай волі», у сваю чаргу, таксама заклікалі чытачоў не спадзявацца на кіёскі «Белсаюздруку» і афармляць падпіску. Між тым іншыя недзяржаўныя газеты паранейшаму пазбаўленыя магчымасьці распаўсюду праз гандлёвую сетку прадпрыемстваў «Саюздруку». Гэта грамадзка-палітычныя выданьні: «Товарищ», «Новы час» і рэгіянальныя: «Бобруйский курьер», «Борисовские новости», «Витебский курьер М», «Вольнае Глыбокае», «Газета для Вас» (Івацэвічы), «Газета Слонімская», «Ганцавіцкі час», «Intex-press» (Баранавічы), «Нясвіжскі час». Ня маюць магчымасьці патрапіць да чытача праз паштовую падпіску: «Товарищ», «СНплюс. Свободные новости плюс», «Новы час», «Борисовские новости», «Витебский курьер М», «Вольнае Глыбокае», «Газета Слонімская», «Ганцавіцкі час», «Intex-press». Паводле юрыстаў ГА «БАЖ», у 2008 годзе становішча са свабодай слова ў Беларусі было «вельмі цяжкае». «Улады працягвалі, карыстаючыся адміністрацыйнымі мерамі ўзьдзеяньня, выцясьняць недзяржаўныя СМІ з інфармацыйнага поля», — адзначыў юрыст БАЖ Міхаіл Пастухоў.

## Палітычна матываваныя крымінальныя справы

8 — 9 сьнежня ў судзе Цэнтральнага раёну сталіцы праходзіў разгляд крымінальнай справы, узбуджанай супраць моладзевага актывіста

студэнта-каліноўца Аляксандра Баразенкі па ч.1 арт. 342 КК РБ («Арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак»). З 27 кастрычніка ён утрымліваўся ў СІЗА на вул. Валадарскага, каля будынку якога сябры і паплечнікі арыштаванага неаднаразова праводзілі акцыі салідарнасьці. На судовае паседжаньне прыйшло больш за паўсотні людзей, сярод іх палітыкі і грамадзкія дзеячы, прадпрымальнікі, праваабаронцы і моладзь. У судовую залу, аднак, не змаглі патрапіць усе жадаючыя, бо туды міліцыянты ў цывільным правялі вялікую групу студэнтаў, якія і занялі большасьць месцаў.

Падчас судовага разьбіральніцтва былі дапытаныя чацьвёра сьведкаў — дырэктары транспартных прадпрыемстваў, якія распавялі, што аніякага ўрону нанесена не было, бо збоі працы на грамадзкіх маршрутах у Менску адбываюцца амаль кожны дзень, у тым ліку і ў сувязі з рухам картэжаў прэзідэнта Лукашэнкі, таму казаць пра памер недаатрыманага прыбытку прадпрыемствам не выпадае. Таксама былі прагледжаныя відэаматэрыялы справы, зьнятыя супрацоўнікамі праваахоўных органаў. Аднак былі паказаныя толькі агульныя планы акцыі, а ня ўдзел у ёй моладзевага актывіста. Тым ня менш судзьдзя Натальля Вайцяховіч асудзіла Аляксандра Баразенку, апошняга з абвінавачаных па «Працэсе 14-ці», якія бралі ўдзел у мітынгу прадпрымальнікаў ў студзені 2008 году, да аднаго году абмежаваньня волі без накіраваньня ў папраўчыя ўстановы.

## Перасьлед праваабаронцаў

4 сьнежня да баранавіцкага праваабаронцы Сяргея Гоўшы на кватэру зьявіўся міліцыянт з намерам правесьціператрус. Шукаць ён зьбіраўся забароненую літаратуру, якую праваабаронца нібыта захоўвае ў сябе дома. Паколькі самога С. Гоўшы дома не аказалася, ягоная жонка адчыніла дзьверы і заявіла, што ў кватэру не ўпусьціць. На запатрабаваньне міліцыянта яна прынесла свой пашпарт, пасьля праверкі якога супрацоўнік праваахоўных органаў капітан Яўген Бахарэвіч сышоў. Ніякіх дакументаў на правядзеньне сьледчага мерапрыемства ў яго не было. Сяргей Гоўша ўпэўнены, што візіт міліцыянта быў зьвязаны

з намерам баранавіцкіх праваабаронцаў адзначаць 10 сьнежня 60-я ўгодкі прыняцьця Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека.

10 сьнежня ў цэнтры Менску падчас распаўсюду Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека былі затрыманыя беларускія праваабаронцы. Усяго, разам з моладзевымі актывістамі, якія бралі ўдзел у акцыі, прымеркаванай да юбілею прыняцьця асноўнага дакументу па правах чалавека, былі затрыманыя з ужываньнем фізічнай сілы больш за 20 чалавек. Сярод затрыманых аказаліся праваабаронцы Алесь Бяляцкі, Уладзімір Лабковіч, Алег Мацкевіч, Марына Статкевіч, Ірына Тоўсьцік і Сяргей Сыс. Супрацоўнікі міліцыі былі ў цывільным і не пажадалі назваць сябе, хаця паводле закону абавязаныя прад'явіць дакументы. Праваабаронцаў прымусова даставілі ў Цэнтральны РУУС, дзе пратрымалі тры гадзіны. Пасьля таго як перапісалі пашпартныя зьвесткі, усіх вызвалілі без якіх-небудзь тлумачэньняў. Віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека Алесь Бяляцкі пракаментаваў затрыманьне наступным чынам: «Мы раздавалі мінакам Дэкларацыі правоў чалавека і інфармацыйныя ўлёткі аб парушэньнях правоў чалавека ў Беларусі. На жаль, акцыю не атрымалася правесьці так, як планавалася. Непрыемна і прыкра, што ў нашай краіне, якая падпісала Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека, яе нельга раздаваць людзям».

10 сьнежня ў Гародні таксама падчас правядзеньня акцыі, прысьвечанай 60-годзьдзю прыняцьця Дэкларацыі правоў чалавека, супрацоўнікі сілавых ведамстваў затрымалі праваабаронцаў Віктара Сазонова, Уладзіміра Хільмановіча, Яна Романа і Алега Калінкава. Затрыманьні адбыліся таксама і ў Магілёве.

## Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў

24 сьнежня актывіст грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь» Алег Ладуцька аштрафаваны на 5 базавых велічыняў (175 тыс. рублёў) за расклейку налепак з сімволікай Еўрасаюзу. Та-

кое рашэньне прыняла адміністрацыйная камісія Савецкага раёну сталіцы пад кіраўніцтвам У. Залешчука.

29 сьнежня судзьдзя Клецкага райсуду Алена Гасьцеева аштрафавала рэгіянальнага каардынатара «Руху «За свабоду» Сяргея Панамарова на 30 базавых велічыняў — 1 млн 50 тыс. рублёў. Яго абвінавацілі ў арганізацыі несанкцыянаванага мітынгу. 7 сьнежня ў Клецку планавалася сустрэча насельніцтва са старшынёй добраахвотнага Таварыства па ахове помнікаў гісторыі і культуры Антонам Астаповічам. Аднак супрацоўнікі аддзелу культуры Клецкага райвыканкаму і мясцовыя міліцыянты не пусьцілі ахвотных у Палац культуры. Пазьней міліцыянты абвінавацілі С. Панамарова ў арганізацыі несанкцыянаванага мітынгу.

## Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў

5 сьнежня Вярхоўны суд Беларусі пачаў разгляд скаргі заснавальнікаў СПГА «Гарызанталь» да Мінюсту, які 23-га кастрычніка адмовіў арганізацыі ў рэгістрацыі на падставе таго, што нібыта быў парушаны парадак правядзеньня ўстаноўчага сходу, а таксама не прадстаўлены сьпіс яе заснавальнікаў і кіраўнічых органаў. Заснавальнікі аб’яднаньня лічаць, што довады Міністэрства юстыцыі не зьяўляюцца абгрунтаванымі. 9 сьнежня Вярхоўны суд Беларусі прыняў рашэньне аб правядзеньні почырказнаўчай эксьпертызы ў дачыненьні да заснавальнікаў сацыяльна-патрыятычнага грамадзкага аб’яднаньня «Гарызанталь». Хадайніцтва аб яе правядзеньні вылучыла Міністэрства юстыцыі. На думку кансультанта ўпраўленьня грамадзкіх аб’яднаньняў установы Аляксандра Харытона, некаторыя подпісы, пастаўленыя на дакументах аб заснаваньні арганізацыі, адрозьніваюцца ад іх подпісаў у іншых дакументах. Нагадаем, што гэта ўжо другая спроба абскардзіць адмову ў рэгістрацыі. Калі Вярхоўны суд і на гэты раз не задаволіць скаргу заснавальнікаў грамадзкага аб’яднаньня на дзеяньні Мінюсту, яны маюць намер правесьці яшчэ адзін зьезд. Стваральнікі «Гарызанталі» — у асноўным сябры Партыі камуністаў Беларускай, а таксама актывісты ліквідаванай Беларускай

партыі працы. Свой назоў арганізацыя абрала невыпадкова: яшчэ на першым устаноўчым сходзе было заяўлена, што «Гарызанталь» ствараецца «для актывізацыі палітычнага жыцьця грамадзянаў, а таксама ў супрацьвагу існуючай у Беларусі вертыкалі ўлады».

Напярэдадні калядных сьвятаў Беларускае рэспубліканскае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры пазбавілася сваёй сядзібы. Актывісты таварыства да апошняга спадзяваліся захаваць за сабою памяшканьне і, адпаведна, юрыдычны адрас, аднак не атрымалася. Па словах старшыні таварыства Антона Астаповіча, дамова на арэнду не была працягнутая з боку Арэнднай камісіі Менгарвыканкаму і Камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Менская спадчына». Між тым будынак, дзе знаходзіўся офіс, належыць самому Таварыству аховы помнікаў, падкрэсьліў А. Астаповіч, аднак у 2004 годзе яго беспадстаўна і незаконна нацыяналізавалі праз Гаспадарчы суд. «Прычыну такога стаўленьня да нас я бачу толькі ў дзейнасьці самога Таварыства, таму што мы бы костка ў горле для нашага гарвыканкаму, паколькі вельмі актыўна ўздымаем праблемы, у першую чаргу, па горадзе Менску, зьвязаныя з парушэньнямі гісторыка-культурнае спадчыны, а тут парушэньні татальныя», — адзначыў А. Астаповіч.

23 сьнежня на прэс-канферэнцыі ў Менску старшыня аргкамітэту па стварэньні Партыі свабоды і прагрэсу Уладзімір Навасяд паведаміў пра намер атрымаць афіцыйную рэгістрацыю ў Міністэрстве юстыцыі. «У красавіку 2009 году мы маем намер правесьці чацьвёрты ўстаноўчы зьезд, — паведаміў ён».

## Парушэньні прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі

На пачатку сьнежня прадстаўніку дэмсілаў з Гомельскай вобласьці Кастусю Жукоўскаму даслалі ліст з пракуратуры Веткаўскага раёну, у якім папярэдзілі аб недапушчальнасьці супрацоўніцтва з незалежным тэлеканалам «Белсат». Як паведаміў К. Жукоўскі, у лісьце паведамляецца, што пракуратура праводзіла праверку па заяве старшыні

райсавету дэпутатаў Яўгена Чэванькова. Калі ж будуць выяўленыя паўторныя факты супрацоўніцтва з дадзеным СМІ, Кастусь Жукоўскі будзе прыцягнуты да адказнасьці. «Я балатаваўся ў парламент па гэтай акрузе і сапраўды сёе-тое здымаў для сябе на камеру. Я грамадзянін Беларусі, таму маю права па канстытуцыі перадаваць сабраную мной інфармацыю любому каналу — ці то БТ, CNN або РТР», — пракаментаваў сітуацыю грамадзкі актывіст.

12 сьнежня суд Іўеўскага раёну паўторна разгледзеў справу аб прызнаньні экстрэмісцкім жнівеньскага нумару незарэгістраванай газеты «Свабода». Як паведаміў адвакат Павел Сапелка, які прадстаўляў інтарэсы выданьня, начальніку ўпраўленьня КДБ па Гарадзенскай вобласьці Ігару Сяргіенку адмоўлена ў разглядзе справы, паколькі экстрэмісцкіх публікацыяў у газеце па-ранейшаму ня выяўлена. Нагадаем: 9 верасьня суд Іўеўскага раёну прызнаў жнівеньскі нумар незарэгістраванага выданьня «Свабода» (№ 127 за 14 —27.08.2008) экстрэмісцкім і пастанавіў зьнішчыць 5 тыс. асобнікаў гэтага выпуску. Грамадзянская справа была ўзбуджаная на падставе заявы, якую падпісаў 4 верасьня начальнік Упраўленьня КДБ па Гарадзенскай вобласьці Ігар Сяргіенка. УКДБ падалася падазронай публікацыя «Вайна ў Грузіі», зьмешчаная ў нумары выданьня. 5 лістапада Гарадзенскі абласны суд разгледзеў касацыйную скаргу на рашэньне суду Іўеўскага раёну. Судзьдзя Аляксандр Сіцько прыняў рашэньне матэрыялы па гэтай справе накіраваць на новы разгляд.

15 сьнежня ў будынку выканкаму Ленінскага раёну сталіцы затрымалі актывістаў АГП Зьмітра Кавалгіна і Кацярыну Шакаль, якія распаўсюджвалі зарэгістраваную незалежную газету «Новы Час». Затрыманьне маладых людзей адбылося з ініцыятывы кіраўніка спраў выканкаму Уладзіміра Ліцецкага. Таксама за распаўсюд газеты «Новы Час» у Астравецкім райвыканкаме (Гарадзенская вобласьць) быў затрыманы дэмакратычны актывіст і праваабаронца Іван Крук, які зьяўляецца адным з арганізатараў грамадзкай ініцыятывы супраць пабудовы АЭС на Астравеччыне. Супрацоўнікі райвыканкаму склалі акт «аб незаконным распаўсюдзе» газеты і папярэдзілі, што накіруюць дакумент у раённую пракуратру для праверкі дзеяньняў грамадзкага актывіста.

16 сьнежня супрацоўнікі міліцыі затрымалі моладзевага актывіста Алеся Круткіна і даставілі ў пастарунак, дзе дзьве гадзіны распытвалі, што той меркаваў рабіць з газетай «Беларусь партызанская», якую ў яго знайшлі пры асабістым даглядзе. А. Круткін патлумачыў, што гэтая газета выдаецца пры падтрымцы Кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў і што выданьне, якое мае наклад 299 асобнікаў, не падлягае рэгістрацыі ў якасьці перыядычнага сродку масавай інфармацыі. Міліцыянты сказалі, што гэтыя тлумачэньні іх не задавальняюць, і канфіскавалі 18 асобнікаў газеты — як паведамілі А. Круткіну, нібыта для экспертызы выданьня і ягонага зьместу.

18 сьнежня ў Гомелі ў міліцыю выклікалі сябра ГА «БАЖ» Дзьмітрыя Кармазіна. Паводле позвы, ён мусіў зьявіцца для сьведчаньня. Але адразу пасля прыходу журналіста ў 1-е аддзяленьне міліцыі Цэнтральнага раёну ў яго ўзялі адбіткі пальцаў, а ўжо потым цікавіліся, «што ён думае пра выбух 4 ліпеня ў Менску». Пры гэтым міліцыянты не дазволілі прысутнічаць пры допыце ў якасьці грамадзкага прадстаўніка сябру ГА «БАЖ» Тацяне Бублікавай.

24 сьнежня стала вядома, што ў Гомелі на дактыласкапію таксама выклікалі ў міліцыю карэспандэнта газеты «Комсомольская правда в Белоруссии» Паўла Міцкевіча. Яго папярэдзілі, што ў выпадку адмовы ад гэтай працэдуры ім «займуцца іншыя органы».

## Парушэньні права на свабоду мірных сходаў

3 сьнежня суд Ленінскага раёну Берасьця прызнаў актывістаў Жану Абрамаву, Юрыя Бакура і Івана Стасюка вінаватымі ў парушэньні арт. 23.34 КаАП («Парушэньне вызначанага парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў») і пакараў кожнага ўдзельніка пікету штрафам у памеры 2 базавыя велічыні. Напярэдадні ў цэнтры гораду актывісты зладзілі пікет супраць рашэньня аб высяленьні прыхільніцы Руху «За Свабоду» Жанны Абрамавай з кватэры. Разам з Жаннай на вуліцы аказаліся яе маленькая сястра і маці. Па словах праваабаронцы Рамана Кісьляка, дэмакратычныя сілы гораду дамовіліся

аб тым, што будуць працягваць змагацца за правы Жанны Абрамавай і яе сям'і. Падрыхтаваная скарга на рашэньне суду Маскоўскага раёну аб высяленьні.

14 сьнежня у клубе «Акварыюм» не адбылося запланаванага мерапрыемства — «Кліп-марафон», бо клуб быў тэрмінова зачынены на рамонт. «У нас была дамова з дырэктарам клубу, аднак у апошні момант прыйшла папера з санстанцыі з патрабаваньнем тэрмінова закрыць клуб, — распавёў БелаПАН адзін з арганізатараў Франак Вячорка.

## Звальненьні па палітычных матывах

У канцы сьнежня Зьмітра Кухлея, актывіста руху «За Свабоду», адміністрацыя прадпрыемства «Мастоўдрэў» папярэдзіла аб скарачэньні за месяц. Тым ня менш ён лічыць, што парушаныя ягоныя правы. Грамадзка-палітычны актывіст працаваў на мэблевай фабрыцы «Мастоўдрэў» перакладчыкам. Ён таксама зьяўляецца дэпутатам раённага савету, а таму лічыць, што адміністрацыя парушыла заканадаўства, паколькі звольніць яго маглі толькі са згоды раённых дэпутатаў.

Таксама напрыканцы сьнежня ў Баранавічах з актывістам Аб'яднанай грамадзянскай партыі Рыгорам Грыкам адміністрацыя прадпрыемства «Прадзільна-ткацкая фабрыка № 2», якое ўваходзіць у РУП «Баранавіцкае вытворчае бавоўнянае аб'яднаньне», не працягнула працоўны кантракт на наступны год. Рыгор Грык 17 гадоў прапрацаваў на ёй слесарам-рамонтнікам, і зьвязвае гэты факт са сваёй палітычнай дзейнасьцю, бо восеньню балатаваўся ў дэпутаты «парламенту» ад АДС па Баранавіцкай сельскай акрузе № 7. Каля прахадной аб'яднаньня актывіст неаднаразова раздаваў незалежныя выданьні.

## Парушэньні права на свабоду сумленьня

У сьнежні каталіцкаму сьвятару Збігневу Грыгарцэвічу, грамадзяніну Польшчы, пробашчу парафіі Сашэсьця Сьвятога Духу ў Барысаве, без

якога-небудзь тлумачэньня адмоўлена ў працягненьні беларускай візы. Як патлумачыў З. Грыгарцэвіч, яму далі зразумець, што прычына адмовы ў яго «залішняй актыўнасьці ў грамадзкай дзейнасьці». На думку сьвятара, вырашальную ролю сыграла сітуацыя з правядзеньнем у горадзе канцэрту хрысьціянскай музыкі ў верасьні гэтага году. Тады райвыканкам, у асобе намесьніцы старшыні па ідэалогіі Валянціны Шутко і намесьніцы старшыні райсавету Людмілы Гарнак, спачатку дазволіў праводзіць канцэрт, але перад самым пачаткам мерапрыемства дазвол быў адменены.

14 сьнежня ў Менску на прасьпекце Пераможцаў супрацоўнікамі праваахоўных органаў быў затрыманы за пропаведзь сьвятар царквы «Новае жыцьцё» рэлігійнага аб’яднаньня абшчын хрысьціян поўнага Евангельля Сяргей Луканін. Міліцыянты ў рэзкай форме папрасілі яго пакінуць тэрыторыю, а пасьля скруцілі і зацягнулі за будынак Палацу спорту, пагражаючы пазбаўленьнем волі. «Я адказаў, што і ў зьняволеньні буду казаць аб Ісусе Хрысьце. Толькі пасля таго, як я змог дастаць пасьведчаньне сьвятара, сьпецназаўцы запісалі мае дадзеныя, папрасілі прабачэньня і паведамілі, што дзейнічаюць па загадзе і на падставе закона», — распавёў С. Луканін. Ён адзначыў, што ў чарговы раз сутыкнуўся з недасканаласьцю айчыннага рэлігійнага заканадаўства, якое супярэчыць Канстытуцыі краіны.

Праваабарончы цэнтр «Вясна»